РОДНАЯ ГАЗЕТА НА РОДНАЙ МОВЕ
# ЗВЯЗДА
Выдаецца з 9 чэрвеня 1917 г.
14 лістапада 2025 г. ПЯТНІЦА № 220 (30608)

# «ЁСЦЬ ДАСЯГНЕННІ, ВЫНАХОДКІ І КАНКРЭТНЫ ВЫНІК — АТРЫМАЙ ЗА ГЭТА ГРОШЫ»

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка прыняў з дакладам старшыню Прэзідыума Нацыянальнай акадэміі навук Уладзіміра Караніка. Кіраўнік дзяржавы адзначыў, што гатовы абмяркоўваць пытанні дзейнасці НАН, якія яго датычацца. Аднак падкрэсліў, што найперш яго цікавіць удасканаленне дзейнасці Акадэміі навук. І акрэсліў ключавыя пытанні. «Для чаго мы замянілі старшыню? Каб было лепш. Час быў разабрацца ў сітуацыі, ды і я ўпэўнены, вы пагружаныя былі і раней адносна працы Акадэміі навук. Што вы бачыце? Як будзем рухацца далей? Я ўжо шмат разоў казаў, што без навукі нікуды — час цяпер такі», — адзначыў беларускі лідар.

## УЗМАЦНЕННЕ СТАТУСУ ВУЧОНАГА

Прэзідэнт звярнуў увагу, што кіраўніцтва НАН узнімае пытанне аб узмацненні статусу вучонага ў грамадстве, што, магчыма, пацягне за сабой прыток маладых кадраў у навуку ў цэлым, не толькі ў Акадэмію навук. Не першы раз гэта пытанне падымаецца. «Маю пазіцыю вы ведаеце, яна, напэўна, і ў вас такая пасля работы ў рэальным сектары эканомікі. Я ведаю, што такое праца вучонага чалавека, навукоўцаў, і гатовы садзейнічаць таму, каб плаціць па максімуме, але патрэбны вынік. Вось проста статус падняць, у два разы павялічыўшы заработную плату, — наўрад ці мы нешта атрымаем. Тут трэба паглыбіцца ў тое, каб сапраўды вучоны быў вучоным і ў тое, каб рэальна падняць статус, а не так як звычайна ў нас бывала: «вось давайце за дысертацыю плаціць, яшчэ за нешта будзем плаціць і гэтак далей». Можа, і трэба дзесьці нешта дадаць, але статус вучоны вызначае сам. Будуць дасягненні, будзе вынік — любыя грошы», — адказаў на гэта Прэзідэнт.

У прыклад ён прывёў актуальную сёння тэму — беспілотнікі. Па словах кіраўніка дзяржавы, калі вучоны прадставіць непаражальны беспілотнік, які не дастануць ніякія РЭБ, ці іншая зброя — атрымае грошы за вынаходніцтва, за ўзор, які паклаў на стол. Яшчэ адзін прыклад — электрамабіль. «Колькі было абяцанняў. Дзе гэты электрамабіль? Мы дапамагалі, і Акадэмія выдаткоўвала немалыя грошы — аўтамабіля няма. Ну дык які статус? — сказаў кіраўнік дзяржавы. — Ёсць дасягненні, вынаходкі і канкрэтны вынік — атрымай за гэта грошы. Гэта значыць, за вынік дзяржава павінна плаціць, і мы будзем плаціць».

Аляксандр Лукашэнка заўважыў, што вучоныя не павінны быць жабракамі, іх трэба падтрымліваць, тым больш што работа над вынаходніцтвамі займае нямала часу. Але плаціць трэба за вынік. «Гэта галоўнае. Гэта мая цвёрдая пазіцыя. Папрацаваўшы губернатарам, вы зразумелі, што людзі атрымліваюць за тое, што зрабілі рукамі», — дадаў ён.

## УЗМАЦНЕННЕ АДКАЗНАСЦІ ЗАКАЗЧЫКАЎ ЗА НАВУКОВЫЯ ДАСЛЕДАВАННІ

Наступнае пытанне — узмацненне адказнасці заказчыкаў за навуковыя даследаванні. Часта ўзнікаюць пытанні, што прадпрыемствы, кампаніі мала заказваюць, мала кантактуюць з вучонымі. Аляксандр Лукашэнка пагадзіўся, што ёсць такая тэма і так будзе заўсёды. «Я хачу яшчэ раз звярнуцца да вашага губернатарскага досведу. Вы, напэўна, убачылі і адчулі, хто на што здатны. Раней гэта тэма гучала так: «Мы вынайшлі, а прамысловасць або сельская гаспадарка, транспарт браць не хочуць. Паглядзіце — вялікі цуд вынайшлі, браць не хочуць». Не буду тут казаць пра канкрэтыку, але ж апошняе слова за вамі, за кіраўніком Акадэміі навук. Ён павінен вывучыць, што там інстытут прапануе канкрэтнаму прадпрыемству, і прыняць рашэнне, але і адказваць за яго. Калі вы навяжаце рашэнне, якое нежыццяздольнае, мы адразу ўбачым гэта, убачым у справе. Вы панесяце за гэта адказнасць. Калі сапраўды прынятае вамі рашэнне прынясе карысць, то тады — ад дзяржаўных узнагарод да фінансавых заахвочванняў. Усё як мае быць у жыцці», — растлумачыў Прэзідэнт.

Уладзімір Каранік адзначыў, што цяпер перад вучонымі стаіць асноўная задача — распрацоўваць тое, што запатрабавана рэальным сектарам эканомікі, а не спрабаваць навязваць тое, што ў іх атрымалася. Кіраўнік дзяржавы такі падыход назваў абсалютна правільным.

СТАР. 2

### 31-я спецыялізаваная аптовая выстаўка-кірмаш PRODEXPO-2025 сёння завяршае сваю работу




**Яна праходзіць у Мінскім міжнародным выставачным цэнтры. Сёлета акрамя беларускіх прадпрыемстваў свае дасягненні і тэхналогіі дэманструюць удзельнікі з Расіі (прадстаўлены 11 рэгіёнаў), Азербайджана, Арменіі, В'етнама, Індыі, Турцыі. Асноўвай дзелавой праграмы сталі сустрэчы і B2B-перагаворы з прадстаўнікамі гандлёвых сетак Беларусі і Расіі, выстаўку наведваюць замежныя пасольскія дэлегацыі 27 краін. Свае экспазіцыі прэзентавалі 164 удзельнікі.**

# АГЛЯД ЯКАСЦІ І МАШТАБНАЯ ДЭГУСТАЦЫЯ







На апошні дзень арганізатары пакінулі шмат цікавага. У прыватнасці, узнагароджанне пераможцаў дэгустацыйнага конкурсу, Міжнародны чэмпіянат кандытарскага мастацтва, Міжнародны конкурс па антыгравітацыйных тортах «Мары збываюцца». На пляцоўцы «Майстэрня смаку» прадэманструюць арт-кампазіцыю «Каляды ў салодкім горадзе», таксама наведвальнікі пабачаць работы пераможцаў Міжнароднага конкурсу на лепшае пакаванне «СмакАрт-2025», будзе магчымасць прадэгуставаць і найлепшыя ўзоры хлебабулачных і кандытарскіх вырабаў для здаровага харчавання падчас Рэспубліканскага агляду якасці хлебабулачных і кандытарскіх вырабаў «Смаката-2025», а разам з гэтым атрымаць рэкамендацыі па здаровым харчаванні ад спецыялістаў. Ну а кульмінацыяй стане цырымонія ўрачыстага закрыцця выстаўкі і ўручэнне дыпломаў і памятных узнагарод удзельнікам.

Міжнародны дэгустацыйны конкурс якасці харчовай прадукцыі «ПрадЭкспа. Традыцыі. Якасць. Інавацыі» праводзіцца па такіх кірунках, як хлебабулачныя вырабы, мясная прадукцыя (у тым ліку з мяса птушкі), малочная прадукцыя, бульбапрадукты і кандытарскія вырабы. Штогод у ім бяруць удзел каля 100 айчынных і замежных вытворцаў. З 2020-га Навукова-практычны цэнтр Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі па харчаванні выступае яго суарганізатарам.

Як расказала **намеснік генеральнага дырэктара па навуковай рабоце і стандартызацыі Рэспубліканскага ўнітарнага прадпрыемства «Навукова-практычны цэнтр Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі па харчаванні» Наталля КАМАРОВА**, штогод камісіі ацэньваюць ад 300 да 500 узораў. Па выніках конкурсу прысуджаюцца Гран-пры, залатыя і сярэбраныя медалі. Сёння, 14 лістапада, пераможцам уручаць заслужаныя ўзнагароды, а таксама дыпломы якасці.



Паводле меркавання **галоўнага рэдактара часопіса «Пекар&Кандытар» Людмілы АЎСЯННІКАВАЙ**, сапраўднай разынкай апошняга дня стане і конкурс антыгравітацыйных тортаў, якія літаральна лунаюць у прасторы. Такое спаборніцтва ў рамках выстаўкі праводзіцца ўпершыню. Гэта і вяршыня кандытарскага майстэрства, і сапраўднае мастацтва. Цікавая і лакацыя «Майстэрня смаку» з казачнымі дэкарацыямі з шакаладу, карамелі, мастыкі. Тут жа правядзе свой майстар-клас сталічны кандытар, пераможца Сусветнай кулінарнай алімпіяды Вольга Гатоўка. Такім чынам, сёння чакаецца, бадай, самая насычаная праграма. Калі вы яшчэ не паспелі наведаць галоўную харчовую і кулінарную падзею — паспяшайцеся.

**Алена КРАВЕЦ.**
**Фота Лізаветы ГОЛАД і БелТА.**

PRO ЭКАНОМІКУ

## «ПАЗІТЫЎНЫ СІГНАЛ ДЛЯ ЭКАНОМІКІ»

### Эксперты — аб запавольванні тэмпаў інфляцыі ў Беларусі

Днямі Нацбанк агучыў даныя аб індэксе спажывецкіх цэн за кастрычнік 2025-га, паказаўшы, што гэты паказчык знізіўся да 6,9 % у гадавым выражэнні. Такі пазітыўны трэнд не маглі не заўважыць у экспертнай супольнасці, бо зніжэнне працягваецца ўжо трэці месяц запар.



СТАР. 3

СПАЖЫВЕЦ

## БУЛЬБА ПА 4 ЕЎРА. НЕ Ў НАС

### Параўналі цэны на другі хлеб у Беларусі і краінах Еўропы

Падыходзіць да завяршэння сезон, калі аграрыі вязуць у гарады ўраджай. Восеньскія сезонныя кірмашы праходзяць не толькі ў Беларусі, але і ў Еўропе. Аднак калі там яны становяцца ў большай ступені культурным элементам і спосабам падтрымкі фермераў, то ў нас гэта па-ранейшаму інструмент забеспячэння харчовай даступнасці. Пры гэтым няродка паміж спажыўцамі ўзнімаецца пытанне цэн на так званы «баршчовы набор». З гэтай нагоды параўналі цэны на такую прадукцыю ў нашай краіне, у Польшчы, Літве, Латвіі, Германіі, Францыі, Іспаніі, Бельгіі і Вялікабрытаніі.



СТАР. 3

ПЯЦІГОДКА ЯКАСЦІ

## КАЛІ ЗУСІМ НЕСАЛОДКА

### У Рэспубліканскім цэнтры эндакрыналогіі з дапамогай сучасных метадаў лечаць самыя складаныя выпадкі дыябету

Рэспубліканскі цэнтр эндакрыналогіі, які працуе на базе Рэспубліканскага цэнтра медыцынскай рэабілітацыі і бальнеалячэння ў Мінску, прымае пацыентаў з усёй краіны з цяжкімі эндакрыннымі захворваннямі. Напрыклад, цукровым дыябетам, калі ў пацыента ён цяжка паддаецца лячэнню, маюцца спадарожныя хваробы, цяжкія ўскладненні, ці патрэбны абследаванні на абсталяванні экспертнага класу. Усе лабараторныя аналізы, ультрагукавую і функцыянальную дыягностыку, першасную і паўторную кансультацыю эндакрынолага і іншых спецыялістаў пацыент, як правіла, праходзіць у дзень прыезду і адразу атрымлівае прызначэнні.



СТАР. 4

ISSN 1990 — 763X

Яшчэ больш цікавых навін па-беларуску — у нашым тэлеграм-канале @zviazdaby.
Падпісвайцеся, чытайце, будзьце ў курсе!

# «ЁСЦЬ ДАСЯГНЕННІ, ВЫНАХОДКІ І КАНКРЭТНЫ ВЫНІК — АТРЫМАЙ ЗА ГЭТА ГРОШЫ»


Фота БелТА.

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

«А калі нешта атрымалася і гэта будзе запатрабавана, ну, дзякуй, таму што ўсё роўна навука павінна быць на крок наперадзе нашай практыкі і нават нашай свядомасці. Таму трэба глядзець на вынік нашых вынаходак», — адзначыў Прэзідэнт.

Уладзімір Каранік далажыў, што цяпер Акадэмія навук паварочваецца тварам да рэальнага сектара эканомікі. Усе адзначаюць, што ўзровень узаемадзеяння з рэальным сектарам эканомікі ўзрос, гэта датычыцца і БНБК, і прадпрыемстваў малакаперапрацоўкі, і аграпрамысловага сектара.

«Прыемна, што да нас пачынаюць звяртацца», — прызнаўся ён.

«Галоўнае, каб вы маглі адрэагаваць на гэтыя звароты. Зацікаўленасць будзе вялікая, таму што вы ж бачыце: ціск з майго боку і з боку ўрада ўзмацняецца», — адрэагаваў на гэта кіраўнік дзяржавы.

## ВЯЛІКАЯ РАЗМОВА З ВУЧОНЫМІ

Аляксандр Лукашэнка назваў сустрэчу з кіраўніком НАН першым крокам да правядзення вялікай размовы з вучонымі, якая запланаваная на наступны тыдзень. «Трэба, каб члены-карэспандэнты, акадэмікі прысутнічалі і разумелі рэальныя патрабаванні. Мы не збіраемся падлашчвацца да вучоных, нават я. Чаму? Таму што гэта разумныя людзі, і яны павінны разумець, што без выніку толку не будзе», — канстатаваў кіраўнік дзяржавы. І нагадаў, што трэба, каб пры падрыхтоўцы да гэтай размовы было менш заарганізаванасці. «Калі ў вучоных ёсць, што сказаць, па парадку дня нарады — няхай кажуць, паслухаем», — рэзюмаваў Прэзідэнт.

### У тэму

#### АПЕРАТЫЎНАСЦЬ, ЭФЕКТЫЎНАСЦЬ І ВЫНІКОВАСЦЬ



У размове з журналістамі Уладзімір Каранік адзначыў, што Акадэмія навук як любая структура ў дзяржаве павінна мяняцца, адказваючы на выклікі і патрабаванні часу. Тое, што дапускалася яшчэ 10 гадоў таму, з нашым хуткім тэмпам жыцця і змяненнем геапалітычнай абстаноўкі цяпер ужо неактуальна. «Тыя патрабаванні, якія сёння прад'яўляюцца Акадэміі навук з боку дзяржавы, з боку рэальнага сектара эканомікі — гэта практыкаарыентаванасць, аператыўнасць, эфектыўнасць і выніковасць. І тут трэба разумець, што нас ніхто не заклікае адмовіцца ад фундаментальных даследаванняў, ад атрымання новых ведаў і стаць канструктарскімі бюро буйных прадпрыемстваў. Не. Але мы павінны дакладна разумець, якія праблемы хвалююць нашу прамысловасць, перапрацоўку, АПК, быць гатовымі забяспечыць навукова-метадычнае суправаджэнне вырашэння іх праблем, — падкрэсліў кіраўнік Акадэміі навук. — Сістэма, якая не дапускае з'яўлення неактуальных тэм, павінна працаваць эфектыўна і больш аператыўна».

Уладзімір Каранік перакананы: Акадэмія навук і вучоныя павінны мець больш цесныя ўзаемаадносіны з рэальным сектарам эканомікі, разумеючы, якія пытанні ёсць на месцах, расказваць пра свае магчымасці. Ён дадаў, што кампетэнцыі і магчымасці ёсць у многіх кірунках дзейнасці Акадэміі навук. І ў прыклад прывёў паказчык экспарту Акадэміі навук — 64 мільёны долараў за дзевяць месяцаў гэтага года. Распрацоўкі Нацыянальнай акадэміі навук вядомыя і на знешнім контуры, але пра некаторыя мала інфармаваныя ўнутры краіны. І гэта трэба выправіць, адзначыў Уладзімір Каранік.

Гаворачы аб павышэнні статусу вучоных, кіраўнік НАН заўважыў, што не раз абмяркоўвалася і фінансавая матывацыя вучоных. «Мне вельмі імпануе пазіцыя Прэзідэнта, які кажа пра тое, што вучоных трэба падтрымліваць, але ў гэтай падтрымцы не павінна быць ураўнілаўкі. Тое, што ты абараніў дысертацыю і даказаў, што можаш быць даследчыкам і генерыраваць ідэі і пры гэтым спыніўся, то дзяржава табе ўжо даплачвае за ступень. Калі хочаш, каб узровень даплаты быў большы, працягвай даследчую працу, вынаходзь, ствара́й, атрымлівай новыя веды і рухайся наперад. Тады дзяржава падтрымае. Прынцып веласіпеда: пакуль ты рухаешся, ты трымаеш раўнавагу, як толькі ты спыніўся — упаў. Тым, хто рухаецца, трэба дапамагчы, падтрымаць», — рэзюмаваў Уладзімір Каранік.

**Валерыя СЦЯЦКО.**

АКЦЭНТЫ

# НЕ ТОЛЬКІ АТАМНЫЯ ТЭХНАЛОГІІ

## Аляксандр Турчын і Аляксей Ліхачоў абмеркавалі далейшае супрацоўніцтва Беларусі і «Расатама»

Прэм'ер-міністр Беларусі Аляксандр ТУРЧЫН учора сустрэўся з генеральным дырэктарам дзяржкарпарацыі «Расатам» Аляксеем ЛІХАЧОВЫМ, перадае карэспандэнт БелТА.

— Лістапад — знакавы месяц для нашых узаемаадносін. Пяць гадоў таму першая электраэнергія з беларускай АЭС пайшла ў сетку, два гады таму афіцыйна ўвялі станцыю (другі энергаблок. — **Заўв. рэд.**) у эксплуатацыю. Вялікі дзякуй вам за дапамогу, за супрацоўніцтва. Прыйшоў час абмеркаваць канкрэтныя крокі па нашым далейшым узаемадзеянні. Хацелася б падчас сённяшняй сустрэчы разгледзець магчымыя варыянты, узніклі новыя ідэі. Спадзяюся на шчырую размову, — сказаў Аляксандр Турчын.

Генеральны дырэктар «Расатама» адзначыў, што Беларусь імкліва ўварвалася ў эліту атамнай энергетыкі планеты.

— 40 % электрычнасці выпрацоўваецца на атамнай станцыі. Якасць работы БелАЭС дазваляе ёй быць не толькі сімвалам беларуска-расійскага супрацоўніцтва, фактарам развіцця эканомікі Беларусі — атамная станцыя стала вітрынай для ўсёй сусветнай атамнай супольнасці. Партнёры з блізкага замежжа і з далёкіх краін нам кажуць: «Былі ў Беларусі, хочам вось так». Вам таксама вялікі дзякуй за тое, што вы шчодра дзеліцеся вопытам, беларускія спецыялісты працуюць з намі ў трэціх краінах, — падкрэсліў Аляксей Ліхачоў.


Фота БелТА.

Другі энергаблок Беларускай АЭС 13 лістапада выведзены ў планава-папераджальны рамонт.

— Усё ідзе штатна. Будзем далучаць адпрацаванае ядзернае паліва ў рэцыклінг — у паўторнае выкарыстанне. Бачым станцыю ў Астраўцы як элемент замкнёнага паліўнага цыкла, — падзяліўся ён.

Таксама Аляксей Ліхачоў падзякаваў беларускаму боку за ўвагу да неатамных тэхналогій. У Мінску адкрыўся Рэспубліканскі цэнтр адытыўных тэхналогій. Праект рэалізаваны як сумеснае прадпрыемства беларускага холдынга «Гарызонт» і дзяржкарпарацыі «Расатам».

Па словах гендырэктара «Расатам», цікавасць да цэнтра велізарная, у планах — нарошчваць яго магутнасці.

— Працуем і па назапашвальніках энергіі, — дадаў генеральны дырэктар «Расатама».

МІЖПАРЛАМЕНЦКАЕ ЎЗАЕМАДЗЕЯННЕ

# ВЫСОКАЯ ДЫНАМІКА НА РОЗНЫХ УЗРОЎНЯХ

Беларуская парламенцкая дэлегацыя на чале з Наталляй КАЧАНАВАЙ удзельнічае ў мерапрыемствах Міжпарламенцкай Асамблеі дзяржаў — удзельніц СНД у Душанбэ.

**Пачалася насычаная праграма візіту з сустрэчы Старшыні Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь са Старшынёй Маджлісі мілі Маджлісі Олі Таджыкістана Рустамі Эмамалі. Бакі абмеркавалі шырокае кола пытанняў двухбаковых адносін. У ходзе сустрэчы адзначана, што на парламенцкім вектары супрацоўніцтва Беларусі і Таджыкістана характарызуецца высокім узроўнем даверу і адкрытасці. Парламентарыі дзвюх краін традыцыйна ўдзельнічаюць у назіранні за выбарамі, якія праводзяцца ў Беларусі і Таджыкістане, узаемадзейнічаюць на розных міжнародных парламенцкіх пляцоўках.**

## РЭГІЯНАЛЬНАЕ СУПРАЦОЎНІЦТВА І КУЛЬТУРНА-ГУМАНІТАРНЫЯ АБМЕНЫ

У лютым гэтага года парламент Беларусі атрымаў статус назіральніка ў Азіяцкай парламенцкай асамблеі. У сувязі з гэтым беларускі бок выказаў спадзяванне на супрацоўніцтва з калегамі з Таджыкістана і ў гэтай парламенцкай арганізацыі.

«Беларусь і Таджыкістан звязвае моцнае сяброўства, — падкрэсліла Наталля Качанава. — Дзякуючы мудраму кіраўніцтву лідараў дзяржаў — Аляксандру Лукашэнку і Эмамалі Рахмону — супрацоўніцтва Беларусі і Таджыкістана выйшла на ўзровень стратэгічнага партнёрства».

Узровень двухбаковых кантактаў паміж дзяржавамі характарызуецца высокай дынамікай на розных узроўнях. Неаднаразова праводзіўся абмен афіцыйнымі візітамі кіраўнікоў дзяржаў, прэм'ер-міністраў і міністраў, рэгулярна праходзяць рабочыя сустрэчы ў рамках мерапрыемстваў інтэграцыйных аб'яднанняў — СНД, ШАС, АДКБ. Дагаворна-прававая база адносін уключае больш за 80 двухбаковых пагадненняў рознага ўзроўню.

Асноўны дакумент у галіне практычнага развіцця двухбаковых адносін у гандлёва-эканамічнай і гуманітарнай сферах Беларусі і Таджыкістана — дарожная карта двухбаковага супрацоўніцтва Рэспублікі Беларусь і Рэспублікі Таджыкістан на 2022—2026 гады. Беларускі бок упэўнены ў наяўнасці значнага патэнцыялу для гандлёва-эканамічнага і інвестыцыйнага супрацоўніцтва. Беларусь уваходзіць у дзясятку краін — партнёраў Таджыкістана па тавараабароце, заняўшы восьмае месца.


Фота БелТА.

Па словах Старшыні Савета Рэспублікі, у Беларусі выступаюць за ўмацаванне міжрэгіянальнага супрацоўніцтва з Таджыкістанам, а таксама пабрацімскіх сувязяў паміж гарадамі. «У гэтым годзе адбыліся візіты ў Таджыкістан дэлегацый Віцебскай і Мінскай абласцей, у ходзе якіх падпісаны дакументы аб супрацоўніцтве з Сагдыйскай вобласцю, — канкрэтызавала спікер. — Чакаюцца візіты ў адказ у Беларусь. Лічым патэнцыял рэгіянальнага супрацоўніцтва найважнейшым драйверам міждзяржаўнага ўзаемадзеяння».

Краіны ўзаемадзейнічаюць і ў культурна-гуманітарнай сферы. Наталля Качанава выказала ўдзячнасць за ўдзел таджыкскіх хлопцаў і дзяўчат у культурна-адукацыйных мерапрыемствах, прымеркаваных да 80-й гадавіны Перамогі савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне, якія прайшлі ў Беларусі: праекце «Цягнік Памяці» і форуме «Дзеці Садружнасці».

На сустрэчы са Старшынёй Сената Олій Мажліса Узбекістана Танзілой Нарбаевай Наталля Качанава адзначыла, што паміж дзвюма краінамі склаліся добрыя адносіны, якія пацверджаны гадамі дружбы. «У гэтым заслуга перш за ўсё прэзідэнтаў Аляксандра Лукашэнкі і Шаўката Мірзіёева, — канстатавала спікер. — Кіраўнікі дзяржаў ставяць дакладныя задачы, накіраваныя на рэалізацыю плённага супрацоўніцтва паміж краінамі. Узаемадзеянне па парламенцкай лініі дапамагае ў рэалізацыі гэтых задач».

На палях асенняй сесіі Міжпарламенцкай Асамблеі дзяржаў — удзельніц СНД таксама адбылася сустрэча Старшыні Савета Рэспублікі са Старшынёй Сената Парламента Казахстана Маўленам Ашымбаевым.

## ПРАЕКТ, ЯКІ ЯДНАЕ

Выступаючы на пасяджэнні Савета МПА СНД, Наталля Качанава звярнула ўвагу на тое, што мерапрыемствы, якія праводзяцца пад эгідай Міжпарламенцкай Асамблеі СНД, заўсёды накіраваны на ўмацаванне добрасуседскіх адносін, моцнай дружбы паміж нашымі народамі, развіццё поўнафарматнага супрацоўніцтва. «Яны напоўнены атмасферай узаемаразумення і павагі да нашых агульных духоўна-маральных каштоўнасцяў, гістарычнай памяці, культурнай разнастайнасці», — дадала спікер і нагадала, што сёлета наша краіна ўпершыню прымала юбілейны Міжнародны культурна-адукацыйны форум «Дзеці Садружнасці», які аб'яднаў 80 школьнікаў з Арменіі, Беларусі, Казахстана, Кыргызстана, Расіі, Таджыкістана, Туркменістана і Узбекістана.

**Паводле прэс-службы Савета Рэспублікі.**

> **Прэзідэнт Беларусі Аляксандр ЛУКАШЭНКА:**
>
> ***«Калі Літва хоча — мяч на яе баку. Калі ласка, адкрывайце граніцу, будзем працаваць і супрацоўнічаць, як было да гэтага часу».***
>
> *На нарадзе аб дапрацоўцы праграмы сацыяльна-эканамічнага развіцця Беларусі на 2026—2030 гады, 10 лістапада 2025 г.*

АКЦЭНТЫ

# ГУЛЬНЯ З ШАРАМІ

## «Вільнюс відавочна хавае больш, чым паказвае і адцягвае ад галоўнай праблемы»: эксперты — аб сітуацыі на беларуска-літоўскай граніцы

Днямі Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка заслухаў даклады старшыні Дзяржаўнага пагранічнага камітэта Канстанціна Моластава, міністра ўнутраных спраў Івана Кубракова і міністра замежных спраў Максіма Рыжанкова аб сітуацыі на беларуска-літоўскай граніцы. Была прадстаўлена інфармацыя аб аператыўнай абстаноўцы, дзеяннях органаў пагранічнай службы сумесна з іншымі ведамствамі, аб рэалізацыі даручэнняў кіраўніка дзяржавы. Эксперты — аб дзеяннях літоўскіх улад і пазіцыі афіцыйнага Мінска ў дачыненні да сітуацыі на граніцы.

### СТРАТЫ — РЭПУТАЦЫЯ ПЛЮС МІЛЬЁНЫ ЕЎРА



— Афіцыйныя ўлады Літвы не жадаюць адмовіцца ад ідэі чароўнага ператварэння з усходнееўрапейскага палітычнага карліка, які знаходзіцца пад знешнім кіраваннем, у вядучага геапалітычнага гульца сусветнага значэння, які ўплывае на лёс усяго еўразійскага кантынента, — канстатуе **намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Алег ДЗЯЧЭНКА.**

Ён адзначае той факт, што бяздумнае прытрымліванне авантурыстычнай палітыкі Брусэля па ўвядзенні эканамічных санкцый і абмежаванняў у дачыненні да Саюзнай дзяржавы ўжо нанесла вялізную эканамічную шкоду Літве, выклікаўшы рост узроўню абсалютнай беднасці сярод насельніцтва.

— Усяго ў краіне пражывае крыху больш за 2,5 мільёна літоўцаў. З іх звыш 600 тысяч знаходзяцца па-за межамі беднасці, а сацыяльнага дна, жабрацкага існавання ў прамым сэнсе гэтага слова летась дасягнулі 167 тысяч жыхароў некалі багатай па савецкіх мерках суседняй краіны.

Дэпутат канстатуе: на фоне гэтых катастрафічных падзей у эканоміцы і сацыяльнай сферы ў Літве ўзніклі і структураваліся рознага роду крымінальныя структуры міжнароднага маштабу, якія атрымліваюць даходы ў тым ліку ад нелегальнай міграцыі і кантрабанды спажывецкай прадукцыі, уключаючы тытунёвыя вырабы.

— Пад каўпаком Еўрасаюза краіна хутка ператварылася ў такую шэрую зону, дзе свабодна арудуюць злачынныя элементы ўсіх масцяў. Літоўскія ж палітыкі самага высокага рангу спрабуюць закамуфляваць няздольнасць сваёй дзяржавы эфектыўна змагацца з арганізаванай злачыннасцю папулісцкімі і пазбаўленымі ўсякага здаровага сэнсу заявамі аб «гібрыдных атаках» з Усходу.

Дэпутат са шкадаваннем канстатуе, што чарговая літоўская выхадка, выкліканая палітычнымі амбіцыямі высокапастаўленых чыноўнікаў, прывяла да новага вітка эскалацыі міжнародных адносін — да блакіравання літоўска-беларускай граніцы.

— Як паказваюць факты рэальнага жыцця, ад гэтага рашэння пацярпелі найперш еўрапейскія і, канкрэтна, літоўскія аўтаперавозчыкі. Эканамічны ўрон яшчэ трэба падлічыць. Па самых сціплых ацэнках — гэта мільёны еўра. Акрамя таго, пацярпела і міжнародная рэпутацыя Літвы, якую наўрад ці ўдасца ў найбліжэйшай перспектыве хоць неяк аднавіць, — мяркуе парламентарый.

### ВІЛЬНЮС — ІНІЦЫЯТАР АБСУРДНАЙ СІТУАЦЫІ



У эфіры ток-шоу «Будні» на «Альфа Радыё» **член Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па міжнародных справах Аляксандр ШПАКОЎСКІ** падкрэсліў, што Беларусь гатова аднавіць адносіны з Літоўскай Рэспублікай у пытаннях аховы граніц цяпер, неадкладна, усебакова, па ўсім спектры пытанняў, звязаных з пагранічнай бяспекай.

— Але пакуль з Вільнюса гучаць вельмі супярэчлівыя заявы. Спачатку яны пісалі лісты ў нейкі пагранатрад, як быццам бы асобна ўзятая пагранічная застава з'яўляецца самастойным суб'ектам. Калі вы, ініцыятары закрыцця граніц, хочаце размаўляць па такім сур'ёзным пытанні, то вам неабходна размаўляць з Мінскам. На правядзенне перагавораў упаўнаважана Міністэрства замежных спраў як суб'ект, які пад кіраўніцтвам Прэзідэнта рэалізуе айчынную знешнюю палітыку. З Літвы гучаць заявы, што яны не будуць адкрываць граніцу, і заклікаюць сваіх грамадзян, якія знаходзяцца на нашай тэрыторыі, ладзіць акцыі пратэсту. Але мы ведаем, што ў беларускіх рэаліях гэта абсалютна контрпрадуктыўна. Пратэставаць ім трэба ў Вільнюсе, каля будынка прэзідэнтуры ці ўрада Літоўскай Рэспублікі, бо менавіта Вільнюс з'яўляецца ініцыятарам абсурднай сітуацыі, якая склалася.

Аляксандр Шпакоўскі звярнуў увагу:

— У нашым разуменні так званая кантрабанда — гэта «казус бэлі». Бо самі літоўцы заяўляюць аб тым, што кантрабандныя грузы дастаўляюцца па паветры. Тады прычым тут сухапутная граніца? Ужо ўсім відавочна, што шмат у чым гэта ўнутрылітоўскае пытанне. Гэтыя грузы цыгарэт, калі яны сапраўды існуюць у тых маштабах, пра якія заяўляе Вільнюс, атрымліваюць на тэрыторыі Літвы пэўныя грамадзяне ці злачынныя групы, і пазней самі літоўцы іх распаўсюджваюць па тэрыторыі ўсяго Еўрапейскага саюза. Займіцеся сабой, навядзіце парадак у сябе ў краіне.



У сувязі з гэтым **эксперт па нацыянальнай бяспецы Аляксандр ЦІШЧАНКА** падзяліўся ў сацыяльнай сетцы цікавымі фактамі.

— У Літве ў жніўні гэтага года ў Каўнасе паліцыя накрыла падпольны цыгарэтны завод, які па іх падліках вырабіў 6,5 мільёна пачкаў кантрафактных цыгарэт. Калі ўлічыць, што шар (метэазонд. — **Заўв. «Зв.»**) паднімае адзін кораб або 500 пачкаў цыгарэт, перавесці гэты аб'ём у шары, то атрымаецца аж 13 тысяч штук. Нават калі дапусціць, што гэта гадавая прадукцыйнасць, то выходзіць па 35 шароў у дзень. А Вільнюс скардзіцца, што ў кастрычніку ў іх было выяўлена аж 70 шароў з Беларусі. Але гэта ўсяго два шары на дзень. Гэта значыць, у іх адзін падпольны заводзік дае кантрафакту ў 17 разоў больш, чым уся беларуская пагроза. А паводле аператыўных даных, колькасць такіх падпольных вытворчасцяў у Літве можа даходзіць ад 10 да 20. Вільнюс відавочна хавае больш, чым паказвае і адцягвае ўсіх ад галоўнай праблемы.

### ЛІТВА САМА АДДАЛА ЭКАНАМІЧНЫЯ ПЕРАВАГІ



— Калі мы звернемся да не такой ужо і даўняй гісторыі, то ўбачым, што пад выглядам умацавання нацыянальнай бяспекі Рэспублікі Літвы і супрацьдзеянню «гібрыдных атак» з боку Расіі і Беларусі былі выдзелены немалыя сумы і наўмысна закрыты Віленскі аэрапорт, — нагадвае **член Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па мясцовым упраўленні і самакіраванні, старшыня Ваўкавыскага райвыканкама Дзмітрый ЗАХАРЧУК.** — Апроч гэтага, нядаўна закрывалася граніца з Польшчай для «рамонту». Працягнуліся новыя ўмацаваныя дарогі, заменены масты, і ўся інфраструктура пагранічча «адрамантавалася». І я ўпэўнены, што і далей Літва ідзе па тым жа шляху.



Сітуацыя на граніцы паміж Літвой і Беларуссю выклікае шмат пытанняў, згаджаецца з калегам **член Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы Андрэй Крываносаў.**

— Гэта прыклад, калі жаданне аказаць палітычны націск на нашу краіну прыводзіць да эканамічных праблем для самой жа Літвы.

Сенатар перакананы: сваімі дзеяннямі літоўскія ўлады шкодзяць у першую чаргу сваім грамадзянам і свайму бізнесу, а не Беларусі.

— Давайце паглядзім на факты. Пакуль Літва закрывае прапускныя пункты, Польшча дзейнічае практычна і разумна. Яна адкрывае свае пункты пропуску і прапускае ўвесь паток грузаў. Польскі бізнес зарабляе грошы, бюджэт атрымлівае падаткі. У той жа час літоўскія перавозчыкі застаюцца без працы і прыбыткаў. Кампаніі проста сыходзяць туды, дзе ім зручней і выгадней працаваць, — у Польшчу. Гэта не часовыя цяжкасці, гэта ўдар па ўсёй сферы перавозак у Літве, ад якога яна можа і не акрыяць.

Сенатар падкрэсліў: Літва сама сваімі рукамі аддала эканамічныя перавагі, каб дабіцца палітычнай мэты, якая так і не была дасягнута.

— Гэта пройгрышная сітуацыя. Калі нічога не зменіцца, то ў хуткім часе мы ўбачым, што Літва цалкам страціла сваё значэнне як краіна для транзітных перавозак. І вінаватая ў гэтым будзе толькі яе ўласная палітыка, — канстатаваў Андрэй Крываносаў.

# «ПАЗІТЫЎНЫ СІГНАЛ ДЛЯ ЭКАНОМІКІ»

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*



Так, **член Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па эканоміцы, бюджэце і фінансах, начальнік філіяла ААТ «Банк развіцця Рэспублікі Беларусь» у Гродне Алена СТАЛЬБОЎСКАЯ** выказала ўпэўненасць, што зніжэнне тэмпаў інфляцыі ў Беларусі трэці месяц запар — несумненна пазітыўны трэнд, які сведчыць аб узроўні стабільнасці эканамічнай сітуацыі ў краіне.

— Месяцам раней гэты паказчык быў роўны 7,1 %, паводле вынікаў жніўня ён складаў 7,2 %, а ў ліпені дасягаў 7,4 %, — нагадала сенатар.

На яе думку, гэты факт надае пэўнага аптымізму і дазваляе казаць пра магчымасць больш прадказальнага эканамічнага планавання як для бізнесу, так і для хатніх гаспадарак.



— Безумоўна, на запаволенне інфляцыі аказвае станоўчы ўплыў унутраная палітыка нацыянальнага рэгулятара, накіраваная на стрымліванне грашовай масы, — звяртае ўвагу эксперт. — Немалаважнае значэнне таксама маюць і знешнія фактары, такія як адносная стабільнасць на сусветных рынках энергарэсурсаў і харчавання.

Аднак суразмоўніца адзначае, што, нягледзячы на пазітыўную дынаміку, не варта забываць аб патэнцыяльных рызыках:

— Уплыў знешніх шокаў, такіх як нестабільная геапалітычная сітуацыя або ваганні цэн на асноўныя экспартныя тавары, можа негатыўна адбіцца на інфляцыйных чаканнях і запатрабаваць аператыўную карэкціроўку манетарнай палітыкі. Таму вельмі неабходна захоўваць пільнасць і працягваць узважаны падыход да кіравання эканомікай. Гэта стварае аснову для больш стабільнага эканамічнага развіцця і павышэння ўзроўню жыцця насельніцтва.



**Намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па эканамічнай палітыцы Дзяніс КАРАСЬ** у сваю чаргу адзначыў:

— Інфляцыя, кажучы простай мовай, — гэта ўстойлівы рост агульнага ўзроўню цэн на тавары і паслугі. І адбываецца яна тады, калі назіраецца зніжэнне выпуску аб'ёмаў нацыянальнай вытворчасці, манаполія буйных прадпрыемстваў, рост дзяржаўных выдаткаў, дэфіцыт тавараў і паслуг, паслабленне нацыянальнай валюты.

Парламентарый канстатуе той факт, што сёння наша нацыянальная эканоміка эфектыўна развіваецца, да нас ідуць інвестары, нашу прадукцыю купляюць не толькі беларусы, але і за межамі краіны, да нас з задавальненнем прыязджаюць турысты. У выніку гэтага адбываецца рост дабрабыту грамадзян пры невялікай інфляцыі.

— Пры нізкай інфляцыі цэны растуць павольна, але ўсё ж растуць. Калі кажуць, што інфляцыя зніжаецца, гэта значыць, спажывецкі кошык даражэе павольней, чым раней, — тлумачыць суразмоўца. — Калі цэны растуць хутчэй, чым даходы, людзі могуць купіць усё менш і менш тавараў і паслуг. Становіцца рызыкоўна рабіць зберажэнні на будучыню, бо яны таксама могуць абясцэніцца. Таму людзі прымаюць відавочныя фінансавыя рашэнні: не адкладаюць грошы, а выдаткоўваюць іх як мага хутчэй — купляюць каштоўныя тавары, нерухомасць, замежную валюту.

Дэпутат звяртае ўвагу: растуць і даходы насельніцтва, а значыць, тавары і паслугі па кішэні кожнаму.

— І гэта дае магчымасць камфортна жыць і з упэўненасцю глядзець у будучыню, што дазваляе планаваць бюджэты на доўгі тэрмін, збіраць, інвеставаць, запускаць новыя бізнес-праекты, — падкрэсліў ён.



На думку **намесніка старшыні Пастаяннай камісіі па эканоміцы, бюджэце і фінансах, старшыні праўлення Беларусбанка Віктара АНАНІЧА**, пазітыўны трэнд да запаволення інфляцыі сведчыць аб тым, што Нацыянальны банк і ўрад эфектыўна каардынуюць меры па грашова-крэдытнай і бюджэтнай палітыцы, каб выканаць прагнозы паказчык сацыяльна-эканамічнага развіцця па выніках 2025 года.

> **— Зніжэнне інфляцыйнага ціску павышае давер насельніцтва да нацыянальнай валюты і банкаўскай сістэмы, а таксама стварае больш прадказальныя ўмовы для бізнесу, стымулюе інвестыцыі і доўгатэрміновыя праекты, — канстатуе эксперт. — Акрамя таго, устойлівасць цэнавай дынамікі наўпрост адбіваецца на дабрабыце грамадзян. Зніжэнне інфляцыі азначае рост рэальнай пакупніцкай здольнасці, а значыць — умацаванне сацыяльнай стабільнасці. Для банкаўскага сектара гэта адкрывае магчымасці крэдытавання прадпрыемстваў на больш выгадных умовах.**

На думку сенатара, сённяшні трэнд — гэта важны сігнал: эканоміка Беларусі паступова выходзіць на траекторыю ўстойлівага развіцця.

— Наша задача — замацаваць дасягнутыя вынікі, працягваць работу над мадэрнізацыяй прамысловасці, развіццём экспарту і падтрымкай малога і сярэдняга бізнесу. Па сутнасці, зніжэнне інфляцыі — гэта не толькі макраэканамічны паказчык, але і рэальнае паляпшэнне якасці жыцця людзей, што з'яўляецца галоўным прыярытэтам дзяржаўнай палітыкі, — рэзюмаваў суразмоўца.

# НЕ БОЛЬШ ЗА ДВА ЧАЛАВЕКІ І НЕ БОЛЬШ ЗА ДВА ДНІ

## Узмоцнены меры кантролю за эфектыўнасцю замежных камандзіровак

Не так даўно Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка падпісаў Указ № 347 «Аб службовых камандзіроўках за мяжу». Дакумент накіраваны на дасягненне максімальнага эканамічнага эфекту ад службовых камандзіровак за мяжу работнікаў дзяржаўных органаў і арганізацый.

Акрамя таго, узмоцнены меры кантролю за эфектыўнасцю замежных камандзіровак, павышаецца адказнасць кіраўнікоў за парушэнне патрабаванняў пры прыняцці рашэнняў аб камандзіраванні. Удакладнены таксама парадак накіравання ў камандзіроўкі і іх дакументальнага афармлення.

Нацыянальны прававы інтэрнэт-партал размясціў у сябе на рэсурсе Палажэнне аб службовых камандзіроўках за мяжу. У гэтым дакуменце гаворыцца, што «дзяржаўныя органы (дзяржаўныя арганізацыі) пры разглядзе пытання аб накіраванні работніка ў камандзіроўку абавязаны папярэдне прапрацаваць магчымасць дасягнення мэт камандзіроўкі сіламі



дыпламатычных прадстаўніцтваў і консульскіх устаноў Рэспублікі Беларусь у рамках ажыццяўлення імі сваіх функцый». А працягласць камандзіроўкі не павінна перавышаць двух каляндарных дзён (без уліку часу на праезд да месца камандзіравання і назад), калі іншае не ўстаноўлена гэтым Палажэннем.

Колькасць работнікаў дзяржаўнай арганізацыі, якіх накіроўваюць у камандзіроўку для арганізацыйна-тэхнічнага, кансультацыйнага, інфармацыйнага забеспячэння кіраўніка гэтай арганізацыі альбо яго намесніка, як правіла, не павінна перавышаць двух чалавек.

Прыярытэтным заданнем для камандзіруемага за мяжу кіраўніка або яго намесніка надалей стане рашэнне стратэгічна важных эканамічных задач, якія вызначае Прэзідыум Савета Міністраў. У іх ліку задачы па нарошчванні і дыверсіфікацыі экспарту, забеспячэнні імпартазамяшчэння і энергетычнай бяспекі. Канкрэтныя задачы на падставе пераліку, які фарміруецца і пераглядаецца на рэгулярнай аснове Прэзідыумам Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь, вызначаюцца службовай асобай, якая прымае рашэнне аб накіраванні ў камандзіроўку.

Менавіта гэты пункт указа ўступае ў сілу з першых дзён наступнага года.

**Сяргей КУРКАЧ.**

# БУЛЬБА ПА 4 ЕЎРА. НЕ Ў НАС

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

## ПАЗБЕГНУЦЬ ПЕРАПЛАТЫ І СЭКАНОМІЦЬ

Нават калі мяшкі з бульбай вязуць з рынку дадому ўжо не так ахвотна, кірмашовыя цэны застаюцца ніжэйшая за крамавыя, дапамагаючы людзям захаваць сямейны бюджэт і назапасіцца прадуктамі на зіму. Сезонныя сельскагаспадарчыя кірмашы даюць магчымасць купіць наўпрост у вытворцы, пазбегнуць пераплаты і сэканоміць. Параўнанне паказвае, што па большасці пазіцый кірмашовыя цэны сапраўды ніжэйшыя за крамавыя. Розніца з традыцыйным гандлем часам дасягае 40 %, а па некаторых пазіцыях нават больш. Асабліва на агародніну і садавіну, якія фермеры імкнуцца рэалізаваць як мага хутчэй.

Выключэнне складае толькі асобная садавіна, на якую крамы зніжаюць цану за кошт аптовых закупак. Калі ж параўноўваць з суседнімі краінамі, беларускія кірмашовыя цэны застаюцца самымі даступнымі. Пры параўнанні польскіх і літоўскіх рынкавых цэн можна заўважыць, што прадукты ў Беларусі таннейшыя практычна па ўсіх пазіцыях.

Польскія рынкі аказваюцца даражэйшымі на 30—80 %, а літоўскія — часам у два-тры разы. Выключэннем з'яўляюцца толькі яблыкі: Польшча застаецца найбуйнейшым вытворцам у Еўропе. Польскія кірмашы сёння арыентаваны не на эканомію: пакупнік там шукае не самую нізкую цану, а прадукцыю ад канкрэтнага фермера — часта з маркіроўкай «eco» або «bio».

Літоўскія кірмашы, наадварот, шмат у чым страцілі ролю пасрэднікаў паміж полем і горадам: большасць пакупнікоў аддае перавагу сеткавым супермаркетам, дзе кошт і асартымент больш стабільны, а кірмаш выконвае хутчэй нішавую функцыю.



## ПАЧЫМ БУЛЬБА?

Памідоры, агуркі, перцы, баклажаны, шынкі, яблыкі, слівы — чаго толькі не купляюць на восеньскіх кірмашах! І, вядома ж, бульбу, без якой, як кажуць, сапраўдны беларус і сыты не будзе. Па даных Нацыянальнага статыстычнага камітэта, за 2024 год кожны жыхар Беларусі з'еў 56 кілаграмаў бульбы. Не так ужо і шмат, калі зірнуць на «статыстыку» ў інтэрнэце — там нам прыпісваюць 160—180 кілаграмаў у год.

Але бульбу беларусы сапраўды любяць і купляюць незалежна ад сезона. Многія робяць гэта менавіта ўвосень, на кірмашах, калі цана самая нізкая. Сёння яна вагаецца ад 50 капеек да 1,2 рубля (0,13—0,3 еўра). У беларускіх крамах можна купіць вельмі прыгожую буйную бульбу па цане 69—75 капеек (0,17—0,19 еўра) — бяры колькі хочаш.

А якая цана на бульбу ў іншых краінах? Кошты ў некаторых моцна здзівяць: калі бульба ў іх столькі каштуе восенню, колькі ж яна будзе каштаваць вясной? **У Польшчы**, дзе таксама любяць і вырошчваюць бульбу, выяўляем мясцовую культуру на скідцы па цане 2,33 злотага (0,55 еўра). Кошт без скідкі — 4,66 (1,09 еўра). Памер у прапанаванай бульбы сярэдні. А ўсяго тыдзень таму небуйная бульба тут каштавала на скідцы ўсяго 1,25 злотага (0,29 еўра), без яе — 2,99 (0,7 еўра). У нас на кірмашах па 50 капеек за кілаграм прадаецца буйнейшая.

Здзівіў і паказаны на цэнніках кошт за 100 грам тавару — гэта ж не цукеркі і не мяса... Але, мабыць, палякам актуальна ведаць, колькі каштуе 100 грам бульбы, калі такая інфармацыя на цэнніках прапісана. У іншых польскіх крамах бульба каштуе ад 0,75 да 1,98 еўра. І гэтыя кошты зусім неадэкватныя як для восені, так і для аграрнай краіны, якая сама вырошчвае бульбу.



**У Літве** бульба на скідцы, але толькі мытая і па 0,69 еўра за кілаграм. Цана без скідкі — 0,99 еўра. Лагічна выказаць здагадку, што нямыты караняплод павінен каштаваць танней, таму шукаем далей і знаходзім прапанову за 0,85 еўра за кілаграм нямытай і не самай буйной бульбы.

**У Латвіі** знаходзім бульбу без скідкі і коштам 0,95 еўра. У іншых крамах дыяпазон цэн ад 0,43 еўра на скідке да 1,99 еўра за кілаграм. Удалося зазірнуць і на кірмаш, дзе мясцовыя аграрыі гандлююць ураджаем, вырашчаным уласнымі рукамі, па кошце ад 0,80 да 1,5 еўра ў залежнасці ад сорту і памераў караняплодаў. А профільнае міністэрства Латвіі ўпэўнена прагназуе далейшы рост цэн на бульбу, бо ўраджай у гэтым сезоне быў праблемным: вясной пасевы не апрацавалі як трэба, таму захоўвацца мясцовая бульба доўга не зможа, ды і вырасла яе нашмат менш, чым планавалі... Але, супакойваюць насельніцтва чыноўнікі, без бульбы краіна дакладна не застанецца — Еўрасаюз дапаможа. Дапамагчы яны, вядома, дапамогуць, але вось у колькі латышам абыйдзецца вясной гэта еўрапейская бульба, калі ўжо сёння цана вагаецца вакол 1 еўра за кілаграм?

## УСЁ ВЫШЭЙ І ВЫШЭЙ...

На сайты французскіх супермаркетаў доступ наведвальнікаў з Беларусі заблакіраваны. Чаго баяцца — незразумела. Але, нягледзячы на ўсе засцярогі, цану на патрэбны тавар **у Францыі** даведацца ўдалося: бульба на гэтым тыдні прадаецца ад 0,68 да 3,2 еўра за кілаграм, і выбар, трэба сказаць, бедненькі. Лічыцца, што ў 2025 годзе французскія аграрыі вырасцілі рэкордны за апошнія 10 гадоў ураджай бульбы, і гэта спрыяе зніжэнню цэн на яго. Але калі такія цэны — гэта зніжэнне, то колькі ж каштуе бульба ў краіне, калі ў іх неўраджай?

**У Германіі**, дзе сёлета гэтак жа, як і ў Францыі, сабралі добры ўраджай, цэны вагаюцца ад 1 да 3 еўра. **У Іспаніі** — 0,9 — 2,5 еўра. **У Бельгіі** (таксама, кажуць, гэтай восенню бульбы ў лішку) — ад 1,5 да 4 еўра. І завяршаем наш Еўрапейскі тур **у Вялікабрытаніі**. Тут кілаграм любімага беларусамі караняплода каштуе ад 1,6 да 4,4 еўра.

Як бачым, цэны на бульбу і «баршчовы набор» у Еўропе вельмі розныя. Адзінае, што іх аб'ядноўвае, — яны ўсюды значна вышэйшыя, чым у нашай краіне.

**Данііл ХМЯЛЬНІЦКІ.**
**Фота з адкрытых крыніц.**


## Извещение о проведении **27 ноября 2025 года** повторных торгов с условиями по продаже имущества, принадлежащего ОАО «ДСТ № 5»

| Предмет торгов |
| --- |
| капитальное строение с инв. номером 630/С-47149 общей площадью 647,0 кв. м (наименование – Административное здание; назначение – здание административно-хозяйственное; составные части и принадлежности: бетонный подвал); капитальное строение с инв. номером 630/С-47154 общей площадью 397,2 кв. м (наименование – Склад материальный; назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ); капитальное строение с инв. номером 630/С-47152 общей площадью 222,7 кв. м (наименование – Склад для горюче-смазочных материалов; назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ); капитальное строение с инв. номером 630/С-47155 общей площадью 743,1 кв. м (наименование – Боксы для автомашин с пристройкой подсобных помещений; назначение – здание специализированное иного назначения); капитальное строение с инв. номером 630/С-47160 общей площадью 1960,9 кв. м (наименование – Ремонтные мастерские; назначение – здание специализированное иного назначения); капитальное строение с инв. номером 630/С-47158 общей площадью 1360,7 кв. м (наименование – Пристройка к реммастерским; назначение – здание специализированное иного назначения); капитальное строение с инв. номером 630/С-47156 общей площадью 1123,1 кв. м (наименование – Боксы для автомашин; назначение – здание специализированное иного назначения); капитальное строение с инв. номером 630/С-55558 общей площадью 35,0 кв. м (наименование – Навес под баллоны; назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ); капитальное строение с инв. номером 630/С-55622 (наименование – Ограждение; назначение – сооружение специализированное складов, хранилищ; составные части и принадлежности: а1 – ограждение из силикатного кирпича (1,95 м х 2,34 м х 0,25 м), площадью 4,6 кв. м); капитальное строение с инв. номером 630/С-55620 (наименование – Ограждение; назначение – сооружение специализированное складов, хранилищ; составные части и принадлежности: а1 – ограждение из металлической арматуры (21,0 м х 2,69 м), площадью 56,5 кв. м, на металлических столбах (0,1 м х 2,60 м)); капитальное строение с инв. номером 630/С-55611 (наименование – Ограждение; назначение – сооружение специализированное складов, хранилищ; составные части и принадлежности: а1.1. – ограждение из силикатного кирпича (13,94 м х 2,85 м х 0,25 м), 39,7 кв. м, а1.2. – ворота металлические (4,07 м х 2,85 м)); капитальное строение с инв. номером 630/С-55610 (наименование – Ограждение; назначение – сооружение специализированное складов, хранилищ; составные части и принадлежности: а1 – ограждение бетонное (97,5 м х 1,71 м), 166,7 кв. м с 31 кирпичными столбиками с бетонными оголовками; а.1.1. – металлическая решетка (1,50 м х 1,97 м), 41,37 кв. м; а2 – ворота металлические (5,96 м х 3,70 м), 22,1 кв. м; а2.1. – калитка металлическая (1,62 м х 2,30 м), 3,73 кв. м); капитальное строение с инв. номером 630/С-55608 общей площадью 7260,0 кв. м (наименование – Площадка; назначение – сооружение неустановленного назначения; составные части и принадлежности: а1 – площадка из асфальтобетона); капитальное строение с инв. номером 630/С-55607 общей площадью 465,0 кв. м (наименование – Площадка; назначение – сооружение неустановленного назначения; составные части и принадлежности: а1 – площадка из бетонной плитки); оборудование котельной с инв. номером 146 (котел КВЖ-02, 2 шт.; циркуляционный насос, 4 шт.; бойлер 10 м куб. 1 шт.; топливопровод 20 м; щит управления). |

| |
| --- |
| Сведения о земельном участке: площадь – 1,331 га, кадастровый номер – 642000000002000230 |
| Местонахождение: Минская область, Молодечненский район, г. Молодечно, ул. Замковая, 33 |
| Начальная цена: 1 363 662,00 бел. руб. без учета НДС |
| Сумма задатка: 136 000,00 бел. руб. |
| Обременение: аренда |

**Продавец имущества:** ОАО «ДСТ № 5», г. Минск, ул. Лукьяновича, 4-253.

**Организатор торгов:** государственное предприятие «МГЦН», г. Минск, ул. К. Маркса, 39, к. 10.

**Условие торгов:** Победитель торгов (покупатель) оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение результативного аукциона, в размере 1 процента от цены продажи предмета торгов, указанной в протоколе о результатах торгов, в течение 3 рабочих дней со дня проведения торгов.

Торги проводятся в соответствии со ст. ст. 417, 418 Гражданского кодекса Республики Беларусь и порядком проведения аукциона по продаже имущества, принадлежащего ОАО «ДСТ № 5», утвержденным организатором торгов.

К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, заключившие соглашение с организатором торгов о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона, внесшие задаток, а также представившие организатору торгов следующие документы:

заявление на участие в аукционе (по форме, установленной организатором торгов); заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона (по форме, установленной организатором торгов); копию свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); копию устава (для юридических лиц); копию платежного документа о внесении задатка; документы, подтверждающие полномочия представителя юридического (физического) лица; а также, при необходимости, иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

Задаток перечисляется в срок, установленный для приема документов на участие в аукционе, на расчетный счет № BY15 BLBB 3012 0190 3985 8300 1001 в ЦБУ № 527 ОАО «Белинвестбанк», г. Минск, БИК BLBBBY2X, кодификатор назначения платежа – 40901, получатель – государственное предприятие «МГЦН», УНП 190398583.

Торги проходят в форме открытого аукциона с условиями на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором торгов. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник не согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов, а наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах торгов и не включает НДС. В ходе торгов участники могут предлагать свою цену за продаваемое имущество в соответствии с порядком проведения аукциона.

В случае если торги признаны несостоявшимися в силу того, что заявление на участие в них подано только одним участником или для участия в них явился только один участник, предмет торгов продается этому участнику (покупателю) при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов.

Договор купли-продажи между продавцом и победителем торгов (покупателем) заключается после предъявления копии платежных документов о перечислении суммы вознаграждения за организацию и проведение торгов и подписывается в течение 10 рабочих дней со дня проведения аукциона.

Оплата стоимости приобретенного имущества с учетом НДС осуществляется победителем торгов (покупателем) в порядке, предусмотренном в договоре купли-продажи. По согласованию с продавцом возможна рассрочка платежа.

Торги проводятся **27 ноября 2025 года в 11.00** по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов. Прием документов, а также консультации по вопросам участия в торгах осуществляются с **14.11.2025 по 26.11.2025** включительно в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.00) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6.

По вопросу осмотра продаваемого имущества следует обращаться по телефонам: (017) 388-43-21; (029) 179-23-02 (ОАО «ДСТ № 5»).

Телефоны для справок:
(017) 365-48-36 (государственное предприятие «МГЦН»);
(017) 388-43-21; (029) 179-23-02 (ОАО «ДСТ № 5»)



## ИЗВЕЩЕНИЕ о проведении повторного аукциона

Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» *(Организатор аукциона)*, по поручению **ОАО «РСУ «Мясомолоко» г. Слуцк»** *(Продавец)*, проводит открытый аукцион по продаже **бытовой пристройки**

**центрального-теплового пункта с инв. № 640/С-93945 общ. пл. 162,5 кв. м, расположенной на земельном участке с кадастровым номером 624650100001007092 пл. 0,0377 га по адресу: Минская обл., Слуцкий р-н, г. Слуцк, ул. Молодежная, 8А.**

Начальная цена с НДС (20 %) – **25 002,94** бел. руб. (задаток 10 % от начальной цены **2 500,00** бел. руб.). **Стоимость снижена на 40 %.**

**Задатки перечисляются на р/с № BY55BPSB30121082600169330000 в ОАО «Сбер Банк», г. Минск, ул. Чкалова, 18/1, БИК BPSBBY2X, УНП 690324015, ОКПО 29250255, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации», код платежа – 40901, код категории платежа OTHR.** Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата объекта производится в течение 30 (тридцати) банковских дней после заключения договора купли-продажи, если иное не предусмотрено договором купли-продажи. Победитель аукциона (единственный участник аукциона) оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов в размере 5 (пяти) процентов от окончательной цены продажи предмета аукциона. Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.rlt.by. Предыдущие извещения были опубликованы в газете «Звязда» от 17.07.2024, 25.10.2024, 06.02.2025, 26.06.2025, 23.10.2025.

Аукцион состоится **25.11.2025** в **12.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **21.11.2025** до **16.00** по указанному адресу. **Тел.: (8017) 516-80-65, (8029) 102-21-17, 516-80-64. Тел. для осмотра (8044) 555-58-50.**

УНП 600154328

**Вниманию предприятий, организаций и индивидуальных предпринимателей!**

Комитетом государственного имущества Гродненского областного исполнительного комитета проводятся аукционы по продаже неиспользуемого имущества, находящегося в собственности Волковысского района

К ПРОДАЖЕ ПРЕДЛАГАЕТСЯ:

**1) Здание учебного центра с составными частями и принадлежностями, гараж по ул. Красноармейской, 39, 39/1, г. п. Россь/ Росский с/с, Волковысский район.**
Начальная цена предмета аукциона – 2 базовые величины.
Размер задатка – 1 базовая величина.
**2) Здание кухни-столовой с подвалом и террасой, инженерные сети, объекты благоустройства, по ул. Красноармейской, 48, г. п. Россь, Росский с/с, Волковысский район.**
Начальная цена предмета аукциона – 5 базовых величин.
Размер задатка – 1 базовая величина.
Аукцион состоится – 25.11.2025 в 11.30.
Заявки на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. 17 Сентября, 39.
Последний день подачи заявлений на участие в аукционе – 19.11.2025 до 16.00.

**1) Комплекс объектов бывшего в/г (штаб, инженерные сети, объекты благоустройства) по ул. Красноармейской, 43, в г. п. Россь. Росский с/с, Волковысского района.**
Начальная цена предмета аукциона – 5 базовых величин.
Размер задатка – 1 базовая величина.
**2) Здание нежилое, инженерные сети, объекты благоустройства, по ул. Матросова, 3, в г. п. Россь, Волковысский район.**
Начальная цена предмета аукциона – 4 базовые величины.
Размер задатка – 1 базовая величина.
**3) Здание казармы под склад с террасой, инженерные сети, объекты благоустройства, по ул. Красноармейской, 47, в г. п. Россь, Росский с/с, Волковысский район.**
Начальная цена предмета аукциона – 4 базовые величины.
Размер задатка – 1 базовая величина.
Аукцион состоится – 05.12.2025 в 11.30.
Заявки на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. 17 Сентября, 39.
Последний день подачи заявлений на участие в аукционе – 01.12.2025 до 16.00.

1) Объекты бывшего в/г комплекс № 4: бытовой домик АЭР, склад НЗ с подвалом и боксом на 1 м/м, мощение, гараж техники с котельной, площадкой; контрольно-технический пункт парка АЭР, водопроводная сеть, около г. п. Россь, Росского с/с, 39, 39/1-39/3, Волковысского района.
Начальная цена лота – 5 базовых величин.
Размер задатка – 1 базовая величина.
**2) Объекты бывшего в/г комплекс № 11: медпункт, два здания штаба с пристройкой, объекты благоустройства, по ул. Красноармейской, 51, 51/1, 51/2 в г. п. Россь, Росского с/с, Волковысского района.**
Начальная цена лота – 7 базовых величин.
Размер задатка – 1 базовая величина.
Аукцион состоится – 09.12.2025 в 11.30.
Заявки на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. 17 Сентября, 39.
Последний день подачи заявлений на участие в аукционе – 03.12.2025 до 16.00.

**1) Объекты бывшего в/г: мастерская, наружная водопроводная сеть, тепловая сеть, объекты благоустройства (дорожка, проезд) по ул. Красноармейской, 52, в г. п. Россь, Росского с/с, Волковысского района.**
Начальная цена предмета аукциона – 4 базовые величины.
Задаток – 1 базовая величина.
**2) Объекты бывшего в/г, комплекс № 12: здание АЗС, пункт газификации кислорода № 74 с пристройкой, объекты благоустройства, инженерные сети, около г. п. Россь, Росского с/с, 34, 34/1 Волковысского района.**
Начальная цена предмета аукциона – 4 базовые величины.
Задаток – 1 базовая величина.
**3) Объекты бывшего военного городка комплекс № 14: здание СБВ лаборатория с беседкой, мощением, ограждением, калиткой, здание СБВ хранилища, около г. п. Россь, Росского с/с, 35, 35/1, Волковысского района.**
Начальная цена предмета аукциона – 2 базовые величины.
Задаток – 1 базовая величина.
Аукцион состоится – 10.12.2025 в 11.00.
Заявки на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. 17 Сентября, 39.
Последний день подачи заявлений на участие в аукционе – 04.12.2025 до 16.00.

Подробная информация по телефонам:
в городе Волковыске 8 (01512) 5 13 44, 2 06 03.
в городе Гродно 8 (0152) 62 39 24, 62 39 31, 62 39 23.
Дополнительная информация размещена на сайте: https://au.nca.by
УНП 500042135

**РУП «Институт недвижимости и оценки»** (Организатор аукциона) извещает о проведении повторного открытого аукциона по продаже имущества **ОАО «МТЗ»** (Продавец).
Аукцион состоится **10.12.2025 в 11.00** по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, 3 этаж, каб. 4

**Лот № 1** в составе:
1. Здание карантинника на 300 голов, 407,5 кв. м: № по ЕГРНИ 600/С-149390, инв. № 100403.
2. Механизированное зернохранилище емкостью 1000 т, 714,9 кв. м: № по ЕГРНИ 600/С-149386, инв. № 100365.
3. Убойный пункт свинотоварной фермы на 1000 голов, 143,3 кв. м: № по ЕГРНИ 600/С-149316, инв. № 100341.
4. Дэзбарьер, площадь застройки 77,0 кв. м: № по ЕГРНИ 600/С-149320, инв. № 104596.
5. Канализация бытовая, 285,0 м: № по ЕГРНИ 600/С-149330, инв. № 104590; инв. № 104589.
6. Здание свинарника-откормочника на 1000 голов, 1604,9 кв. м: № по ЕГРНИ 600/С-149327, инв. № 100404.
7. Весовая, 87,0 кв.м: № по ЕГРНИ 600/С-149391, инв. № 100342.
8. Хранилище для картофеля, овощей и фруктов, 663,8 кв. м: № по ЕГРНИ 600/С-149387, инв. № 100364; инв. № 100561; инв. № 104594.
9. Водопровод пожарно-питьевой, 1573,8 м: № по ЕГРНИ 600/С-149389, инв. № 104591.
10. Здание свинарника для откорма на 1000 голов, 2591,1 кв. м: № по ЕГРНИ 600/С-149331, инв. № 100339; инв. № 101594; инв. № 101743; инв. № 101740; инв. № 104593; инв. № 211241.
11. Трансформаторная подстанция свинотоварной фермы, 45,6 кв. м: № по ЕГРНИ 600/С-149338, инв. № 100340; инв. № 185127; инв. № 185021; инв. № 185022;
12. Сборно-разборное здание арочник, 972,3 кв. м: № по ЕГРНИ 600/С-149388, инв. № 100333.
13. Мастерская ремонтно-технической базы до 40 тракторов, 379,5 кв. м: № по ЕГРНИ 600/С-149326, инв. № 100363.
**14. Движимое имущество**:
- камера холодильная, инв. № 175345;
- резервуар Р-5066, инв. № 114096;
- резервуар Р-5066, инв. № 114097;
- трансформатор ТМ-250/10-83У1-10/0,4, инв. № 113324;
- трансформатор ТМ-2501-10-83У1-10/0,4, инв. № 113325;
- весы автомобильные 500-2РС-30Ц, инв. № 119734;
- шкаф управления ШАУ-АВ, инв. № 126556;
- шкаф управления ШАУ-АВ, инв. № 126557;
- шкаф управления ШАУ-АВ, инв. № 126558;
- шкаф управления ШАУ-АВ, инв. № 126559;
- шкаф управления ШАУ-АВ, инв. № 126560.

**Адрес Лота**: Республика Беларусь, Минская обл., Минский р-н, Луговослободской с/с, 15/17; 15/21; 15/24; 15/23; около д. Обчак; 15/18; 15/25; 15/20; около д. Обчак; 15/19; 15/26; 15/22; 15/27.
Земельный участок 623684100001000288, 7,3499 га.
Право постоянного пользования.
**Начальная цена** с НДС 20 % – 3 962 521,33 руб. **Задаток** – 500 000,00 руб. **Шаг аукциона** – 5 %.
Порядок оформления участия в аукционе, порядок его проведения, определения лица, выигравшего аукцион, а также условия аукциона содержатся в информации о проведении аукциона, опубликованной на электронной торговой площадке «GOSTORG» (gostorg.by). Задаток перечисляется на р/с BY85BAPB30127802900100000000 в ОАО «Белагропромбанк», BIC BAPBBY2X. Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182.
Окончание приема заявлений и задатка – 08.12.2025 в 11.00

**Организатор аукциона: 220030, г. Минск, ул. Комсомольская, 11, пом. 9, 8 (017) 324-70-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52 • gostorg.by • e-mail: torgi@ino.by**

# НЕ ТОЛЬКІ ТЭРАПІЯ СУПРАЦЬ ХВАРОБЫ

## Сучасныя тэхналогіі выкарыстоўваюцца ў медыцыне, у стварэнні ідэальнай вады і аптымальных кармоў

Навукоўцы Інстытута біяарганічнай хіміі сумесна з калегамі з Інстытута мікрабіялогіі распрацоўваюць новыя падыходы для сінтэзу проціпухлінных злучэнняў новага пакалення з дапамогай біятэхналогій. Аб гэтым паведаміў акадэмік-сакратар Аддзялення хіміі і навук аб Зямлі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі Аляксей ТРУХАНАЎ.

Спецыяліст сцвярджае, што менавіта з дапамогай біятэхналогій атрымліваюцца пэўнага роду мікраарганізмы, потым напрацоўваюцца камерцыйна даступныя прадукты, якія будуць асновай новых прэпаратаў. «На пярэднім краі і CAR-T — тэрапія для барацьбы з ракам. Гэта вельмі складаная па сваёй сутнасці тэхналогія, якая была паспяхова развіта ў нашай краіне і ўжо ўкаранёна ў практыку», — адзначыў Аляксей Труханаў.

«ХімФармСінтэз» — структурнае падраздзяленне Інстытута біяарганічнай хіміі, якое ажыццяўляе выпуск больш за 15 прэпаратаў і субстанцый. «Тонкі арганічны сінтэз дазваляе змагацца з цяжкімі хваробамі пухліннай прыроды. І гэтыя прэпараты пастаўляюцца не толькі ў цэнтры нашай краіны, але і за мяжу», — адзначыў навуковец.

У цэлым кіраўніцтвам краіны высока ацэненая работа фармакалагічнага кластара НАН. «Прадпрыемства «Акадэмфарм» выпускае больш за 40 найменняў прэпаратаў і біялагічна актыўных рэчываў. Калі здарыўся кавід і прэпарат для разрэджвання крыві быў у дэфіцыце ва ўсім свеце, менавіта «Акадэмфарм» распрацаваў і эфектыўна ўкараніў тэхналогію па выпуску аналага, а таксама лекі, пра якія мы ўспамінаем, калі пачынаецца сезон розных эпідэмій», — падкрэсліў акадэмік-сакратар.

Аддзяленне хіміі і навук аб Зямлі займаецца не толькі медыцынай. «Нядаўна мы праводзілі 18-ю Беларускую антарктычную экспедыцыю. У яе складзе эксперты, якія праводзяць навуковыя даследаванні па шырокім спектры кірункаў. Тут вывучаецца фізіка атмасферных працэсаў, кантроль азонасферы, кліматалогія, метэаралогія, біялогія і геалогія. У Беларусі ёсць уласная антарктычная станцыя. Гэта не проста шэраг будынкаў, якія забяспечваюць пражыванне спецыялістаў, гэта навуковая інфраструктура. Не кожная краіна, нават высокатэхналагічна развітая, можа пахваліцца наяўнасцю ўласнай навуковай інфраструктуры ў Антарктыдзе», — падкрэсліў Аляксей Труханаў.

Шэраг арганізацый НАН працуе ў галіне хімічных навук. Яны распрацоўваюць тэхналогіі па перапрацоўцы мінеральнай сыравіны, вядуць работы ў галіне сістэм водаачысткі і водападрыхтоўкі. «Гэта не толькі пытанні фільтрацыі, але і фарміравання іёнаабменных матэрыялаў, якія могуць селектыўна экстрагаваць з водных сістэм пэўныя іёны, напрыклад, здабываць іёны медзі і свінцу, насычаючы яе менш шкоднымі кампанентамі. Гэта дазваляе падрыхтоўваць ваду па самых высокіх стандартах якасці», — растлумачыў навуковец.

Інстытут прыродакарыстання вядзе сур'ёзныя распрацоўкі ў галіне торфу. З яго вырабляецца шэраг іншых карысных прадуктаў з высокім дабаўленым коштам. У тым ліку падсцілачныя матэрыялы для прымянення ў птушніках, рознага роду сарбенты на аснове торфу, а таксама шэраг тэхналогій па атрыманні актываваных вуглёў. З торфу вырабляюць покрыўныя матэрыялы для вырошчвання грыбоў, што дазволіла пазбавіцца ад імпарту на суму каля 2 мільёнаў долараў.

«У Палескім аграрна-экалагічным інстытуце ёсць галіновая лабараторыя, якая працуе ў інтарэсах Міністэрства сельскай гаспадаркі і харчавання па распрацоўцы аптымальных рацыёнаў кармоў. Гэта аналіз кармавой базы, метадычныя рэкамендацыі для таго, каб наша жывёлагадоўля атрымлівала ўзважаныя збалансаваныя кармы», — дадаў Аляксей Труханаў.

**Сяргей КУРКАЧ.**



# КАЛІ ЗУСІМ НЕСАЛОДКА

## ТРЫМАЦЬ ПАД КАНТРОЛЕМ

У цэнтры працуе некалькі эндакрыналагічных аддзяленняў, а таксама аддзяленні афтальмалогіі, гінекалогіі, лабараторнай, ультрагукавой, функцыянальнай дыягностыкі. Як адзначае **галоўны ўрач Рэспубліканскага цэнтра медыцынскай рэабілітацыі і бальнеалячэння Аляксандр ПАЦЕЕЎ,** маецца ўсё неабходнае для аказання дапамогі пацыентам з эндакрыннай паталогіяй, у тым ліку самай распаўсюджанай — цукровым дыябетам.





На яго ў Беларусі пакутуе 5,5 % дарослага насельніцтва. Яшчэ 20 гадоў гэта лічба была амаль у тры разы меншай. Аднак казаць, што захваральнасць імкліва расце, не зусім правільна. Трэба ўлічваць той факт, што за апошнія гады істотна палепшылася дыягностыка гэтага захворвання: пацыенты часцей абследуюцца, яно хутчэй выяўляецца, а значыць больш людзей маюць магчымасць трымаць яго пад кантролем. Як тлумачыць **намеснік галоўнага ўрача па арганізацыйна-метадычнай рабоце Рэспубліканскага цэнтра медыцынскай рэабілітацыі і бальнеалячэння Вольга САЛКО,** у свеце кожны другі чалавек, які мае цукровы дыябет, не ведае пра яго. І гэта асноўная праблема названай хваробы.

— Калі чалавек не ведае, што ў яго маецца захворванне, нават пры не надта высокім узроўні цукру ў крыві — 6,5-6,8 ммоль/л — развіваюцца ўскладненні цукровага дыябету. І захворванне небяспечнае менавіта імі, бо павышаны ўзровень цукру не непакоіць пацыента сам па сабе. Часта, калі мы выстаўляем дыягназ цукровы дыябет 2 тыпу, амаль ва ўсіх пацыентаў ужо ёсць усе пачатковыя стадыі ўскладненняў дыябету. Таму самая галоўная задача — ранняе выяўленне, — звяртае ўвагу Вольга Салко.

Самыя распаўсюджаныя ўскладненні дыябету — дыябетычная рэцінапатыя (пашкоджанні вачэй) і дыябетычная нефрапатыя (пашкоджанні нырак), а таксама пашкоджанні мікрасасудаў ног, што можа прывесці да гангрэн, ампутацый і інш.

На ранняе выяўленне дыябету 2 тыпу накіравана шмат мерапрыемстваў, у тым ліку і сістэма дыспансерызацыі, а таксама інфармацыйныя акцыі, якія нацэлены ў першую чаргу на павышэнне інфармаванасці пацыентаў пра праблему дыябету. А своечасовы дыягназ пры карэкцыі ладу жыцця нярэдка дазваляе абысціся без таблетак ці трымаць хваробу пад кантролем з дапамогай простага медыкаментознага лячэння, якое лёгка пераносіцца.

## КІРАВАЦЬ ХВАРОБАЙ З ДАПАМОГАЙ СМАРТФОНА

Пацыенты, якія пакутуюць на цукровы дыябет, у тым ліку маюць патрэбу ў назіранні ўрачом-афтальмолагам. Афтальмалагічнае аддзяленне цэнтра аснашчана сучасным абсталяваннем па дыягностыцы, маецца і лячэбнае абсталяванне.

— Раз у год, а пры неабходнасці і часцей, пацыенты з цукровым дыябетам павінны прыходзіць на агляд вочнага дна для выяўлення ранніх праяўленняў захворвання на сятчатцы. Тыя, хто ўжо мае такія праявы — для вызначэння неабходнасці лазернай каагуляцыі сятчаткі. У нас працуе лазерны кабінет, дзе мы выконваем такую працэдуру — расказвае **ўрач-афтальмолаг Алена ВАСІЛЕВІЧ.**

Лабараторыя цэнтра робіць каля 400 тысяч даследаванняў у год, з іх 93—94 % — у дзень звароту. Жыхарам рэгіёнаў сапраўды зручна адразу здаць аналізы, атрымаць кансультацыю і прызначэнні доктара, каб не прыязджаць паўторна. Тут праводзяцца і гарманальныя, і эндакрыналагічныя, і нават алергалагічныя даследаванні.

У эндакрыналагічнае аддзяленне накіроўваюцца пацыенты з самай цяжкай паталогіяй з усёй краіны. Тут жа праводзіцца рэспубліканскі кансіліум па прызначэнні аналагаў інсуліну, а таксама працуе кабінет помпавай тэрапіі, дзе сканцэнтраваны ўсе сучасныя метады дыягностыкі і лячэння цукровага дыябету. Адзін з іх — неперарыўнае манітарыраванне глікеміі. Яно адбываецца з дапамогай адмысловага прыстасавання, якое дазваляе цягам пэўнага перыяду, на сёння гэта 14 дзён, кантраляваць узровень цукру з перыядычнасцю 2-5 хвілін. Пацыент у рэжыме рэальнага часу бачыць свой узровень цукру — даныя перадаюцца на смартфон, а урачу гэта дапамагае прааналізаваць узровень глікеміі і падабраць правільнае лячэнне. Асабліва гэта важна ў пацыентаў, якія выкарыстоўваюць інсулінатэрапію, калі трэба карэктна падабраць дозы.

— Сістэмы неперарыўнага манітарыравання глюкозы актыўна развіваюцца ва ўсім свеце, і наша краіна — не выключэнне, — адзначае Аляксандр Пацееў. — Супрацоўнікі цэнтра сумесна з БДУІР распрацоўваюць айчынную сістэму, якая будзе разлічана не менш чым на 90 дзён работы. Датчык будзе імплантавацца падскурна і перадаваць вынікі аналізаў на смартфон пацыента.

Выкарыстанне сістэмы — вялікі крок наперад у кіраванні цукровым дыябетам.

— Гэта дазваляе дыягнаставаць схаваныя гіпаглікеміі, якія пацыент не адчувае, постпрандыяльныя (пасля прыёму ежы) пікі павышэння глюкозы, пра якія пацыент можа не ведаць пры кропкавым вызначэнні глюкометра. Гэта зручна для бацькоў дзетак з цукровым дыябетам першага тыпу, бо маецца аддалены доступ да даных дзіцяці, — расказвае **ўрач-эндакрынолаг Алена ЦІХАНОВІЧ.**

А вось самы сучасны на сёння спосаб дастаўкі інсуліну ў арганізм пацыента — помпавая інсулінатэрапія. Інсулінавая помпа — гэта апарат, у які запраўлены інсулін. Ён мацуецца да цела пацыента і ажыццяўляе неперарыўную ін'екцыю. Па сутнасці прыбор з'яўляецца прасунутай смарт-ручкай.

— Яе перавагі ў тым, што падачу інсуліну можна запраграмаваць літаральна па хвілінах, чым забяспечыць персаніфікаваны падыход да кожнага пацыента, — расказвае **дзіцячы ўрач-эндакрынолаг Кацярына БЯЛЯЕВА**. — Запыт на такі метад у пацыентаў вялікі, асабліва з боку дзяцей і іх бацькоў. Яны ў нас галоўныя карыстальнікі такіх сучасных сістэм.

**Алена КРАВЕЦ.**
**Фота Лізаветы ГОЛАД.**

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

ЭКАЛОГІЯ

# УПАКОЎКА — БІЧ НАШАГА ЧАСУ

## Узровень перапрацоўкі адходаў будзе павышацца

Амаль палова адходаў у нашых сметніцах — былая ва ўжыванні ўпакоўка. Прыгожыя скрынкі, якія цешаць нас літаральна некалькі хвілін, з жахлівай хуткасцю запаўняюць смеццевыя кантэйнеры.

Як расказала **галоўны спецыяліст па інфармацыйнай рабоце, каардынатар рэспубліканскай інфармацыйнай кампаніі «Мэта 99» дзяржаўнай установы «Аператар другасных матэрыяльных рэсурсаў» Святлана МАЦКЕВІЧ,** доля ўпаковачных матэрыялаў у бытавых адходах складае 30—50 %. Выкарыстанне іх для захавання, транспарціроўкі пэўных тавараў сапраўды неабходна, аднак калі яны служаць толькі маркетынгавым мэтам, як, напрыклад, неапраўдана вялікая скрынка для 10—12 цукерак, варта задумацца аб мэтазгоднасці.



Самая вялікая бяда пластмасы — час яе раскладання вылічаецца стагоддзямі. Фактычна ўвесь выраблены сёння пластык нікуды не падзеўся, а яго дробныя часціцы (мікрапластык) пранікаюць у ваду, ежу, паветра і нават наш арганізм. Пры гэтым перапрацаваць і зноў выкарыстоўваць у вытворчасці, паводле сусветнай статыстыкі, атрымліваецца пакуль усяго 10—20 % пластыкавых адходаў. Астатняе альбо захоўваецца, альбо спальваецца ці проста выкідваецца, а значыць — засмечвае навакольнае асяроддзе.

> Штогод чалавецтва вырабляе больш за 460 млн тон пластыка. Гэта каля 56 кг на кожнага жыхара планеты. Палова з гэтага аб'ёму прызначана для аднаразовага выкарыстання. Да 2050 года, па меркаванні некаторых навукоўцаў, у акіяне можа выявіцца больш пластыка, чым рыбы. Паводле экспертных ацэнак ужо сёння на Зямлі агульная вага наяўнага пластыка складае 8 гігатон, а біямаса ўсіх жывёл — усяго 4 гігатоны.

Сучасныя тэмпы «вытворчасці» смецця сур'ёзна апярэджваюць магчымасці яго перапрацоўкі. Па статыстыцы яшчэ 30 гадоў таму на кожнага беларуса прыпадала па 177 кг смецця за год. Сёння, паводле слоў **начальніка ўпраўлення камунальнай гаспадаркі і энергетыкі Міністэрства жыллёва-камунальнай гаспадаркі Аляксея ФІЛАНОВІЧА,** гэтая лічба вырасла да 433 кг. У цэлым у рэспубліцы штогод утвараецца звыш 4 млн тон ЦКА. У 2024 годзе — 4,3 млн тон, з якіх вывезена і прынята ад насельніцтва і арганізацый 3,5 млн тон. Нарыхтавана асобна сабраных другасных матэрыяльных рэсурсаў, якія не патрабуюць сартавання, каля 800 тыс. тон.

Паслугай вывазу смецця ахоплена 100 % насельніцтва краіны. Аднак сёння ўжо стаіць мэта не проста вывезці смецце, а максімальна яго перапрацаваць і ўцягнуць у другасны абарот. Для гэтага развіваецца сістэма раздзельнага збору адходаў. Калі ў 2012 годзе перапрацоўвалі ўсяго каля 20 % камунальных адходаў, то летась гэты паказчык вырас да 39,6 %. На перапрацоўку адправілася 840 тыс. тон ДМР: макулатура, шкло, пластык, шыны, нерабочая бытавая тэхніка і электроніка, батарэйкі і іншае.

Для перапрацоўкі ДМР у краіне створана інфраструктура, якая ўключае 10 смеццесарціровачных заводаў і 81 лінію сартавання.

Да 2040 года, як адзначыла **начальнік упраўлення рэгулявання абыходжання з адходамі Мінпрыроды Вольга САЗОНАВА,** узровень перапрацоўкі адходаў у Беларусі плануюць давесці да 90 %. Згодна з зацверджанай Стратэгіяй па абыходжанні з адходамі вытворчасці і спажывання, дасягненне мэты будзе ажыццяўляцца ў тры этапы — пяцігодкамі. Так да 2030-га ўстаноўлены паказчык у 70 % для выкарыстання ЦКА і 60 % — па ападках ачышчальных сцёкавых вод, у тым ліку з атрыманнем канчатковага прадукту — угнаення для сельскагаспадарчых патрэб і паліва. Прыярытэтам цыркулярнай эканомікі застанецца максімальнае выкарыстанне адходаў у якасці ДМР.

**Андрэй АКІМАЎ.**



# ЗЯМЛІ НАДЗЕЙНАЯ АПОРА

**Спецвыпуск да Дня работнікаў сельскай гаспадаркі і перапрацоўчай прамысловасці**

КАМПЕТЭНТНА

## «ВЫСОКАЯ ЯКАСЦЬ БЕЛАРУСКАЙ ПРАДУКЦЫІ АЦЭНЕНА СПАЖЫЎЦАМІ 113 КРАІН»



У нядзелю беларускія аграрыі адзначаць сваё прафесійнае свята. Дзень работнікаў сельскай гаспадаркі і перапрацоўчай прамысловасці аграпрамысловага комплексу — адна з дат, якую адзначаюць на дзяржаўным узроўні. І нездарма, бо ўнёсак гэтай галіны ў экспарт краіны перасягнуў 25 %. А разнастайнасці харчовай прадукцыі на паліцах нашых магазінаў могуць пазайздросціць у любой іншай краіне. За кошт чаго Беларусь утрымлівае статус вядучага сусветнага вытворцы харчовай прадукцыі і ці хапае яе самім беларусам, расказала намеснік начальніка галоўнага ўпраўлення перапрацоўчай прамысловасці Міністэрства сельскай гаспадаркі і харчавання Марыя КЛІМАВА.

***— Як сёлета спрацаваў аграпрамысловы сектар?***

— У нашай краіне забеспячэнне насельніцтва харчаваннем высокай якасці ў неабходнай колькасці ўзведзена ў ранг забеспячэння харчовай бяспекі. І гэта задача паспяхова выконваецца. Аграпрамысловы комплекс сёлета дэманструе паступовае развіццё, тэмпы росту станоўчыя. Мы не толькі забяспечваем унутраны рынак, але і пастаўляем сваю прадукцыю на экспарт. Узровень самазабеспячэння ўласным харчаваннем складае 96 %.

Па асноўных сацыяльна важных харчовых таварах спажывецкага кошыка наша харчовая бяспека забяспечваецца звыш норм і той колькасці, што мы ўжываем. Напрыклад, узровень забеспячэння малаком і малочнай прадукцыяй дасягае 292 %. У краінах Еўрасаюза гэты паказчык складае 117 %, а ў такіх краінах, як Венгрыя, Румынія, Славакія, Балгарыя ўвогуле 60—70 %, краіна Паўднёвай Еўропы, напрыклад, Грэцыя, забяспечвае сябе ўсяго на 52 %.

Мы вырабляем 958 кг малака і малочнай прадукцыі на душу насельніцтва ў год пры ўжыванні 247 кг — амаль у 4 разы больш, чым ужываем. Кожны чацвёрты кілаграм малака ў выглядзе малочных прадуктаў рэалізуецца на экспарт. Дасягнуты высокі паказчык не толькі па вытворчасці малака, але і па вытворчасці ўсёй наменклатуры малочнай прадукцыі. Напрыклад, Беларусь па ўжыванні натуральнамалочнай прадукцыі — малака, ёгурта, ражанкі, кефіру — у свеце займае 1-е месца. Натуральнамалочнай прадукцыі мы ўжываем 118 кг на чалавека ў год. У Новай Зеландыі, напрыклад, гэты паказчык складае 103 кг, у Аўстраліі — 92 кг, Канадзе — 69 кг, у ЗША — 60 кг, у Расіі — 47 кг.

***— Цікава, чаму беларусы ўжываюць так шмат малочнай прадукцыі?***

— Найперш таму, што асартымент прадукцыі ў нас надзвычай шырокі, на паліцах крамы кожны знойдзе сабе прадукты па смаку. Акрамя таго, мы знаходзімся на другім месцы ў свеце па спажыванні сметанковага масла — вельмі карыснага прадукту, у тым ліку для нашай імуннай сістэмы, які ўтрымлівае жывёльныя тлушчы, вітаміны A, D, E, — пасля Новай Зеландыі. Там гэты паказчык складае 6 кг, у нас — 5 кг. У ЕС, напрыклад, ужываюць у сярэднім 4 кг, у ЗША і Расіі — 3 кг.

Адметна, што такія высокія паказчыкі дасягнуты не толькі ў малочным сегменце, але і ў вытворчасці і забеспячэнні мясам. Узровень забеспячэння мяснымі прадуктамі ў нашай краіне складае 140 % на душу насельніцтва, мяса выпрабляецца 147 кг пры ўжыванні 103 кг.

***— Асноўная доля харчовых тавараў на нашых паліцах — айчыннай вытворчасці...***

— І гэта наш гонар, што крамы маюць не пустыя паліцы, а самы шырокі асартымент з розным цэнавым дыяпазонам. У мясной і малочнай групах тавараў доля айчынных набліжаецца да 90-100 %. Сыры складаюць 95,2 %, мяса птушкі і ялавічына — 99 %, сметанковае масла — 99 %, яйкі — 100 %. Па іншых таварах таксама высокая ўдзельная вага: макаронныя вырабы — больш за 60 %, крупы аўсяныя — 91 %, агародніна і грыбы — 65 %, бульба — 90 %, свежыя сталовыя буракі — 90 %, морква — 94 %, свежыя агуркі — 94 %, таматы —71 %, капуста белакачанная — 82 %, яблыкі — 59 %. Гэта сведчыць аб тым, што аграпрамысловы сектар забяспечвае насельніцтва харчаваннем у поўным аб'ёме па асноўных сацыяльных групах тавараў.

Прычым не толькі забяспечваем, але і павялічваем пастаўкі на ўнутраны рынак. За 9 месяцаў прырост вытворчасці сметанковага масла склаў 12 %, сыроў — 3 %, а мяккіх сыроў— увогуле 50 %, малочных кансерваў — 6 %, сухіх дзіцячых сумесяў — 10 %, мяса — 8 %, мясных і мясараслінных кансерваў — 4,8 %, пельменяў — 6 %.

Тэндэнцыі сведчаць, што мы гатовы экспартаваць прадукцыю неабходнай колькасці і стабільна высокай якасці на рынкі іншых краін. Некалькі апошніх гадоў Беларусь цвёрда ўтрымлівае пазіцыі вядучага сусветнага экспарцёра малочнай прадукцыі. Калі не ўлічваць гандаль паміж краінамі ўнутры Еўрасаюза, то ў экспарце малочнай прадукцыі наша краіна займае 5-е месца па экспарце масла, 4-е — па экспарце сыра, 3-е — згушчанага малака, сухой малочнай сыроваткі і яе кампанентаў. Доля харчовых тавараў у экспарце краіны перавышае 25 %.

Высокая якасць нашай прадукцыі ацэнена спажыўцамі 113 краін, куды мы пастаўляем свае харчовыя тавары. Найбольшую ўдзельную вагу ў экспарце займаюць малочныя прадукты, якія экспартуюцца ў 55 дзяржаў свету. Мясныя тавары пастаўляюцца ў 25 краін. Найбольш прадукцыі накіроўваецца ў краіны СНД з-за падабенства спажывецкіх і кулінарных пераваг, прывабнай лагістыкі. Пры гэтым 20 % у структуры экспарту займаюць краіны дальняй дугі, якія мы планамерна асвойваем, выконваючы задачу кіраўніка дзяржавы па дыверсіфікацыі экспарту. Высокая якасць нашых тавараў, шырокі асартымент, мадэрнізацыя прадпрыемстваў і стварэнне новых вытворчасцяў дазваляюць асвойваць азіяцкі рэгіён, краіны Афрыкі. Толькі сёлета адбыліся першыя пастаўкі пэўных груп харчовых тавараў у КНДР, Камбоджу, Гвінею, Эквадор, Дамініканскую Рэспубліку.

**Алена КРАВЕЦ.**

**ГРОДЗЕНСКАЯ ВОБЛАСЦЬ**

## ДЗЕЛЯ АГУЛЬНАГА ПОСПЕХУ

### Як прафсаюз АПК Гродзеншчыны клапоціцца аб работніках сельскагаспадарчай галіны



У Гродзенскай вобласці амаль усе работнікі аграпрамысловага комплексу ахоплены прафсаюзным рухам. Ён аб'ядноўвае каля 93 тысяч чалавек, што складае 98,3 працэнта ад усёй колькасці работнікаў. Па словах старшыні Гродзенскай абласной прафсаюзнай арганізацыі Беларускага прафсаюза работнікаў АПК Міхаіла СІЦЬКО, менавіта прадстаўнікі гэтай галіны складаюць самую шматлікую арганізацыю, куды ўваходзяць 17 раённых арганізацый, два аб'яднанні, 470 пярвічак. У склад абласнога прафсаюза таксама ўваходзіць Гродзенскі дзяржаўны аграрны ўніверсітэт, шэсць устаноў прафесійна-тэхнічнай адукацыі і сем сярэдняй спецыяльнай адукацыі. А сёлета прафсаюз папоўніўся яшчэ на 306 новых членаў, пераважна за кошт стварэння новых прадпрыемстваў і ўстаноў.

— Лічу, што галоўнай задачай прафсаюза з'яўляецца абарона інтарэсаў работнікаў сельскагаспадарчага комплексу, — заўважае Міхаіл Сіцько. — Простыя людзі павінны быць пад увагай у першую чаргу, бо ад іх здароўя, дабрабыту залежыць агульны поспех. Я ўпэўнены, што тыя справы, якія робяцца ў рамках прафсаюзнага руху, садзейнічаюць умацаванню грамадства, асабліва цяпер, калі вакол нямала знешніх нядобразычлівых суседзяў.

Між тым гродзенцы больш увагі звяртаюць не на розныя палітычныя гульні, а на стваральную працу. У чарговы раз яны заявілі аб сваіх лідарскіх пазіцыях падчас сёлетніх палявых работ. Гродзеншчына паказала высокі вынік, рэгіён унёс у агульны намалот звыш 2 мільёнаў тон збожжавых і зернебабовых культур. У гэты перыяд вызначылася нямала лідараў, якія былі адзначаны прафсаюзамі АПК у рамках абласнога спаборніцтва, як заўважыў інспектар па сацыяльна-эканамічнай рабоце Аляксандр Семянчук. Сотні экіпажаў намалацілі па тысячы тон збожжа, а рэкардсмены дасягнулі нават пяці тысяч тон. Гэта камбайнер Алег Бандарэвіч і вадзіцель Павел Барцэвіч з СВК імя Дзеншчыкова Гродзенскага раёна. Звыш 2200 удзельнікаў уборачнай кампаніі ўзнагароджаны на агульную суму 217 тысяч 290 рублёў. І гэта не канчатковы вынік. У кожным раёне будзе вызначаны свой пераможца па намалоце, які атрымае прыз падчас прафесійнага свята. Высокія паказчыкі спрыяюць і дабрабыту работнікаў сферы АПК.

Шмат увагі ўдзяляецца ўмовам працы на вытворчасці. Міхаіл Сіцько паведаміў, што перад уборкай быў праведзены даволі значны семінар, дзе ўлічваліся ўсе актуальныя моманты, у тым ліку аспекты бяспекі. Важны акцэнт быў зроблены на харчаванні падчас палявых работ. Асаблівая ўвага ўдзялялася агляду сельскагаспадарчай тэхнікі, наяўнасці супрацьпажарных сродкаў. Пастаяннае правядзенне месячнікаў бяспекі працы і тыдняў нулявога траўматызму дазволіла пазбегнуць няшчасных выпадкаў падчас масавых палявых работ.

Па словах тэхнічнага інспектара абласной арганізацыі Віталя Крыштопіка, істотную дапамогу ў ахове працы аказваюць грамадскія інспектары. Іх у вобласці амаль 1600 чалавек. Усе яны пастаянна ўдасканальваюць свае навыкі, толькі сёлета прайшла навучанне амаль тысяча грамадскіх інспектараў. Аб іх узроўні сведчаць і добрыя вынікі падчас конкурсаў сярод гэтай катэгорыі. Адзін з такіх інспектараў нават стаў пераможцам рэспубліканскага конкурсу на званне найлепшага грамадскага інспектара Беларусі. Такім чынам, прафсаюзы АПК прыкладаюць усе намаганні для таго, каб чалавек прыйшоў на бяспечнае месца работы і здаровым пайшоў дамоў пасля працоўнага дня.

Не застаецца ўбаку прафсаюзная арганізацыя і ад дапамогі ў вырашэнні прававых пытанняў пры працоўных спрэчках. Як адзначае **прававы інспектар Павел СКАМАРОШКА**, катэгорыя такіх спрэчак розная. У асноўным разглядаюцца справы па адмене дысцыплінарных альбо матэрыяльных спагнанняў, аказанне адзіначасовай матэрыяльнай дапамогі ў асобных выпадках. Такім чынам, за 9 месяцаў на карысць работнікаў спагнана звыш 640 тысяч рублёў. Рэгулююцца таксама працоўныя адносіны, звязаныя з кантрактнай сістэмай.



**Штодзённая планёрка па бягучых пытаннях. Злева направа: прававы інспектар работы Павел Скамарошка, інспектар па сацыяльна-эканамічнай рабоце Аляксандр Семянчук, старшыня Міхаіл Сіцько, загадчыца аддзела арганізацыйнай і грамадскай работы Вольга Дзюрдзь, тэхнічны інспектар работы Віталь Крыштофік, загадчыца аддзела фінансавай работы — галоўны бухгалтар Лілія Серахан, галоўны спецыяліст аддзела арганізацыйнай і грамадскай работы Юлія Атрушкевіч.**

Абласны прафсаюз АПК скіраваны не толькі на працоўны аспект. Тут дбаюць аб тым, каб людзі мелі магчымасць аздаравіцца, таму на гэтыя мэты выдзяляюцца максімальна значныя сродкі. Усе члены прафсаюза карыстаюцца аздараўленнем у прафсаюзных санаторыях са зніжкай 25 %. Пры гэтым чалавек можа звярнуцца ў прафкам па месцы працы, каб яму часткова кампенсавалі затраты на аздараўленне. Па словах **галоўнага бухгалтара Ліліі СЕРАХАН**, За 9 месяцаў амаль 7 тысяч членаў прафсаюза пабывалі ў здраўніцах Беларусі. Абласной прафсаюзнай арганізацыяй закуплена 11 пуцёвак для аграрыяў, якія працавалі на палявых работах. Сёлета таксама аздаравіліся 10 тысяч дзетак работнікаў АПК. Значную дапамогу аказалі прафсаюзныя арганізацыі па месцы работы бацькоў. Каб зрабіць пуцёўкі больш таннымі, было накіравана звыш 300 тысяч рублёў. За кошт прафсаюзаў арганізавана больш за 400 турыстычных паездак.

Вялікая ўвага абласным прафсаюзам засяроджваецца і на ўдзеле ў дабрачынных рэспубліканскіх прафсаюзных акцыях «Прафсаюзы дзецям», «Ад усёй душы», «Тыдзень бацькоўскай любові». У рамках акцый аказваецца спонсарская дапамога на ўмацаванне матэрыяльна-тэхнічнай базы падшэфных арганізацый (установы адукацыі, сацыяльна-педагагічныя цэнтры і цэнтры сацыяльнай абароны насельніцтва, пансіянаты і г. д.), арганізуюцца ўрачыстыя ўшаноўванні членаў прафсаюза, сустрэчы пакаленняў, наведванні ветэранаў працы з уручэннем падарункаў і аказаннем адраснай дапамогі, дабрачынныя мерапрыемствы для дзяцей і многае іншае.

Арганізацыйнымі структурамі Гродзенскай абласной прафсаюзнай арганізацыі Беларускага прафсаюза работнікаў АПК вядзецца планамерная работа па арганізацыі і правядзенні розных фізкультурна-аздараўленчых і спартыўна-масавых мерапрыемстваў, павышэнні ролі фізічнай культуры і спорту ва ўмацаванні здароўя членаў прафсаюза і членаў іх сем'яў, арганізацыі вольнага часу. Як вынік гэтай работы — члены прафсаюза АПК Гродзеншчыны ў ліку пераможцаў і прызёраў абласных і рэспубліканскіх спартакіяд і турыстычных злётаў.

**Маргарыта УШКЕВІЧ. Фота Алены ДАЎЖАНОК.**






### ПАВАЖАНЫЯ ПРАЦАЎНІКІ АГРАПРАМЫСЛОВАГА КОМПЛЕКСУ, ВЕТЭРАНЫ ПРАЦЫ!

*Гродзенская абласная прафсаюзная арганізацыя Беларускага прафесійнага саюза работнікаў аграпрамысловага комплексу віншуе вас з прафесійным святам — Днём работнікаў сельскай гаспадаркі і перапрацоўчай прамысловасці аграпрамысловага комплексу!*

*Прыміце нашы шчырыя словы падзякі за самаадданасць, прафесіяналізм і вернасць традыцыям беларускай сельскай гаспадаркі.*

*Сваёй карпатлівай штодзённай працай вы робіце значны ўнёсак ва ўмацаванне эканамічнага патэнцыялу ўсёй краіны. Работнікі сельскай гаспадаркі з года ў год праяўляюць свае найлепшыя якасці, дзякуючы якім забяспечваецца харчовая бяспека Рэспублікі Беларусь.*

*У ваша прафесійнае свята шчыра жадаем вам і вашым сем'ям моцнага здароўя і дабрабыту, прафесійных і асабістых поспехаў на карысць шчаслівай будучыні Беларусі!*



# ГАРАНТ ЯКАСЦІ І ХАРЧОВАЙ БЯСПЕКІ

**На прадпрыемстве робяць стаўку на карысць спажыўцоў і развіваюць імідж**




ААТ «Гродзенскі мясакамбінат» — флагман перапрацоўчай прамысловасці краіны з больш чым 110-гадовай гісторыяй. Тут штомесяц вырабляецца звыш 4,5 тысячы тон каўбас і 700 тысяч тон паўфабрыкатаў, якія адпавядаюць міжнародным стандартам якасці, бяспекі, аховы працы, экалогіі і патрабаванням «Халяль». Гандлёвая сетка прадпрыемства вядома пад брэндам «Гродзенскія прысмакі». Нядаўна камбінат узначаліла Вольга ЯНУШКА — вопытны кіраўнік адпаведнай галіны перапрацоўкі. Сваю задачу бачыць у тым, каб захаваць традыцыі і задаволіць патрабаванні спажыўцоў. Прадпрыемства скіравана на новыя аб'ёмы, выпуск мясных далікатэсаў і развіццё шматграннага іміджу.



Фота з архіва прадпрыемства.

## НАША ДАВЕДКА:

Мясакамбінат — не толькі буйны вытворца, але і прадпрыемства з вялікай базай дадатковых падраздзяленняў. Так, у яго склад уваходзіць філіял «Лідскі мясакамбінат», які поўнасцю абноўлены і мадэрнізаваны. Цяпер тут вырабляецца амаль тысяча тон мяснай прадукцыі штомесячна. Таксама пад эгідай «ГМ» функцыянуе сетка фірмавага гандлю, рэстараны, сезонныя кафэ, гасцінічны комплекс у Лідскім раёне, спартыўна-аздараўленчы цэнтр, дзіцяча-спартыўны аздараўленчы летнік «Зорны шлях». Адным з самых знакамітых аб'ектаў Гродзенскага мясакамбіната можна лічыць папулярны агратурыстычны комплекс «Гарадзенскі маёнтак «Каробчыцы». Таксама на палях сельскагаспадарчага філіяла «Парэчанка» вырошчваюць клубніцы, суніцы і нават ягады годжы. Штат супрацоўнікаў дасягае 4,5 тысячы чалавек.

## ПРАЕКТ З ПРЫЦЭЛАМ НА РЫВОК

**Роўна 10 гадоў таму на мясакамбінаце пачаў дзейнічаць цэх сыравэнджаных каўбас**

Рэалізацыя інвестпраекта вялася ў рамках дзяржаўнай праграмы мадэрнізацыі мяса-малочнай галіны. Гэта была даволі значная падзея для камбіната, бо ўвядзенне новага цэха дазволіла замацаваць лідарскія пазіцыі на рынку мясной прадукцыі. За дзесяць гадоў магутнасці цэха значна пашырыліся, і аб'ёмы працягваюць расці.

Як паведаміла **начальнік цэха Ірына ВАСІЛЬЕВА**, спачатку выпускалі 550 тон каўбас за месяц. Калектыў быў невялікі — некалькі дзясяткаў чалавек. Паступова нарошчваліся тэмпы, з'яўляліся новыя тэхналогіі, і цяпер адтуль паступае звыш 700 тон гатовых вырабаў. Увесь вытворчы працэс забяспечваюць 330 чалавек. Дарэчы, кадравая палітыка тут пад асаблівым кантролем.

— Да новых падыходаў рыхтуемся разам з нашымі базавымі навучальнымі ўстановамі — ліцэямі, каледжамі, Гродзенскім аграрным універсітэтам. З імі ў нас дагаворы аб працаўладкаванні спецыялістаў. Але яшчэ ў працэсе вучобы заахвочваем студэнтаў — яны працуюць у студэнцкіх атрадах, на практыцы, на канікулах, затым уладкоўваюцца на мясакамбінаце. У нас даволі значны сацыяльны пакет, і мы адчуваем сябе ўпэўнена на рынку працы. Асноўны касцяк тут ужо многія гады, — патлумачыла Ірына Васільева.

Яна падкрэсліла, што цэх, як і ўвесь мясакамбінат, скіраваны на тое, каб спажывец, які плаціць за тавар, атрымаў якасную прадукцыю. Для гэтага на прадпрыемстве працуюць кваліфікацыйныя камісіі, якія ахопліваюць усе кірункі. Тут і ахова працы, і ветэрынарныя правілы, і санітарныя нормы, і тэхналогіі, і работа абсталявання, і іншыя сферы дзейнасці. Паколькі гаворка ідзе аб бяспечнай прадукцыі, увесь вытворчы ланцужок лічыцца важным. Самы нязначны збой можа адбіцца на канчатковым выніку. Таму правілы і нормы тут бездакорна выконваюцца.

Такі комплекс мерапрыемстваў па сілах забяспечыць толькі паспяховаму і моцнаму прадпрыемству. Гэта і ёсць гарантыя бяспекі для спажыўца — рабіць выбар на карысць вялікіх вытворцаў з трывалымі традыцыямі і шырокай лінейкай прадукцыі.

Між тым асартымент цэха пастаянна абнаўляецца. Спецыялістамі камбіната ўводзяцца новыя лінейкі каўбасных гатункаў. Так, добрым попытам карыстаецца італьянская лінейка: каўбасы «Італьянская», «Пеперoні», «Мілана», «Брэзаола», «Вентрычына», «П'емонтэ», «Ле філет» і іншыя вырабы. Прадукцыя лініі «Азбука харчавання» мае сваю рэцэптуру і паступае ў дзіцячыя, школьныя ўстановы.

Начальнік цэха ўпэўнена, што заспакойвацца на існуючых пазіцыях яшчэ рана, трэба трымаць марку і рухацца далей.



Якасць прадукцыі заўсёды на кантролі ў начальніка цэха сыравэнджаных вырабаў Ірыны ВАСІЛЬЕВАЙ.





Расфасоўшчыца Ала ШТРЭНА маркіруе каўбасу.

## ФАСОЎКА ДЗЕЛЯ ЗРУЧНАСЦІ

У цэху сыравэнджаных каўбас некалькі ўчасткаў. Адзін з іх — фасоўка прадукцыі. **Яўгенія ШОСТКА** працуе тут з самага запуску цэха.

Яна памятае, як наладжвалі абсталяванне, як запускалі першую лінію. Усе былі апантаныя новай вытворчасцю і імкнуліся прадставіць на рынак самую эксклюзіўную прадукцыю. Улічвалася нават форма і размяшчэнне этыкетак, варыянты якіх неаднаразова мяняліся. Дарэчы, іх распрацоўка пастаянна ўдасканальваецца, пераглядаецца, пакуль не знаходзілася самае аптымальнае рашэнне. Трэба дадаць, што выпуск этыкетак наладжаны на адным з філіялаў мясакамбіната.

Яўгенія ўспамінае, што спачатку адна працавала на расфасоўцы. А цяпер на змене больш за 20 чалавек. Тонкасцямі сваёй работы яна з задавальненнем дзеліцца з навічкамі. «Усё гэта дае свой плён, — кажа Яўгенія, — бо ўсе, хто прыходзіць сюды, вельмі адказна выконваюць свае абавязкі. Інакш у нашай рабоце проста немагчыма».

Суразмоўніца ўспамінае, што аб'ёмы за гэты час вельмі выраслі. Напачатку фасоўка была ў межах 800 кілаграмаў. Цяпер за суткі праз участак упакоўкі праходзіць каля 40 тон гатовай прадукцыі. Павялічыўся і асартымент. Прычым узрасла доля прадукцыі, якая фасуецца невялікай вагой, з'явіліся вакуумныя ўпакоўкі, нарэзкі, сервіроўкі. Спажыўцу гэта вельмі зручна.

«Мы павінны адпавядаць запытам нашых спажыўцоў, — разважае Яўгенія. — Тым больш што якасць нашых каўбас не выклікае нараканняў, іх усе мае блізкія і знаёмыя з задавальненнем купляюць. Выбар вялізны, на любы густ і на любы кашалёк. Асабліва папулярныя фірменныя крамы, дзе наша прадукцыя прадстаўлена вельмі шырока».

Разглядаюцца планы па далейшай рэканструкцыі цэха. Такім чынам, можна не сумнявацца, што ў прадпрыемства вялікі патэнцыял, каб радаваць пакупнікоў новым асартыментам.



Расфасоўшчыца мясапрадуктаў Яўгенія ШОСТКА вакуумуе прадукты.

## ДЫНАСТЫЯ АДНАДУМЦАЎ

**Агульны стаж сям'і Кавалёвых складае больш за 80 гадоў**

Можна сказаць, што ўсё працоўнае жыццё Аляксандра і Марыі прайшло на Гродзенскім мясакамбінаце. Тут яны і пазнаёміліся. З тае пары амаль увесь час працуюць на родным прадпрыемстве. Аляксандр асвоіў спецыяльнасць складальніка фаршу ў цэху субпрадуктаў і дайшоў да 5 разраду. Кажа, што трэба пастаянна вучыцца новаму, бо тэхналогіі не стаяць на месцы, затое прыемна, калі пакупнікі робяць выбар на карысць прадукцыі яго цэха. Увогуле, Аляксандр адчувае гонар і за ўвесь асартымент мясакамбіната, які шырока прадстаўлены ў крамах. Ён сам аддае перавагу традыцыйным смакам, якія памятае здаўна, — каўбасам «Кракаўскай», «Доктарскай, «Маскоўскай».

Марыі падабаюцца розныя віды, асабліва навінкі. Кажа, што заўсёды хочацца пакаштаваць штосьці новае, эксклюзіўнае. Напрыклад, з вырабаў італьянскай лініі атрымліваецца вельмі смачная піца.

А паколькі на камбінаце пастаянна адбываецца нешта новае, нагод для гутарак у сям'і хапае. За вячэрай можна абмеркаваць і рабочыя моманты. Часта да сямейнага стала далучаецца і дачка Ганна, якая ўжо 10 гадоў працуе на прадпрыемстве. Яна замужам і жыве асобна, але часта сустракаецца з бацькамі падчас працоўнага дня. Пачынала з аддзела забеспячэння рэсурсамі. Тады нават жартавалі, што склаўся своеасаблівы вытворчы ланцужок ад паступлення сыравіны да перапрацоўкі, у якім задзейнічаны ўсе члены сям'і. Цяпер Ганна Палушкіна працуе тэхнолагам, і ёсць нагода абмеркаваць смак новых відаў прадукцыі. «Развіваемся, расцём, вучымся нечаму новаму, — так акрэсліла суразмоўніца свае меркаванні. — Прадпрыемства пастаянна здзіўляе, радуе, выклікае заслужаны гонар. Тым больш што наш мясакамбінат не абмяжоўваецца толькі вытворчай сферай. У нас вялікі сацыяльны пакет, удзяляецца вялікая ўвага аздараўленню супрацоўнікаў і іх дзяцей. Праводзіцца шмат экскурсій. Таксама можна рэалізаваць свае творчыя здольнасці. Варыянтаў шмат».

На прадпрыемстве лічаць, што працоўныя дынастыі — гэта добра, бо перадаецца вопыт, фарміруецца міні-калектыў аднадумцаў. Так, для Ганны, дарэчы, бацькі сталі прыкладам адказных адносін да працы, дапамаглі ўвайсці ў курс справы, што дазволіла значна хутчэй асвоіць прафесійныя навыкі. Паступова веды ўдасканальваюцца, кругагляд пашыраецца. А чым больш ведаў, тым больш якасная будзе праца, упэўнены Кавалёвы.





На прадпрыемстве ўжо шмат гадоў працуе сям'я КАВАЛЁВЫХ. Бацька, Аляксандр КАВАЛЁЎ, — складальнік фаршу ў цэху субпрадуктовых вырабаў, маці, Марыя КАВАЛЁВА, — начальнік аддзела сыравіны, а дачка, Ганна ПАЛУШКІНА, — спецыяліст аддзела тэхналагічных працэсаў.

## НАША ДАВЕДКА:

ААТ «Гродзенскі мясакамбінат» — нязменны пераможца самых прэстыжных конкурсаў. Так, па выніках конкурсу «Найлепшыя тавары Рэспублікі Беларусь на рынку Расійскай Федэрацыі» за мінулы год адзначаны каўбасы «Кракаўская», «Арыгінальная «Мінская», «Доктарская з масліцам». За актыўны ўдзел у выстаўках камбінат атрымаў дыпломы на міжнародных форумах у Ташкенце (Узбекістан), Баку (Азербайджан), Булавайва (Зімбабвэ), залаты медаль на 35-й выстаўцы «БелАгра-2025». У рамках рэгіянальнай выстаўкі «Купляйце беларускае» прадпрыемства заваявала першае месца і сертыфікат «Найлепшы вытворца», а таксама ўзнагароджана дыпломам лаўрэата Прэміі Урада Беларусі за дасягненні ў галіне якасці, укараненні інавацыйных тэхналогій і сучасных метадаў менеджменту.

## НАША ДАВЕДКА:

Прадукцыя Гродзенскага мясакамбіната экспартуецца ў многія краіны свету. Аб'ём экспарту за дзевяць месяцаў дасягнуў значных паказчыкаў у параўнанні з мінулым годам. Тэмп росту склаў 121 %. Палова экспартных паставак вядзецца ў Расійскую Федэрацыю (50,3 %). Значная доля прыпадае на Узбекістан (34 %). Пашыраецца кітайскі рынак збыту. Таксама гродзенскія прысмакі ведаюць у Казахстане, Азербайджане, Грузіі, Арменіі, Кіргізіі, Малайзіі, Ганконгу, Арабскіх Эміратах, Саудаўскай Аравіі і іншых краінах свету. У перспектыве плануецца пашырыць пастаўкі за мяжу і заваяваць новыя рынкі. Такія планы абумоўлены гібкай стратэгіяй адаптацыі прадукцыі да патрабаванняў замежных партнёраў і высокім даверам да беларускай якасці.



## СМАК ПАД КАНТРОЛЕМ

Яшчэ адзін важны ўчастак — пасолу мяса, прыгатавання фаршу і фармоўкі каўбасных вырабаў. Па словах **складальніка фаршу 5 разраду Сяргея КАЛОШЫ**, працэс работы адладжаны. Праз участак праходзіць шмат відаў каўбас, кожны з якіх мае сваю рэцэптуру. Таму варта быць пастаянна ў тонусе і не губляць канцэнтрацыю і ўвагу. «Вядома, усё прыходзіць з вопытам, веданне тэхналогіі дапамагае арыентавацца ў кампанентах. Бо ад гэтага залежыць смак вырабу, яго структура, тэрмін сушкі і іншыя асаблівасці. Кожная каўбаса вырабляецца па-свойму», — тлумачыць суразмоўнік.

За плячыма Сяргея — вучоба ў Гродзенскім аграрным універсітэце і 15 гадоў работы на камбінаце. Кажа, што асабліва падабаецца асвойваць новы асартымент, які прапаноўваюць спецыялісты тэхналагічнага аддзела. Сяргей заўсёды гатовы выказаць сваё меркаванне па эксперыментальных каўбасах. Яму, як вопытнаму спецыялісту, давяраюць. І калі новы гатунак праходзіць агульны арганалептычны кантроль і адобраны на ўзроўні кіраўніцтва, выраб атрымлівае пуцёўку ў вытворчасць.

Вядома, новыя аб'ёмы немагчымы без сучаснага тэхналагічнага абсталявання. Мадэрнізацыя значна палепшыла і ўмовы працы. Замест малагабарытных фаршамяшалак, ці, як іх тут называюць, кутараў, закуплены аб'ёмныя агрэгаты на 300 і 500 кілаграмаў.



Складальнік фаршу цэха сыравэнджаных каўбасных вырабаў Сяргей КАЛОША за працай.

Маргарыта УШКЕВІЧ, Алена ДАЎЖАНОК..
Фота Лізавета ГОЛАД.

УНП 500043292

# ААТ «БЕЛЛАКТ»: БЕЛАРУСКІ ФЛАГМАН НА РЫНКУ ДЗІЦЯЧАГА ХАРЧАВАННЯ



Вось у такіх ёмістасцях захоўваецца малако.






## ПАВАЖАНЫЯ РАБОТНІКІ І ВЕТЭРАНЫ СЕЛЬСКАЙ ГАСПАДАРКІ І ПЕРАПРАЦОЎЧАЙ ПРАМЫСЛОВАСЦІ!

*Ад калектыву Ваўкавыскага ААТ «Беллакт» і ад сябе асабіста віншую вас з прафесійным святам — Днём работнікаў сельскай гаспадаркі і перапрацоўчай прамысловасці! Сельскагаспадарчая вытворчасць — ключавы сектар беларускай эканомікі, харчовая бяспека краіны, дабрабыт і працвітанне кожнай сям'і. Мы ўдзячныя ўсім работнікам сельскагаспадарчай вытворчасці, ветэранам працы, якія перадаюць свае веды і вопыт маладому пакаленню, пенсіянерам, якія працягваюць працаваць. Вялікі дзякуй за добрасумленную працу і настойлівасць у дасягненні пастаўленых мэт.*

*Ад усёй душы жадаем вам здароўя, шчасця, поспехаў у працы, добрага надвор'я і заўсёды багатага ўраджаю! Каб праца прыносіла вам толькі радасць і дастатак!*

***Генеральны дырэктар ААТ «Беллакт» Віталь ЛУПІК.***




Маладзёжны актыў прадпрыемства.
Злева направа: спецыяліст па культурна-забаўляльнай дзейнасці Віталь ПЛАЎНІК, інжынер-праграміст інфармацыйна-вылічальнага цэнтра Дзмітрый ШВАБА, спецыяліст па кіраванні інавацыямі і распрацоўках аддзела тэхнічнага пераўзбраення і мадэрнізацыі вытворчасці Кацярына БАРАДЗЕНЯ, інжынер-праграміст інфармацыйна-вылічальнага цэнтра Яўген БАРАДЗЕНЯ, намеснік генеральнага дырэктара па ідэалагічнай рабоце Надзея ВІДУК, начальнік аддзела тэхнічнага пераўзбраення і мадэрнізацыі вытворчасці Андрэй ЛУКАШЭВІЧ, спецыяліст па рабоце з моладдзю Таццяна СКІБА, намеснік галоўнага бухгалтара Крысціна САВІЧ, дызайнер аддзела маркетынгу Кацярына КРУПОВІЧ, юрысконсульт Алег СВІТА, інжынер-праграміст інфармацыйна-вылічальнага цэнтра Таццяна ХВЯСЕНЯ, менеджар кантакт-цэнтра Наталія ГРУШЭВІЧ, бухгалтар прафсаюзнага камітэта Анастасія КАРАМАЛАК, дызайнер аддзела дзіцячага і спецыялізаванага харчавання Крысціна КОЗЕЛ, кіраўнік аддзела маркетынгу Святлана ЯКУБОВІЧ, менеджар па рабоце з кліентамі сектара арганізацыі продажаў Кацярына ЛАЎСКАЯ, інжынер-праграміст інфармацыйна-вылічальнага цэнтра Віктар ДУБАЙ, эканаміст службы планавання і эканамічнага аналізу Віялета КАСЦЮК.

У сучасным аграпрамысловым комплексе Беларусі ёсць брэнды, якія не проста вядомыя, а знакавыя. Адзін з іх — ААТ «Беллакт», адзіны ў краіне і адзін з найбуйнейшых у СНД вытворцаў сухога дзіцячага харчавання. За гэтым статусам стаіць сучаснае, высокатэхналагічнае прадпрыемства, прадукцыя якога адпавядае найвышэйшым стандартам якасці. Мы наведалі ААТ «Беллакт» і гатовы з вамі падзяліцца апошнімі навінамі прадпрыемства.

## НОВЫЯ ГАРЫЗОНТЫ

Адной з самых знакавых падзей у найбліжэйшай будучыні для ААТ «Беллакт» стане будаўніцтва новага цэха па выпуску сухіх дзіцячых сумесяў.

Паводле слоў **генеральнага дырэктара Віталя ЛУПІКА**, рэалізацыя праекта дасць магчымасць павялічыць перапрацоўку малака на 85 тысяч тон за год.

— Гэта будзе цэх па вытворчасці сухога дзіцячага харчавання па стандарце GMP. Такі міжнародны стандарт існуе ўжо каля 100 гадоў у фармацэўтыцы. Нам ён дазволіць пашырыць рынкі збыту і пастаўляць дзіцячае харчаванне ў краіны «далёкай дугі». Напрыклад, зайсці на рынкі Азіі, Афрыкі і Лацінскай Амерыкі, — расказаў Віталь Лупік.

На дадзены момант прадукцыя ААТ «Беллакт» ужо ідзе на экспарт у 22 краіны, аднак няма мяжы дасканаласці, і, вядома, будаўніцтва новага цэха адкрые новыя гарызонты перад прадпрыемствам.

У цэлым у гэтай галіне трэба заўжды ісці ў нагу з часам. Віталь Лупік падзяліўся, што, згодна з бізнес-планам, штогод закладваецца ад 25 да 35 мільёнаў рублёў на мадэрнізацыю. Так, зусім нядаўна на прадпрыемстве запусцілі лінію разліву малака ў бутэльку і поўнасцю рэканструявалі маслацэх.

## ПРЫЗНАНАЯ ЯКАСЦЬ

У 2024 годзе ААТ «Беллакт» быў прысвоены Дзяржаўны знак якасці за прадукцыю «BELLAKT PREMIUM 1» і «BELLAKT PREMIUM 2». Аб асаблівасцях гэтай лінейкі, а таксама аб навінках і рабоце сектара медыцынскага маркетынгу на прадпрыемстве мы пагаварылі з **кіраўніком аддзела дзіцячага і спецыялізаванага харчавання Наталляй КАРАЧ**.




Кіраўнік аддзела дзіцячага і спецыялізаванага харчавання Наталля КАРАЧ з дзіцячым харчаваннем, якое ўдастоена дзяржаўнай узнагароды «Знак якасці».

— Сёння лінейка «BELLAKT PREMIUM» уяўляе сабой тры формулы для markrознага ўзроставага перыяду: для дзяцей з нараджэння да паўгода, з паўгода да года і з года да трох гадоў. Асаблівасць гэтага дзіцячага харчавання ў тым, што гэта высокаадаптаваныя прадукты. У іх склад уваходзяць розныя функцыянальныя кампаненты, такія як доўгаланцужковыя паліненасычаныя тоўстыя кіслоты, нуклеатыды, пра- і прэбіётыкі, лютэін — усё гэта дапамагае ў развіцці галаўнога мозгу і органаў зроку дзіцяці, падтрымлівае здаровую кішачную мікрабіёту і імунітэт, — расказала Наталля Карач.

Характэрна і тое, што хутка будзе выпушчана прынцыпова новая лінейка прадуктаў для харчавання ранняга ўзросту, з новым сучасным складам, якая будзе ўключаць 4 формулы: з нараджэння да 6 месяцаў, з 6 да 12 месяцаў, з 12 да 18 месяцаў і з 18 да 36 месяцаў. На паліцах крам ужо з'явіўся першы айчынны прадукт энтэральнага харчавання для дзяцей з аднаго года пад гандлёвай маркай «Сам ням».

— Гэта прадукт для дзвюх катэгорый дзяцей: для тых, якія мала і дрэнна ядуць, а таксама для малых з бялкова-энергетычнай недастатковасцю, — адзначыла кіраўнік аддзела дзіцячага і спецыялізаванага харчавання.

Наталля Карач таксама падзялілася, што ў найбліжэйшай будучыні на прадпрыемстве плануюць прадоўжыць лінейку каш за кошт увядзення прадуктаў з 8-10 месяцаў і з аднаго года.

— З 8-10 месяцаў мы будзем уводзіць у кашы кавалачкі садавіны, якія спрыяюць развіццю навыкаў жавання ў дзяцей, і біфідабактэрыі для камфортнага стрававання. З аднаго года таксама будуць дабаўлены аўсяныя шматкі, якія будуць рыхтаваць дзіця да пераходу на агульны стол, — пракаментавала спецыяліст.

Падабраць прыдатнае дзіцячае харчаванне для канкрэтнага малога без рэкамендацыі ўрача няпроста. Менавіта для вырашэння гэтага пытання ў структуры прадпрыемства ёсць сектар медыцынскага маркетынгу.

— Каля 70 % мам звяртаюцца да ўрача за рэкамендацыяй пры выбары формулы для дзіцячага харчавання, а таксама прадуктаў прыкорму. І толькі, ацаніўшы ўзрост, стан здароўя і фізіялагічныя асаблівасці дзіцяці, урач можа зрабіць правільны выбар. Вось тут вельмі важна работа сектара медыцынскага маркетынгу. Нашы медыкі ідуць непасрэдна да практыкуючых урачоў, навукоўцаў, расказваюць пра перавагі і карысныя ўласцівасці лінейкі харчавання «Беллакт», пра навінкі, якія выпускае прадпрыемства, а таксама пра прафілактычнае і лячэбнае харчаванне, якое патрабуе асаблівай увагі, — расказала Наталля Карач.



Начальнік лабараторыі таксікалагічных даследаванняў і радыяцыйнага кантролю Ала БУЦЬКО і інжынер-хімік Вольга КУХАРЧЫК правяраюць вынікі каліброўкі і фактычнага значэння вітаміну К1.



Малады спецыяліст, інжынер-хімік Дзмітрый БЫЧАК даследуе колькаснае вызначэнне мінеральных рэчываў у пробах.

Усяго ў штаце гэтага сектара 8 чалавек, сярод якіх 4 кандыдаты медыцынскіх навук, педыятры і навуковы саветнік. Варта адзначыць, што, апроч самога маркетынгу, спецыялісты таксама ўдзельнічаюць у распрацоўцы новых відаў прадукцыі і ўдасканаленні існуючай лінейкі прадуктаў для харчавання дзяцей ранняга ўзросту.



Аператар лініі ў вытворчасці харчовай прадукцыі Галіна МІЦКЕВІЧ збірае гатовае піражнае ў кораб.



Участак вытворчасці глазіраваных вырабаў. Аператары лініі ў вытворчасці харчовай прадукцыі Эма КУЧУРА і Святлана КАСАЧ укладваюць вафлі на транспарцёр.

## УНІКАЛЬНАЯ ЛАБАРАТОРЫЯ

Ёсць на прадпрыемстве лабараторыя таксікалагічных даследаванняў і радыяцыйнага кантролю. Гэта адзіная вытворчая лабараторыя ў краіне, якая даследуе дзіцячае харчаванне на вітаміны і мінералы.

— У нас 59 паказчыкаў, што ўключае вялікую колькасць метадаў. Мы даследуем адзін паказчык па двух-трох метадах, таму што маркіроўка дзіцячага харчавання з'яўляецца самым важным паказчыкам якасці і бяспекі прадукцыі, — падкрэсліла **начальнік лабараторыі таксікалагічных даследаванняў і радыяцыйнага кантролю Ала БУЦЬКО**.

Тут сабрана ўнікальнае абсталяванне, якога няма ў іншых вытворчых лабараторыях. Напрыклад, атамна-абсарбцыйны спектрометр, на якім спецыялісты вызначаюць таксічныя элементы і мінеральныя рэчывы; газавыя, вадкасныя і іённы храматографы, на якіх аналізуюць кампаненты складаных сумесяў рэчываў.

Сама Ала Буцько працуе на прадпрыемстве ўжо больш за 10 гадоў. Пачынала з інжынера-хіміка і з цягам часу стала начальнікам лабараторыі. З усмешкай падзялілася, што руціна — гэта зусім не пра яе працу.

— Тут увесь час нешта новае: метады, даследаванні... Ты чуеш аб тым, што з'яўляюцца новыя паказчыкі, якія даследуюць розныя арганізацыі, і загараешся ад жадання рэалізаваць гэты метад у сваёй лабараторыі. Праца хіміка наогул вельмі цікавая: няма руціны, паўторнасці, — заключыла яна.



Работнікі прадпрыемства з задавальненнем удзельнічаюць у турзлётах.

Фота з архіва прадпрыемства.

## КАМАНДА БУДУЧЫНІ

Праца з моладдзю — адзін з ключавых кірункаў для ААТ «Беллакт». Па словах **спецыяліста па рабоце з моладдзю Таццяны СКІБЫ**, на прадпрыемства на практыку актыўна прыцягваюцца студэнты з перспектывай працаўладкавання.

— Гэта важна для таго, каб яны маглі пазнаёміцца з прадпрыемствам і вызначыцца з будучым месцам работы. Калі малады спецыяліст прыходзіць да нас, мы абавязкова цікавімся яго захапленнямі — вядзём спецыяльныя карткі хобі. Гэта дапамагае фарміраваць актыў: хтосьці моцны ў спорце, хтосьці ў арганізацыі мерапрыемстваў, — падзялілася яна.

Паводле слоў Таццяны Скібы, творчае і спартыўнае жыццё на прадпрыемстве кіпіць.

— Канцэрты ў нас у асноўным праводзяцца сіламі супрацоўнікаў — у музычным кабінеце пастаянна ідуць рэпетыцыі. А нашы спартсмены рэгулярна перамагаюць на розных спаборніцтвах. Для гэтага створаны ўсе ўмовы: ёсць фізкультурна-аздараўленчы комплекс з басейнам і трэнажорнай залай, таксама мы арганізуем сплавы на байдарках і лёгкаатлетычныя забегі, — адзначыла яна.

Па словах Таццяны Скібы, дзякуючы ўсім гэтым мерапрыемствам «беллактаўцы» становяцца сапраўднай камандай.

— У нас склаўся згуртаваны маладзёжны актыў. Я стварыла гурт пад назвай «Маладзёжка», дзе ўжо каля 150 чалавек. Найменшая мая просьба — і яны адразу тут! Вельмі прыемна бачыць, як пасля мерапрыемстваў моладзь абменьваецца кантактамі і пачынае сябраваць за межамі работы, — падзялілася яна.

Ёсць на прадпрыемстве і вельмі паспяховыя спартсмены. Так, на рэспубліканскіх спаборніцтвах па гіравым спорце рэгулярна заваёўвае «золата» зменны механік кансервавага цэха Уладзімір Касцючэнка. Не адстае і раённая футбольная каманда «Змена», у якой аж сем «беллактаўцаў». Нядаўна яны бліскуча выступілі на абласных спаборніцтвах, заваяваўшы ганаровае другое месца.

Асаблівая ўвага на прадпрыемстве ўдзяляецца сацыяльнай падтрымцы. Калектыўны дагавор уключае ў сябе больш за 20 дадатковых гарантый для моладзі: дапамогі пры ўступленні ў шлюб і нараджэнні дзіцяці, падтрымка студэнтаў і маладых бацькоў.

— Прадпрыемства дапамагае і з вырашэннем жыллёвага пытання — дае кватэры і інтэрнаты або кампенсуе арэнду жылля. А каб адаптацыя прайшла паспяхова, за кожным новым спецыялістам замацаваны настаўнік, які суправаджае яго першыя тры месяцы, — падкрэсліла Таццяна Скіба.

Такім чынам, комплексны падыход ААТ «Беллакт» да работы з моладдзю — ад прафесійнай адаптацыі і сацыяльных гарантый да развіцця карпаратыўнай культуры — стварае асяроддзе, дзе маладыя спецыялісты не проста будуюць кар'еру, але і становяцца часткай вялікай згуртаванай каманды. Тут цэняць не толькі працоўныя дасягненні, але і асабісты рост, ствараючы ўсе ўмовы для таго, каб таленавітая моладзь заставалася на прадпрыемстве і рабіла свой унёсак у агульную справу.

**Лізавета ГОЛАД, фота аўтара.**
**Алена ДАЎЖАНОК.**

УНП 500043083

# ЗЯМЛІ НАДЗЕЙНАЯ АПОРА

## Пружанскі раён




# ПАСТУПАЛЬНЫ РУХ НАПЕРАД

**Са старшынёй Пружанскага райвыканкама Міхаілам ГРЫШКЕВІЧАМ напярэдадні свята працаўнікоў аграпрамысловага комплексу гутарым пра важныя надзённыя справы тых, хто працуе на зямлі, і тых, хто перапрацоўвае сельгаспрадукцыю, а таксама пра развіццё аграрнай галіны раёна, складнікі поспеху аграрыяў і не толькі.**



Фота Лізаветы ГОЛАД.

Фота Алены ДАЎЖАНОК.

— Нашу гутарку хацеў бы пачаць са слоў падзякі людзям, якія вырошчваюць хлеб: сядзяць за штурвалам камбайна, кіруюць аўтамабілем, трактарам, — гаворыць Міхаіл Міхайлавіч. — Аддаць даніну пашаны тым, хто працуе на жывёлагадоўчым комплексе, а таксама спецыялістам у галіне раслінаводства, жывёлагадоўлі, эканомікі. Усе яны займаюцца высакароднай справай — кормяць краіну. Работа сельскіх працаўнікоў вельмі нялёгкая, але яны выконваюць яе годна, нягледзячы на любыя капрызы надвор'я, штодня пераадольваюць цяжкасці, якіх хапае, праяўляюць разуменне.

**— Напярэдадні свята звычайна згадваюць працоўныя поспехі, дасягненні, гавораць пра перспектывы...**

— У названым кантэксце працоўнымі поспехамі можна лічыць роўную, стабільную работу гаспадарак і іх калектываў. Усё гэта ёсць. Праўда, збожжавы вал у нас гэтым разам атрымаўся крыху меншы, чым леташні. Вясновыя пагодныя катаклізмы адыгралі сваю негатыўную ролю. Асабліва нашкодзіла пасевам майская засуха. У сувязі з гэтым і нарыхтоўка кармоў пачалася пазней за леташнюю, і на ўборку збожжавых выйшлі крыху пазней. І ўсё ж, да гонару земляробаў, кармоў мы нарыхтавалі не менш, чым у мінулым годзе, кукурузы таксама будзе не менш. Значыць, жывёлагадоўчая галіна атрымае дастатковы запас кармоў, а гэта базіс для работы ў наступным годзе.

**— Давайце пагаворым пра жывёлагадоўлю раёна як крыніцу прыбытку гаспадарак.**

— Варта нагадаць, што жывёлагадоўля з'яўляецца асновай эканомікі кожнай гаспадаркі. Раслінаводства — важная стратэгічная галіна, гэта хлеб, які ўсяму галава. Але хлеб вырошчваюць у гаспадарцы, якая павінна эфектыўна будаваць сваю эканоміку, набываць тэхніку, узводзіць аб'екты, выплачваць прыстойную зарплату работнікам, атрымліваць прыбытак. А прыбытак даюць малако і мяса, для вытворчасці якіх патрэбна кармавая база. Якасная кармавая база з'яўляецца залогам поспеху ў шырокім сэнсе: гарантыяй росту надояў і прываг, здароўя жывёлы, захаванасці і аднаўлення статка і маладняку. Пералічанае нязменна вядзе да росту эканомікі прадпрыемства і дабрабыту яго работнікаў. Кожны кіраўнік цудоўна разумее, што годная зарплата членаў яго калектыву азначае дабрабыт сем'яў, іх агульны настрой.

**— Малако, мяса — гэта, вядома, асноўнае, але гаспадаркі Пружаншчыны займаюцца рознымі кірункамі дзейнасці. Раскажыце, як сёння справы з ураджаем яблыкаў, бульбы?**

— Так, звычайна сады даюць добрую выручку нашым сельгаспрадпрыемствам. Праўда, сёлета садаводам не пашанцавала. Замаразкі пашкодзілі квецень, ураджай атрымаўся значна меншы. Калі раней асноўныя нашы вытворцы яблык, іх у раёне паўдзесятка, закладвалі ў сховішчы па 2-3 тысячы тон пладоў, то цяпер такога няма. І, па ўсім відаць, яблыкі давядзецца зімой есці імпартныя.



Фота Алены ДАЎЖАНОК.

А вось бульба ўрадзіла добра. З гектара атрымалі звыш 300 цэнтнераў клубняў. Мы гатовы не толькі забяспечыць другім хлебам раён, але і прадаць яго таму, хто мае патрэбу. «Ружаны-Агра», «Айчына» паспяхова займаюцца бульбай. І год быў спрыяльны, улічылі недахопы мінулага года — так што бульбы хопіць. У крамах нашага райцэнтра прапаноўваецца выбар ад розных вытворцаў розных сартоў на любы густ.

**— Якое месца ў аграрнай вытворчасці раёна займаюць фермерскія гаспадаркі? Ці ёсць тыя, хто працуе эфектыўна, дэманструе добрыя вынікі?**

— Фермеры ў раёне ёсць. І хоць удзельная вага сялянскіх (фермерскіх) гаспадарак у агульным аб'ёме валавой сельгаспрадукцыі зусім невысокая, многія гаспадаркі працуюць цікава, можна нават сказаць, творча, і заслугоўваюць таго, каб згадаць іх у агульным кантэксце гаворкі аб працаўніках сельскай гаспадаркі. Фермеры займаюцца вырошчваннем збожжавых культур, бульбы, агародніны, садавіны, ягад. Напрыклад «ШаніАгародніна» вырошчваюць капусту, моркву, памідоры вельмі паспяхова. Яны пастаўляюць сваю прадукцыю на ўнутраны рынак, частка ідзе на экспарт.

Хачу згадаць не толькі фермераў, але і вяскоўцаў, якія займаюцца асабістай падсобнай гаспадаркай даволі паспяхова. Што радуе: за апошнія год-два такіх людзей стала больш. Сваю прадукцыю яны прадаюць у Пружанах, Бярозе, Брэсце. Бачыў нашых гаспадароў на рынках з бульбай, памідорамі, баклажанамі, іншай агароднінай, буякамі. Фруктамі цяжэй займацца на невялікім участку, тут патрэбны тэхналогія, спецыяльныя веды. А вось агародніну вяскоўцы навучыліся вырошчваць паспяхова. І заслугоўваюць гэтыя людзі ўсялякай павагі. Яны сваёй працай кормяць сем'і, ствараюць уласны дабрабыт і прыносяць карысць людзям. На восеньскіх кірмашах яны таксама былі прадстаўлены.

**— Як прайшлі восеньскія кірмашы?**

— Кірмашы традыцыйна праводзіліся ў вялікіх населеных пунктах Ружанах і Шарашэве, адбыўся таксама раённы кірмаш «Пружанская восень». Акрамя таго, нашы прадпрыемствы, арганізацыі, фермеры, гаспадары ўдзельнічалі ў аналагічных мерапрыемствах абласнога цэнтра, суседніх райцэнтраў. Гэта вельмі патрэбная кампанія: у чалавека ёсць магчымасць набыць прадукцыю, зрабіць запасы на зіму. Найбольшым попытам на кірмашах карысталіся агародніна і садавіна, прадавалі шмат бульбы. Сельскія жыхары куплялі збожжа для падсобнай гаспадаркі. У гэтых кірмашах ёсць элементы фестывалю, абавязковая культурная праграма. Людзі прыходзяць сюды адпачыць, купіць сельгаспрадукцыю і нешта смачнае, асобныя нашы сельгаспрадпрыемствы прадаюць мясныя паўфабрыкаты высокай якасці па даступных цэнах. Адным словам, восеньскія кірмашы ўдаліся.

**— Не варта забываць, што святкаваць прафесійнае свята 16 лістапада будуць таксама прадпрыемствы перапрацоўчай прамысловасці. Хацелася б пачуць пра вашых флагманаў гэтай галіны.**

— Так, сапраўды, нашымі перапрацоўшчыкамі ёсць нагода ганарыцца. І льнозавод, і малочны камбінат, і камбінат кааператыўнай прамысловасці, і райаграсэрвіс, які займаецца абслугоўваннем сельгаспрадпрыемстваў, працуюць даволі паспяхова. Напрыклад, ільнозавод сёлета павялічыў аб'ёмы нарыхтоўкі льнотрасты. Першымі ў краіне завадчане завяршылі ўборку лёну і дапамаглі многім аналагічным прадпрыемствам. На нашым малочным камбінаце вядзецца далейшая мадэрнізацыя, мэтай якой з'яўляецца павелічэнне выпуску прадукцыі. А для таго каб забяспечваць завод сыравінай у перспектыве (Пружанскі раён, дарэчы, пастаўляе малако не толькі на свой камбінат, але і на Кобрынскі масларобна-сыраробны камбінат, і на ААТ «Савушкін прадукт»), трэба павялічваць вытворчасць малака на дзеючых фермах і комплексах за кошт росту прадукцыйнасці грамадскага статка. Такім чынам, па лагічнаму ланцужку разважанняў мы зноў звяртаемся да нашых сельгаспрадпрыемстваў. Любая гаспадарка мае перспектыўныя планы: прадпрыемства павінна развівацца, стаяць на месцы не выпадае. Застой азначае рэгрэс — рух назад, а прагрэс — гэта рух наперад. Рост прадукцыйнасці малочнага статка мае шмат складнікаў, гэта не толькі рост надояў, але і захаванасць статка, укараненне і ўдасканаленне тэхналогій утрымання і кармлення і гэтак далей. Над пералічаным працуюць спецыялісты. Кірункі вызначаны, галоўны з якіх — паступальны рух наперад.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**

# «ЯСЛІ» ДЛЯ БУЛЬБЫ

## На доследнай станцыі ствараюць новыя сарты з прабіркі і даводзяць да кандыцыі тэхналогіі вырошчвання

У Пружанах працуе знакавая для айчыннай сельгаснавукі ўстанова — Брэсцкая абласная сельскагаспадарчая доследная станцыя Нацыянальнай Акадэміі навук Беларусі. Больш за паўстагоддзя вучоныя, аграномы станцыі шчыруюць над стварэннем новых сартоў і вытворчасцю насення, а таксама асвойваюць новыя тэхналогіі, удасканальваюць метадыкі навукова-тэхнічнай дзейнасці.

На бачным месцы ў памяшканні станцыі змешчаны стэнд са словамі, якія калектыў узяў сабе за дэвіз: «Мы захоўваем прыгажосць прыроды ў кожным вырашчаным зярнятку». Працуе тут крыху больш за 70 чалавек, у іх ліку тры кандыдаты навук, старшыя навуковыя супрацоўнікі, навуковыя супрацоўнікі, малодшыя навуковыя супрацоўнікі, спецыялісты-аграномы. Станцыя складаецца з чатырох структурных падраздзяленняў.



Малодшы навуковы супрацоўнік Вольга ІВАНОВА вывучае прабірачныя расліны суніц садовых.

**Дырэктар установы, кандыдат навук, дацэнт Уладзімір ЦІМОШЧАНКА** расказаў аб навуковай рабоце станцыі, накіраванай на распрацоўку новых і ўдасканаленне існуючых тэхналогій вырошчвання сельгаскультур, стварэнне новых сартоў: «Мы працуем па вялікаму спектру культур, пачынаючы са збожжавых і заканчваючы пладовымі культурамі. Раслінагадоўчы кірунак падразумявае работу ў полі і дапрацоўку насеннага матэрыялу, святая святых якога — лабараторыя, што праводзіць усебаковы аналіз матэрыялу на ўсіх этапах — працягвае Уладзімір Рыгоравіч. — Аддзел пладаводства складаецца з вытворчага саду і пітомніка, дзе гадуюцца саджанцы, а таксама пладаводчай лабараторыі, дзе мы атрымліваем расліны суніцы, ажыны, буякоў, а яшчэ расаду агароднінных культур. Аддзел бульбаводства — гэта вытворчыя пасевы плюс мікраклanальная лабараторыя размнажэння бульбы».

Пра бульбу па нашай просьбе дырэктар расказвае больш падрабязна: «Спачатку мы атрымліваем расліну ў прабірцы, далей высаджваем гэту бульбіну ў цяпліцы, затым — у полі і атрымліваем чысты аздароўлены матэрыял. На стадыі росту ў цяпліцы важныя паліў і частыя апрацоўкі. Апрацоўваецца гэты матэрыял удвая больш, чым у палявых умовах, бо ўся тая бульба ідзе на размнажэнне. Цяпліцы ў нас называюць «яслямі» для бульбы. Калі ў полі бульбу лічаць у кілаграмах альбо ў цэнтнерах, то тут — у штуках, бо гэта каштоўны матэрыял — ранняе дзяцінства новага сорту. Адсюль і назва — «яслі». Тут парасткі бульбачкі даглядаюць, гадуюць, як тое немаўля, і расце яна да кастрычніка, каб найбольш завязалася клубняў, каб яны набраліся сіл. Адзін такі кусцік з прабірачнай расліны здольны даць 8-9 клубняў. Потым яны будуць высаджаны ў полі, у гадавальніку для папярэдняга размнажэння. Там ужо бульба пройдзе этап сталення, яе пасадзяць саджалкай, выкапаюць камбайнам, адвязуць на сартавальны пункт і накіруюць у сховішча. А на наступны год яе пасадзяць і атрымаюць арыгінальны насенны матэрыял, які будзе рэалізаваны гаспадаркам, фермерам, насельніцтву — пакупнікам. Увесь шлях ад прабіркі да гаспадаркі займае прыкладна пяць гадоў».



Дырэктар Уладзімір ЦІМОШЧАНКА на цяплічным комплексе.

Кожная культура вырошчваецца па сваёй тэхналогіі. Напрыклад, аддзел кормавытворчасці атрымлівае насенне шматгадовых траў, кукурузы, рапсу. Збожжавая група таксама вялікая: азімая пшаніца, жыта, трыцікале, азімы ячмень, ёсць крупяныя культуры. На станцыі выпрабоўваюць новыя культуры, нешта дадаюць, удасканальваюць і накіроўваюць у вытворчасць. Асаблівая старонка — пладаводства. Установа пастаўляе спажыўцу саджанцы самых розных культур.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**
**Фота Лізаветы ГОЛАД.**

# КУЗНЯ АГРАРНЫХ КАДРАЎ





Пружанскі аграрна-тэхнічны каледж, які два гады таму адзначыў сваё 70-годдзе, вядомы не толькі ў Пружанах і ваколіцы. З яго сцен выйшлі многія кіраўнікі прадпрыемстваў аграпрамысловага комплексу краіны, спецыялісты, навукоўцы. І ў раёне працуе вельмі шмат яго выпускнікоў.

**Дырэктар навучальнай установы Дзмітрый ЧАЙКОЎСКІ** ў свой час таксама скончыў названы каледж, а потым, як і многія выпускнікі, прадоўжыў адукацыю. Дзмітрый Уладзіміравіч расказвае, што ў 1953 годзе Пружанскі тэхнікум механізацыі сельскай гаспадаркі быў створаны рашэннем Савета Міністраў СССР. Пачыналі з чатырох аўдыторый у прыстасаваным будынку і невялікага інтэрната. Цяпер па стане матэрыяльна-тэхнічнай базы, узроўню падрыхтоўкі спецыялістаў Пружанскі дзяржаўны аграрна-тэхнічны каледж адпавядае самым сучасным стандартам. Маецца чатыры вучэбныя карпусы, чатыры інтэрнаты, якімі забяспечаны ўсе навучэнцы, лабараторыя, вучэбна-вытворчая майстэрня, добры тэхнічны парк, доследнае поле.

Тут навучаецца каля тысячы юнакоў і дзяўчат па розных спецыяльнасцях, 770 з іх займаюцца на дзённым аддзяленні, астатнія — на завочным. З каледжа выходзяць спецыялісты сярэдняга звяна ў галіне механізацыі, энергетыкі, раслінаводства. Два гады таму да ранейшых дабавілася спецыяльнасць — арганізатар сельскагаспадарчай вытворчасці, а сёлета пачала навучанне група будучых тэхнікаў у справе папярэджання і ліквідацыі надзвычайных сітуацый. Выпускнікоў каледжа накіроўваюць у гаспадаркі Брэсцкай і суседніх абласцей. Попыт на іх заўсёды ёсць.

Паводле слоў дырэктара, навучальны і выхаваўчы працэсы забяспечвае дружны калектыў выкладчыкаў і супрацоўнікаў. Навучэнцы маюць магчымасць удзельнічаць у самых розных мерапрыемствах, займацца справай па душы ў гуртках і секцыях. Каледж мае надзвычай добрую базу для гісторыка-асветніцкага і патрыятычнага выхавання. Гаворка ідзе найперш пра музей баявой славы. Экспазіцыя была створана ў 1974 годзе, а ўжо праз год, па выніках перамогі ва Усесаюзным конкурсе, музей атрымаў званне народнага. У экспазіцыі ёсць асабістыя рэчы маршалаў Савецкага Саюза Жукава, Ракасоўскага, Якубоўскага. За гады работы музей наведалі дзясяткі тысяч чалавек.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**
**Фота Лізаветы ГОЛАД.**

# І ФРУКТЫ, І ЯГАДЫ

## Фермерская гаспадарка «Тытул-Агра» — адна са старэйшых і самых паспяховых у Пружанскім раёне. Больш за 20 гадоў таму яе стварыў Сяргей ГЛУШЧАНКА.

Цяпер на 130 гектарах зямлі фермер займаецца пладова-ягаднымі культурамі. Участак у 15 гектараў адведзены пад сад, на 70 гектарах вырошчваюцца чорныя парэчкі, маецца 3 гектары садовых суніц, а яшчэ гадуюцца і рэалізуюцца саджанцы чорных парэчак. «Тытул-Агра» — буйны вытворца ягад чорных парэчак у нашай краіне. Для іх вырошчвання ёсць уся неабходная тэхніка, у тым ліку цэлы арсенал уласных распрацовак. Фермерская гаспадарка працуе эфектыўна, попыт на яе прадукцыю трымаецца высокі.

**Яна СВЕТАВА.**
**Фота Лізаветы ГОЛАД.**



Кіраўнік сялянскай фермерскай гаспадаркі «Тытул-Агра» Сяргей ГЛУШЧАНКА на гадавальніку саджанцаў парэчак чорных.

Фота Алены ДАЎЖАНОК.

# ААТ «Шані-аграпрадукт»: ГАСПАДАРКА, СКІРАВАНАЯ Ў БУДУЧЫНЮ



Збожжасховішча.

ААТ «Шані-аграпрадукт» — шматпрофільнае прадпрыемства, якое паспяхова спалучае мяса-малочную жывёлагадоўлю з вырошчваннем збожжа, буракоў і рапсу. Аднак яго місія не толькі ў развіцці палёў і ферм. Гаспадарка актыўна ўдзельнічае ў жыцці аграгарадка Шані, узяўшы на сябе ролю не толькі работадаўцы, але і сацыяльнага партнёра, які ўкладваецца ў добраўпарадкаванне і культурны адпачынак землякоў. Але пра ўсё па парадку.


Будаўніцтва новага зернесушыльнага комплексу.

## У ПАСТАЯННЫМ РАЗВІЦЦІ

— Мы бясконца ў руху: будуем, рэканструюем, мадэрнізуем, — заявіў **дырэктар ААТ «Шані-аграпрадукт» Аляксандр ЯКІМАВЕЦ.** — Гэта наша правіла, наш прынцып.

Яго словы знаходзяць пацвярджэнне ў фактах: за два гады тут пабудавалі два склады збожжасховішча, цяпер актыўна вядзецца будаўніцтва і рэканструкцыя розных стратэгічных аб'ектаў гаспадаркі, сярод якіх ЗСК-60 і новы комплекс на 900 галоў.

Але развіццё — гэта не толькі новыя сцены. Штогод тут укладваюць каля 10 мільёнаў рублёў у абнаўленне матэрыяльна-тэхнічнай базы.

— Гэта як тэхніка, так і абсталяванне. З апошняга: мы закупілі малочныя станкі-ахаладжальнікі і сістэму стварэння мікраклімату на МТК. Таксама мы лічым важным укладвацца і ў інфраструктуру: нядаўна завяршылі маштабную рэканструкцыю майстэрняў. Цяпер у нас новы дах і добраўпарадкаваная тэрыторыя. Гэта стварае зусім іншую культуру працы, — падзяліўся Аляксандр Якімавец.

Варта адзначыць і тое, што гаспадарка актыўна мадэрнізуе не толькі свае аб'екты, але і аграгарадок Шані.

— Цяпер жыхары і госці могуць адпачываць на абноўленым пляжы з новай валейбольнай пляцоўкай. Да таго ж мы правялі капітальны рамонт ключавых сацыяльных аб'ектаў: будынкаў «Белпошты», ФАПа, сельскага клуба-бібліятэкі і сталовай. Але не проста абнавілі фасады — мы падарылі аграгарадку новае аблічча, упрыгожыўшы сцены маляўнічымі мураламі, якія дадаюць вуліцам сучаснага мастацтва і каларыту, — падзяліўся дырэктар.

Перамянілася і спартыўная інфраструктура: на воркаўт-пляцоўцы з'явіліся новыя элементы для трэніровак, а пешаходныя дарожкі і вуліцы аграгарадка сталі больш камфортныя дзякуючы асфальтаванню.

Дырэктар расказаў, што ў Шанях сёлета былі праведзены раённыя «Дажынкі».

— У нашым аграгарадку пастараліся ўзнавіць усю паўнату і размах абласнога свята, захаваўшы яго найлепшыя традыцыі, але ўвасобіўшы іх у больш камерным, па-сямейнаму ўтульным фармаце, — падкрэсліў Аляксандр Якімавец.


Бескантактавая мыйка на тэрыторыі мехдвара.

## МАЛОЧНЫЯ РЭКОРДЫ


Галоўны заатэхнік Дзмітрый ЧАРНЯК, начальнік МТК «Каштанаўка» Людміла БЯЛОВА і заатэхнік-селекцыянер Вольга КАРУНАС абмяркоўваюць працэс выпойвання цялят.

Аснову жывёлагадоўчай галіны гаспадаркі складаюць чатыры буйныя малочнатаварныя комплексы і адна малочнатаварная ферма. На гэтых сучасных прадпрыемствах знаходзіцца дойны статак колькасцю 2500 галоў высокапрадукцыйнай жывёлы.

Як адзначыў **галоўны заатэхнік Дзмітрый ЧАРНЯК**, калектыў прадпрыемства прыкладае максімум намаганняў для стабільнага і эфектыўнага развіцця гэтага кірунку.

— Мы робім усё магчымае, каб жывёлагадоўля заставалася высокарэнтабельнай галіной нашай гаспадаркі, яна цяпер дынамічна развіваецца і дае стабільна высокія вынікі, — падкрэсліў ён.

Так, прырост валавага надою малака да мінулага года склаў 105,8 %.

Разам з галоўным заатэхнікам мы адправіліся на малочнатаварны комплекс «Каштанаўка», дзе нас сустрэла **начальнік МТК Людміла БЯЛОВА.** Яна з задавальненнем падзялілася ўражальнымі вытворчымі вынікамі. Паводле яе слоў, комплекс, разлічаны на ўтрыманне 400 галоў дойнага статка, дэманструе стабільны рост надояў.

— Сутачны надой на адну карову складае 31,8 л. За дзевяць месяцаў валавы надой на кожную карову дасягнуў 9200 кг. Гэта на 400 кг больш, чым за аналагічны перыяд мінулага года, — адзначыла Людміла Бялова.

Значны ўнёсак у дасягненне такіх паказчыкаў робіць і пастаянная мадэрнізацыя комплексу. Нядаўна па ініцыятыве дырэктара ў кароўніках былі ўсталяваны новыя сістэмы мікраклімату. Гэта простае, але эфектыўнае рашэнне дазволіла стварыць больш камфортныя ўмовы для жывёл, што наўпрост адбіваецца на іх здароўі і прадукцыйнасці.



Сістэма мікраклімату ў будынку асноўнага статка МТК «Гарадзечна».


Начальнік МТК «Гарадзечна» Іван РУЛІНСКІ каля прафілакторыя для цялят.

## АСНОВА ЎРАДЖАЮ

**Намеснік дырэктара па раслінаводстве Аляксандр СКРЫПКО** правёз нас па палетках гаспадаркі, правёў майстар-клас, як правяраць рост і развіццё азімага рапсу і паказаў участкі, дзе праводзяць доследы.

— Агульная зямельная плошча гаспадаркі — 8621 га, з іх сельскагаспадарчыя ўгоддзі — 7502 га. Ралля ў нас на плошчы 4600 га, астатняе займаюць лугавыя ўгоддзі на плошчы 2932 га, — падзяліўся ён.

Паводле яго слоў, галіна раслінаводства ў гаспадарцы сарыентавана ў першую чаргу на тое, каб належным чынам нарыхтаваць высакаякасныя кармы для жывёлагадоўлі.

— Гэты год быў няпросты. З 27 красавіка да 23 мая на нашых палетках адзначаліся штодзённыя начныя замаразкі. Гэта вельмі негатыўна паўплывала на ўраджай збожжавых культур, з-за чаго іх сярэдняя ўраджайнасць склала 38,5 ц/га.

У ААТ «Шані-аграпрадукт» ужо праведзена пасяўная і закладзены ўраджай 2026 года. На плошчы 1350 га было пасеяна 950 га азімага трыцікале і 400 га азімай пшаніцы.

— У той жа час на плошчы 200 га закладзены насеннікі гэтых культур. Яны закладваюцца для таго, каб мы мелі свой насенны матэрыял на наступны год. Дарэчы, сёлета закуплены 4 новыя сарты: з іх два — пшаніцы і два — трыцікале для сортазмены гаспадаркі, а таксама закуплены яшчэ адзін сорт першай рэпрадукцыі для абнаўлення. Мы заўжды спрабуем нешта новае, — адзначыў Аляксандр Скрыпко.

На прадпрыемстве таксама працуюць з мінеральнымі і арганічнымі ўгнаеннямі пад кожную культуру. У гаспадарцы ёсць спецыяльныя палі для правядзення доследаў.

— Мы адкрыты для ўсіх. Да нас прыязджаюць фірмы, прапануюць свой матэрыял, а мы ім даем сваё поле. Я лічу, што за гэтым будучыня. Мы эканомім сродкі, спрабуем атрымаць найвышэйшую ўраджайнасць належнай якасці. І для гэтага важна супрацоўнічаць з іншымі, спрабаваць наваўвядзенні ў сябе ў вытворчасці. Толькі праз досвед мы зможам даведацца, ці правільна працуюць гэтыя прэпараты і ці ў правільным кірунку мы рухаемся, — заявіў намеснік дырэктара па раслінаводстве.


Намеснік дырэктара па раслінаводстве Аляксандр СКРЫПКО правярае рост і развіццё азімага рапсу.

Ужо былі праведзены доследы па рапсе, цукровых буракагх і ўгнаеннях. Па іх выніках перыядычна праводзяцца міжнародныя навукова-практычныя семінары. За апошні год у гаспадарцы былі прадстаўнікі Іспаніі і Кітая.

Цікава было больш даведацца і пра самога Аляксандра Скрыпко. Ён працуе ў гаспадарцы каля года. Першапачаткова прыйшоў на пасаду аграномахіміка і дарос да намесніка дырэктара па раслінаводстве.

— Агульны стаж работы ў аграноміі ў мяне 8 гадоў. У ААТ «Шані-аграпрадукт» мяне ўсё задавальняе: годны заробак, дом, дружны калектыў... Пераехаў сюды з Маларыты разам з сям'ёй. Жонка таксама працуе ў нашай гаспадарцы раздатчыкам ежы ў сталовай: возіць абеды па палях, — падзяліўся ён.

Такая асабістая гісторыя — яскравае адлюстраванне кадравай палітыкі гаспадаркі, дзе шануюць ініцыятыўных спецыялістаў і ствараюць усе ўмовы, каб яны заставаліся тут жыць і працаваць.


Брыгада работнікаў на нарыхтоўцы кармоў.
Злева направа: вадзіцель Аляксандр БЯЛЯЕЎ, трактарысты-машыністы Максім ІВАШКІН, Іван МЯЛКОЎСКІ, Раман КАРАЧУН і камбайнер Аляксандр МАКАРУК.




## ГАЛОЎНАЯ КАШТОЎНАСЦЬ — ЛЮДЗІ

У ААТ «Шані-аграпрадукт» упэўнены: аснова поспеху — гэта не толькі сучасныя тэхналогіі, але і людзі Калектыў, у якім больш як 300 супрацоўнікаў, — галоўная каштоўнасць прадпрыемства. Тут ствараюць усе ўмовы для іх дабрабыту і ўпэўненасці ў заўтрашнім дні.




Комплексная сістэма падтрымкі ўключае ў сябе рэгулярную фінансавую дапамогу. Работнікі могуць разлічваць на матэрыяльнае садзейнічанне ў найважнейшых і часам цяжкіх жыццёвых сітуацыях: пры нараджэнні дзяцей, заключэнні шлюбу, лячэнні і не толькі.

Асаблівая ўвага ўдзяляецца вырашэнню жыллёвага пытання.

— Мы даём супрацоўнікам службовае жыллё, — тлумачыць **спецыяліст па ідэалагічнай рабоце Алена ПАКАЛА**. — А калі такой магчымасці няма, то кампенсуем значную частку выдаткаў на арэнду жылля.

Стратэгічным кірункам з'яўляецца прыцягненне і замацаванне маладых спецыялістаў. Дзеля гэтага ў гаспадарцы дзейнічае эфектыўная праграма матывацыі. Маладыя спецыялісты заатэхнічнай і ветэрынарнай службаў, якія заключылі кантракт, пасля пяцігадовай работы атрымліваюць аднаразовую выплату ў памеры 200 базавых велічынь. Пры паўторным падпісанні кантракта на наступныя 5 гадоў іх чакае яшчэ больш істотны бонус — 300 базавых велічынь.

Клопат аб камандзе выходзіць за рамкі працоўнага працэсу. Прадпрыемства поўнасцю аплачвае маладым кадрам абанементы ў аквапаркі, лядовыя палацы і іншыя спартыўныя ўстановы, падтрымліваючы такім чынам не толькі прафесійны рост, але і здароўі, актыўны лад жыцця.


Будынак пошты.


Спецыяліст па ідэалагічнай рабоце Алена ПАКАЛА дэманструе добраўпарадкаванне зоны адпачынку «Гародаўка».



Сталовая гаспадаркі.


Фельчарска-акушэрскі пункт.

УНП 200026194

**Лізавета ГОЛАД, фота аўтара.**




Памочнік камбайнера Аляксандр КАЛЕСНІКОВІЧ і камбайнер Мікалай СКІБІНСКІ на ўборцы кукурузнага збожжа.

Дарагія калегі! Сардэчна віншую з

**Днём работнікаў сельскай гаспадаркі і перапрацоўчай прамысловасці!**

*Ад усёй душы дзякую кожнаму за самаадданую працу, любоў да зямлі і нашай агульнай справы. Дзякуючы вашым рукам, ведам і стараннямААТ «Жураўлінае» расце і развіваецца.*

*Жадаю вам моцнага здароўя, багатых ураджаяў, упэўненасці ў заўтрашнім дні і дабрабыту вашым сем'ям. Няхай праца заўсёды ў радасць, а зямля адказвае шчодрасцю!*

**Дырэктар ААТ «Жураўлінае» Аляксандр ПІШЧ.**



Фота з архіва прадпрыемства.

# ААТ «Жураўлінае»: РЭКОРДЫ НА ПАЛЯХ І ФЕРМАХ



За 25 кіламетраў ад Пружан, у аграгарадку Клепачы, размясцілася шматгаліновая гаспадарка ААТ «Жураўлінае». Вырошчванне буйной рагатай жывёлы, свіней, вытворчасць малака, збожжа, кармоў, насення рапсу, пладоў — усім тут займаюцца сапраўдныя прафесіяналы, якія з упэўненасцю прымаюць сучасныя выклікі і паспяхова ідуць да добрых вынікаў. Мы пабывалі на прасторах гаспадаркі і расказваем, чым цяпер жыве ААТ «Жураўлінае».

## НА ПРАСТОРАХ ПАЛЁЎ

У аснове поспеху аграрнага прадпрыемства ляжаць дакладны разлік і вернасць традыцыям. Больш за 16 тысяч гектараў сельскагаспадарчых угоддзяў — вось надзейны падмурак, на якім будуецца вытворчы ланцужок гаспадаркі.

— Асноўная спецыялізацыя ў раслінаводстве — вытворчасць збожжа і кармоў для забеспячэння пагалоўя свіней і БРЖ трывалай кармавой базай, — падзяліўся **дырэктар Аляксандр ПІШЧ.**

Паводле яго слоў, сёлета работнікі гаспадаркі заслужылі асабліва высокую ацэнку.

— У няпростых і нават экстрэмальных умовах надвор'я яны змагаліся за кожны вырашчаны колас, за кожнае зярнятка. Сёлета ў засекі таварыства паступіла 26 445 тон збожжавых і зернебабовых культур у бункернай вазе. Гэта значны рост — на 947 тон вышэй за паказчык 2024 года і на 17,6 % або на 3 960 тон больш за валавы збор 2023-га. Рэкордны ўраджай — гэта не толькі нагода для гонару, але і стымул для далейшага развіцця, — падкрэсліў дырэктар гаспадаркі.

Уборка збожжавых і зернебабовых культур, а таксама рапсу агульнай плошчай пасеваў у 5 430 гектараў заняла паўтара месяца. На хлебародных палях гаспадаркі працавалі 16 збожжаўборачных камбайнаў, з іх 11 перавысілі намалот у 1000 тон збожжа, 3 — намалацілі 2 000 тон, а 2 экіпажы пераадолелі трохтысячную мяжу.



Аператар працэсу апрацоўкі збожжа Дзмітрый ТАРАСЕВІЧ.

Так, ужо на трэці дзень уборачнай кампаніі работнікі ЗСК-50 прымалі віншаванні за першую прасушаную тону збожжа не толькі ў сваёй гаспадарцы, але і ў раёне.

— Уражвае і дасягненне экіпажа камбайнераў Міхаіла Фядотава і Мікалая Бірука. Яны задалі новы стандарт ва ўборачнай кампаніі, сталі першымі, хто змог намалаціць 1 000 тон збожжа ў Брэсцкай вобласці, а затым, не спачываючы на лаўрах, першымі ў вобласці дасягнулі спачатку 2 000, а затым і 3 000 тон, — адзначыў Аляксандр Пішч.

Сярод перадавікоў гэтай уборачнай — маладзёжны экіпаж камбайнераў, які складаецца з Віталя Сіманюка, Станіслава Мазіна. Яны таксама пераадолелі знакавую мяжу ў 1 000 тон намалочанага збожжа. Сярод найлепшых і малады вадзіцель Аляксандар Крэйдзіч, які першым на Брэстчыне перавёз ад камбайнаў як тысячу, так і дзве тысячы тон збожжа.

Поспехі гаспадаркі ацэнены па заслугах. Так, па выніках раённага спаборніцтва на ўборцы ўраджаю збожжавых і зернебабовых культур у 2025 годзе ААТ «Жураўлінае» прызнана пераможцам сярод сельскагаспадарчых і іншых арганізацый, якія забяспечылі дасягненне найвышэйшых паказчыкаў тэмпаў росту валавога збору збожжа да сярэдняга ўзроўню трох гадоў з улікам вытворчасці збожжа на адзін бал.

— Нашы работнікі таксама занялі прызавыя месцы: сярод старэйшых камбайнераў маладзёжных экіпажаў першае месца заняў Аляксандр Кавелька, другое — Віталь Сіманюк. Сярод маладых вадзіцеляў другое месца заняў Аляксандр Крэйдзіч. Першае месца сярод звенняў аператараў зернесушыльных комплексаў занялі аператары ЗСК-50 аграгарадка Мокрае, а другое — аператары ЗСК-37 аграгарадка Клепачы. Усё гэта не проста лічбы, а сведчанне адданасці справе, майстэрства і любові да роднай зямлі, — заключыў дырэктар гаспадаркі.




Калектыў адміністрацыі гаспадаркі. Ніжні шэраг злева направа: бухгалтар Яна БАРЫСЕЎСКАЯ, спецыяліст па кадрах Алена РЭЧЫЦ, вядучы эканаміст Нэлі РАЎНЕЙКА, галоўны эканаміст Тамара САКАЛОЎСКАЯ, бухгалтары Таццяна КАРПЕШ і Кацярына КАВЕЛЬКА. Сярэдні шэраг злева направа: дыспетчар Таццяна ПСТЫГА, намеснік галоўнага бухгалтара Юлія КОБАК, галоўны бухгалтар Алена РАЎНЕЙКА, сакратар прыёмнай Юлія СІДАРКЕВІЧ, бухгалтар Яна КАРУНАС, вядучы спецыяліст па кадрах Ірына ПРЫТУЛЬЧЫК, старшыня прафсаюзнага камітэта Таццяна МАКСІМОВІЧ. Верхні шэраг злева направа: начальнік сектара маркетынгу Алеся СЦЕПАНЧУК, спецыяліст па кадрах Ігар ПАШКЕВІЧ, спецыяліст па арганізацыі закупак Наталля ГРЫШКЕВІЧ, бухгалтар Максім ГАЛУЗА.



Начальнік прамысловага сада Юлія КУГАЧ у садзе «Янаўцы».

## АДБОРНЫЯ ЯБЛЫКІ

Адна з сапраўдных жамчужын ААТ «Жураўлінае» — прамысловы сад інтэнсіўнага тыпу. Гэта не проста вытворчая пляцоўка, а вельмі маляўнічае месца, асабліва ў пару цвіцення. Раскінуўшыся на 173 гектарах, ён нагадвае парк, дзе стройнымі радамі стаяць тысячы пладовых дрэў.



Фруктасховішча вёскі Янаўцы.

Пра тое, як тут кіпіць работа, расказвае **начальнік прамысловага сада Юлія КУГАЧ:**

— Наша ключавая задача — не проста падтрымліваць узровень вытворчасці, а пастаянна нарошчваць аб'ёмы і якасць яблыкаў. Для гэтага штогод праводзім цэлы комплекс агратэхнічных мерапрыемстваў па амаладжэнні і абнаўленні саду. Зямля не церпіць прастою, мы заўсёды ў працэсе развіцця.

І гэта не проста словы. У 2023 годзе тут заклалі новы сад на плошчы 9 гектараў і літаральна «абнавілі» яму інфраструктуру: правялі кропельнае арашэнне, усталявалі сучасныя апорныя канструкцыі.

Восенню 2024 года гаспадарка таксама прадоўжыла агратэхнічныя мерапрыемствы па амаладжэнні саду: на плошчы 21 гектар былі высаджаны новыя дрэвы па самай сучаснай, інтэнсіўнай і ўшчыльненай схеме, што дае магчымасць максімальна эфектыўна выкарыстоўваць кожны кавалачак зямлі.

Юлія Кугач падзялілася планамі на будучыню:

— У гэтым годзе мы працягваем работы па абнаўленні саду яшчэ на 20 гектарах. Усе саджанцы старанна адабраны і закуплены.

І каб шчодры ўраджай не загінуў, па суседстве з садам, у вёсцы Янаўцы, пабудавана сучаснае фруктасховішча. Яго магутнасцяў хапае, каб адначасова захаваць у ідэальнай свежасці да 3 000 тон сакавітых яблыкаў.

## ДАСЯГНЕННІ ФЕРМ І НОВЫЯ РУБЯЖЫ

У гаспадарцы дзейнічаюць 9 сучасных жывёлагадоўчых комплексаў на больш чым 15 тысяч галоў.

— Лічбы ў нас пераканаўчыя, — з гонарам дзеліцца **галоўны эканаміст Тамара САКАЛОЎСКАЯ.** — Наш дойны статак — 6 500 кароў. Штодзень яны даюць нам звыш 170 тон малака. Па выніках дзевяці месяцаў ужо атрымалі 47,3 тысячы тон малака. Гэта на 5,7 % больш, чым у мінулым годзе.

Каб убачыць передавы досвед на свае вочы, адправіліся на МТК «Клепачы», які ўжо некалькі гадоў запар б'е ўсе рэкорды. Яго **кіраўнік Вольга СЕВАСЦЬЯНЧЫК** расказала нам аб поспехах:

— Яшчэ тры гады таму мы радаваліся надою ў 7,9 тысячы кілаграмаў ад каровы. Цяпер па выніках толькі дзевяці месяцаў лічба падскочыла да 8,7 тысячы кілаграмаў. Для нас гэта велізарны крок — цэлых 7 цэнтнераў з кожнай каровы ў параўнанні з мінулым годам!

Клапоцяцца тут і аб самых малых насельніках комплексу — сярэднясутачнае прыбаўленне ў вазе цялят складае 928 грамаў.

На іншым «фронце» — у свінагадоўлі — таксама кіпіць не менш маштабная раота. Свінагадоўчы комплекс у аграгарадку Клепачы і ферма-матачнік у вёсцы Казлы — гэта вотчына 87 спецыялістаў.

— Свінапагалоўе на 1 кастрычніка складае 16 913 галоў, — падзялілася Тамара Сакалоўская. — Цяпер мы актыўна працуем над павелічэннем гэтага паказчыка. Наша мэта — выйсці на адзнаку ў 38 тысяч галоў да канца 2026 года.




Калектыў работнікаў МТК «Клепачы».
Злева направа: аператары па доглядзе цялят ад 0 да 3 Ульяна ГРЫНЧАНКА і Кацярына ХОМІЧ, слесар Аляксей СЕРАБРАННІКАЎ і начальнік комплексу Вольга СЕВАСЦЬЯНЧЫК.




Галоўны інжынер Антон РЫБАЧОК дэманструе тэрыторыі рамонтных майстэрняў у аг. Клепачы.



Гаспадарка прапануе паслугі гасцінічнага комплексу «Мікалаеўскі» ў вёсцы Мокрае.

## МАДЭРНІЗАЦЫЯ І КЛОПАТ АБ ЛЮДЗЯХ

Вялікую ўвагу ў ААТ «Жураўлінае» ўдзяляюць і своечасовай мадэрнізацыі ўсіх кірункаў гаспадаркі. Падрабязней пра гэта расказаў Аляксандр Пішч:

— Для ўтрымання маладняку буйной рагатай жывёлы да 3-месячнага ўзросту ўведзена ў эксплуатацыю чатыры падстрэшшы з адначасовым утрыманнем 1109 галоў цялят, таксама ўведзены навес для сухастойных кароў на 100 галоў на МТК «Белавусаўшчына». У жніўні пачалі будаўніцтва навеса для цялят на МТК «Клепачы» на 350 галоў, ідуць работы па будаўніцтве прыбудовы да ветпункта з забойнай пляцоўкай на МТК «Сухопаль», праведзена добраўпарадкаванне машынных двароў у аграгарадках Белавусаўшчына і Мокрае.

— Мы актыўна абнаўляем машынна-трактарны парк. Усяго за перыяд са студзеня 2024 года па верасень 2025-га інвесціравана ў асноўны капітал 46,9 мільёна рублёў, у тым ліку для набыцця машын, абсталявання і транспартных сродкаў — 22,3 мільёна рублёў, — падкрэсліў дырэктар гаспадаркі.

Тут таксама імкнуцца стварыць максімальна камфортныя ўмовы для сваіх супрацоўнікаў. У кіраўніка заўсёды на першым месцы пытанні, якія закранаюць жыллёвыя ўмовы работнікаў, узровень заработнай платы, забяспечанасць харчаваннем і аздараўленне. Аляксандр Пішч перакананы, што галоўная каштоўнасць «Жураўлінага» — гэта людзі.

— Усе нашы дасягненні — заслуга работнікаў гаспадаркі. Важную ролю адыгрывае спалучэнне каласальнага вопыту ветэранаў сельскай гаспадаркі і энергіі моладзі, — заключыў ён.



Ферма-матачнік у вёсцы Казлы на 1500 галоў свінаматак.

**Лізавета ГОЛАД, фота аўтара. Алена ДАЎЖАНОК.**

УНП 200026087



Здымшчык валакна Тамара ТОПНІКАВА і аператар доўгай лініі Ганна МУРЫНОВІЧ на першаснай перапрацоўцы льнотрасты.




У фае Пружанскага льнозавода першай наведвальнікаў сустракае... сімпатычная льняная «дзяўчына». У руках яна трымае сноп лёну, перавязаны стужкай, на якой пазначана — 15 тысяч тон. І гэта не проста лічба, а адзін з галоўных вынікаў года. Менавіта столькі льнотрасты сабралі сёлета з палёў заводскія земляробы. І менавіта такая колькасць патрэбна для максімальнай загрузкі вытворчасці на цэлы год стабільнай работы. Цэх перапрацоўкі трасты ўжо працуе з сыравінай новага ўраджаю.



Ангар для тэхнікі.



Запраўка размеркавальніка ўгнаенняў.



Галоўны аграном Яўген КАТКО і вадзіцель Генадзь ВАСІЛЕЎСКІ.



Трактарыст-машыніст Аляксандр МУЗЫЧКА.

# ПАШАНА — ПА ПРАЦЫ

Аб поспехах прадпрыемства красамоўна сведчыць такі факт: за апошняе дзесяцігоддзе льнозавод быў занесены на Рэспубліканскую дошку гонару чатыры разы, у тым ліку і сёлета — па выніках работы за 2024 год. Як кажуць: па працы і пашана. Сёння завод з'яўляецца вядучым прадпрыемствам льнаводчай галіны ў Беларусі, ён адзін з самых вялікіх у краіне. Тут на ўзбраенні самыя сучасныя тэхналогіі, з дапамогай якіх запушчаны поўны цыкл атрымання льновалакна. Надзвычай складаную ў сэнсе земляробчай справы культуру пружанцы навучыліся вырошчваць і апрацоўваць на ўзроўні сусветных стандартаў.



Дырэктар Мікалай ЖОГАЛ.

З **дырэктарам завода Мікалаем ЖОГАЛАМ** размаўляем пра тэхніка-эканамічныя паказчыкі, пра тое, чым жыве прадпрыемства, пра дружны калектыў. Найперш дырэктар згадвае асноўныя этапы паўвекавой гісторыі завода, спыняецца на той вялікай перабудове, якая пачалася ў 2011 годзе. Гэты і наступны гады сталі часам глабальнай рэканструкцыі, якая ператварыла завод у сучасную высокапрадукцыйную вытворчасць. Быў узведзены новы цэх і запушчана найноўшае абсталяванне бельгійскай фірмы. Дырэктар завода да таго часу пабываў у Францыі і літаральна «захварэў» на сучасныя тэхналогіі вытворчасці лёну. Ён стукаўся ва ўсе дзверы і атрымаў падтрымку на ўзроўні кіраўніцтва дзяржавы. Указам Прэзідэнта Пружанскаму льнозаводу на пакупку абсталявання былі выдзелены сродкі з фонду нацыянальнага развіцця. А таксама былі ўзяты крэдыты на будаўніцтва і добраўпарадкаванне. Да гэтай пары на заводзе добрым словам згадваюць многіх людзей, якія паспрыялі запуску працэсу мадэрнізацыі народнай гаспадаркі рэгіёна. У выніку ўсе рызыкі апраўдаліся, і ў Пружанах працуе сучаснае прадпрыемства. Па яго прыкладзе ўзведзена яшчэ шэсць заводаў — па адным у кожнай вобласці і ў Ляхавічах. «А мы маем падставы ганарыцца тым, што сталі базавым прадпрыемствам для краіны па мадэрнізацыі і карэнным абнаўленні заводаў, а таксама па вырошчванні і перапрацоўцы традыцыйнай для беларусаў культуры», — гаворыць Мікалай Жогал.

Варта падкрэсліць, што завод цяпер — у ліку найважнейшых пастаўшчыкоў сыравіны на Аршанскі льнокамбінат. Пасяўныя плошчы лёну складаюць амаль тры тысячы гектараў. Завадчане сталі паспяховымі земляробамі. Паступова быў створаны магутны механізаваны атрад, з дапамогай якога вырошчваецца сыравіна.

У гэтым годзе пружанцы атрымалі 5 тон трасты з гектара, з уборкай паспяхова справіліся ў жніўні, а восенню паехалі на дапамогу іншым заводам рэспублікі. «Дзе мы толькі не былі, — пералічвае Мікалай Сцяпанавіч: — На Ляхавіцкім льнозаводзе, Дварэцкім і Карэліцкім заводах Гродзенскай вобласці, у Інстытуце лёну на Аршаншчыне, Крупскім льнозаводзе Мінскай вобласці. Мала таго, што нашы механізатары дапамаглі ва ўборцы, яны яшчэ давалі майстар-класы тамтэйшым таварышам па рабоце. А калі сур'ёзна, было вельмі прыемна чуць ад калег словы высокай ацэнкі нашых майстроў ільняной нівы. Цяпер у многіх раёнах загаварылі пра стварэнне мехатрадаў, якія могуць аказваць паслугі па ўборцы сельгаскультур, ворыве, сяўбе, нарыхтоўцы кармоў і гэтак далей. Мы робім усё гэта ўжо сёння», — разважае дырэктар.

Механізатары Пружанскага льнозавода вопытныя і кваліфікаваныя, кожную хвіліну рабочага часу выкарыстоўваюць рацыянальна. Тым больш што на ўсіх машынах стаіць GPS-навігацыя. Цяпер гэта звычайная практыка, прадыктаваная патрабаваннем часу. Яна спрыяе матывацыі пры групавой рабоце: кожны бачыць свае прамежкавыя паказчыкі і канчатковыя вынікі. Паводле слоў дырэктара, сёння механізатараў не без падстаў пачынаюць называць аператарамі па рабоце з тэхнікай. Бо сучасная сельгастэхніка — гэта найперш гаджэт. Яе кіроўцы трэба быць профі: павышаць свой узровень, быць у курсе навінак, як, напрыклад, **механізатар Аляксандр КАРУНАС,** які мае сярэднюю спецыяльную адукацыю. Мікалай Сцяпанавіч назваў Аляксандра вельмі начытаным маладым чалавекам, які сочыць за літаратурай па спецыяльнасці, ведае ўсе нюансы ворыва, апрацоўкі зямлі. Больш за тое, ён падцягнуў да свайго ўзроўню многіх калег. Гэта спецыялісты экстра-класа, іх не сорамна на любы сусветны конкурс па ворыве пасылаць. Таму і не дзіва, што на заводзе з гонарам кажуць пра сваю школу механізатараў.



Пад'ём зябліва.



Трактарыст-машыніст Аляксандр КАРУНАС, начальнік механізаванага атрада Аляксандр ЛІЦКЕВІЧ і трактарыст-машыніст Алег ЛІТВІНОВІЧ.

З нязменнай павагай тут ставяцца да тэхнікі. Не так даўно пабудавалі новае памяшканне для машын і агрэгатаў. Сучасны і прыгожы гараж забяспечвае дастойныя ўмовы захавання тэхнікі ў міжсезонныя перыяды. Ужо стаяць у лінейку самаходныя машыны для цераблення і ўборкі лёну.

Выязджаем у поле, дзе ідзе ворыва, праводзіцца асенняя падрыхтоўка глебы пад будучую сяўбу. **Галоўны аграном гаспадаркі Яўген КАТКО** не нарадуецца на новую машыну — агрэгат для ўнясення ўгнаенняў: «Гэта самая сучасная тэхніка такога кірунку еўрапейскай вытворчасці. Яна не толькі ў адпаведнасці з праграмай размяркоўвае па колькасці пажыўныя рэчывы, якія ўносяцца ў глебу, яна нават мае ўласную маленькую метэастанцыю, што мерае хуткасць ветру і робіць папраўку на раўнамернасць унясення ўгнаенняў у залежнасці ад хуткасці бакавога ветру». Кіруе гэтай машынай для дакладнага земляробства **Аляксандр МУЗЫЧКА.**

На ўборцы пружанскія льнаводы спрацавалі дакладна, пры добрым надвор'і ўбіралі да 1000 тон трасты за дзень. Гэтак жа зладжана працуюць механізатары і на ворыве. І не толькі зладжана, але і прыгожа. Трактары вядуць ворыва парамі: першы ідзе колам у баразне, другі следам — колам над баразной і выраўноўвае хібы, няроўнасці за першым. «Спецыялісты зразумеюць, што такі спосаб ворыва гарантуе не толькі эстэтычны бок справы — поле выглядае раўнюткім, як на карцінцы, — але і якасць ворыва, а значыць, стварае добры задзел для будучага ўраджаю» — каментуе **начальнік мехатрада Аляксандр ЛІЦКЕВІЧ.**

У канцы нашай гутаркі дырэктар Мікалай Жогал, які ўзначальвае завод 39-ы год, яшчэ раз падкрэслівае ролю працаўнікоў: «Машыны можна набыць, укараніць тэхналогіі, а калектыў трэба вырошчваць гадамі і дзесяцігоддзямі. Вось як у нас: людзі, якія прайшлі ў свой час праз цяжкасці, склалі касцяк калектыву, потым сталі заснавальнікамі ўласнай школы льнаводства. Мы вырасцілі ў калектыве прафесіяналаў, якімі варта ганарыцца».

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**
**Фота Лізаветы ГОЛАД.**

УНП 200026990



Птушкаводы Святлана КАЦЮБКА і Ала НАЛІЎКА на зборы яек у птушніку № 8.

Фота з архіва прадпрыемства.

# СТВАРЭННЕ ЯКАСНАЙ ПРАДУКЦЫІ — СПРАВА АГУЛЬНАЯ

## Пераканаліся ў гэтым, наведаўшы ААТ «Аранчыцкая птушкафабрыка»




Прадукцыя птушкафабрыкі ў Аранчыцах, што ў Пружанскім раёне Брэсцкай вобласці, вядомая не толькі ў нашай краіне, але і за яе межамі. Яйкі з даўніх часоў лічыліся каштоўным прадуктам харчавання. Яны ж уваходзяць у склад многіх страў і цяпер: амлет — на сняданак, шарлотка — увечары з чаем. Гаспадыням пра іх карысць нават і расказваць доўга не трэба. Да таго ж, нашы жанчыны ведаюць: калі за вытворчасць адказвае прадпрыемства, якое цэніць сваіх кваліфікаваных работнікаў, планамерна ўзмацняецца новай тэхнікай і абсталяваннем, строга сочыць за бяспекай усіх працэсаў, значыць, прадукцыя на прылаўкі крам паступае сапраўды якасная. У гэтым мы пераканаліся, наведаўшы ААТ «Аранчыцкая птушкафабрыка».




Дырэктар Аранчыцкай птушкафабрыкі Аляксандр КАМІСАРУК напярэдадні

**ДНЯ РАБОТНІКАЎ СЕЛЬСКАЙ ГАСПАДАРКІ І ПЕРАПРАЦОЎЧАЙ ПРАМЫСЛОВАСЦІ АПК**

павіншаваў калег з прафесійным святам:

*«Паважаныя калегі, работнікі і ветэраны аграпрамысловага комплексу, віншую вас са святам. Намаганні аграномаў, заатэхнікаў, ветурачоў, кіраўнікоў і іншых работнікаў сельскай гаспадаркі і АПК забяспечваюць і глабальную харчовую бяспеку краіны, і вялікія аб'ёмы экспарту, і ўражальны асартымент смачных і якасных прадуктаў. І ўсё гэта дзякуючы вашаму прафесіяналізму, высокай кваліфікацыі і ініцыятыўнасці. Многае, чым можна сёння ганарыцца, ужо зроблена, аднак наперадзе перад нашым калектывам стаяць новыя, не менш сур'ёзныя задачы. Жадаю вам моцнага здароўя, шчасця і мірнага неба над галавой!»*


Дырэктар Аляксандр КАМІСАРУК.

**Дырэктар прадпрыемства Аляксандр КАМІСАРУК** прызнаўся, што працу сваю вельмі любіць. Гэта, паводле яго слоў, — галоўны імпульс для выканання ўсіх пастаўленых задач. «Наша птушкафабрыка імкнецца рухацца ў нагу з часам, паступова праводзячы мадэрнізацыю, — расказаў дырэктар. — Напрыклад, у наступным годзе будзем рэканструяваць адзін з птушнікаў. Акрамя таго, у планах — будаўніцтва яшчэ аднаго, што дазволіць прырасці па фінансавых паказчыках, павялічыць выручку і колькасць працоўных месцаў. Хутка таксама пачнецца будаўніцтва новага збожжасклада. Гэта неабходнасць, паколькі 30 % ад агульнай колькасці патрэбных кармоў мы забяспечваем самастойна, астатняе закупляем. Прапрацоўваецца пытанне аб мадэрнізацыі ўстаноўкі для мыйкі і дэзынфекцыі яйка курынага, што дазволіць яго рэалізоўваць у пякарні, рэстараны... Будзем таксама абнаўляць аўтапарк».



Вось такія прыгожыя яйкі сартуе прадавец Святлана ІЛЫЧ у фірменнай краме.

**Інжынер па якасці Тамара ХІЛЬКОВІЧ** працуе на птушкафабрыцы не адзін дзясятак гадоў, дакладней — з 1993 года. Пачынала жанчына свой працоўны шлях з рабочай, таму добра ведае ўвесь працэс вытворчасці. Спецыяліст перакананая: на якасць яйка ўплывае сукупнасць фактараў: утрыманне птушкі, яе кармленне, стан абсталявання, наладжаны тэхналагічны працэс, акрамя таго, збор, упакоўка, фасоўка. «Займаць нядрэнныя пазіцыі ў сваёй галіне Аранчыцкай птушкафабрыцы ўдаецца дзякуючы якаснай сыравіннай базе — тут самастойна вырабляюць кармасумесі на аснове збожжавай групы, кукурузы і іншых кармавых дабавак. Больш за тое, у прадпрыемства ёсць свая ўстаноўка па вытворчасці травяной мукі», — расказала жанчына.

Прадукцыя, якая выпрабляецца, запатрабаваная круглы год. Каб утрымлівацца на рынку лідараў, тут пастаянна ўдасканальваюць тэхналогіі. Так, летась быў распрацаваны новы від прадукцыі — яйкі курыныя, узбагачаныя селенам. Ён з'яўляецца прыродным антыаксідантам, патрэба арганізма ў селене насамрэч вялікая. Акрамя таго, гэты мікраэлемент спрыяе больш працягламу захоўванню яек, падаўжэнню іх пажыўных уласцівасцяў. «Яйкі Аранчыцкай птушкафабрыкі карыстаюцца попытам у першую чаргу на ўнутраным рынку — рэалізоўваем іх па Брэсцкай вобласці, часткова адпраўляем у Мінск. Акрамя таго, працуем з бюджэтнымі арганізацыямі, ажыццяўляем пастаўку ў дашкольныя ўстановы, бальніцы, пансіянаты, воінскія часці... Ну, і, безумоўна, на экспарт, у Расійскую Федэрацыю», — дадала Тамара Хількові ч.



Калектыў прадпрыемства. Ніжні рад злева направа: бухгалтары Святлана ВАКУЛЬЧЫК, Кацярына КУРЫЛОВІЧ, Анастасія ДЫБУЛЬ, юрысконсульт Валерыя ТКАЧУК. Верхні рад: начальнік аддзела збыту Віктар ДЫБУЛЬ, гандлёвы агент Валянціна ЗУЙ, галоўны бухгалтар Наталля КАЧАНАВА, бухгалтары Наталія ШЧЭРБА, Наталія ФЯДУН, інжынер-энергетык Юрый КУЗЬМІЦКІ, інжынер па ахове працы Алена АНТАНОВІЧ.

**Галоўны эканаміст Алена ГАЛАВЕЙКА** расказала, што прадпрыемству ўдаецца дасягаць станоўчых вытворчых паказчыкаў. «Птушкафабрыка працуе з рэнтабельнасцю продажаў — паказчык складае 9,9 %, — адзначыла спецыяліст. — Сярэднямесячная заработная плата — каля 2223 рублёў. Каб заахвоціць людзей, стараемся павышаць яе ўзровень. У нас годны сацыяльны пакет. Прадпрыемства стымулюе работнікаў грашовымі выплатамі: да Міжнароднага жаночага дня, Дня абаронца Айчыны і прафесійнага свята. Нярэдка таксама выдаём прадуктовыя наборы да свят».

**Інжынер па ахове працы Алена АНТАНОВІЧ** пагадзілася, што ўмовы працы істотна палепшыліся літаральна за апошнія некалькі гадоў. Наша суразмоўца — прадаўжальніца сямейнай дынастыі. Яе бацька і муж працуюць кіроўцамі аўтамабіляў, на птушкафабрыцы былі занятыя і бабуля з дзядулем. «Пра гэта прадпрыемства чула яшчэ з дзяцінства. Лёс так склаўся, што і сама цяпер працую тут», — расказала яна. Жанчына адзначыла чулае стаўленне да работнікаў фабрыкі і іх сем'яў з боку кіраўніцтва: для дзетак арганізоўваюцца ранішнікі, для дарослых — паездкі па адметных кутках Беларусі і не толькі.



Малады спецыяліст, выконваючы абавязкі галоўнага ветэрынарнага ўрача Раман ДЗІМІДЧЫК.

**Выконваючы абавязкі галоўнага ветэрынарнага ўрача Раман ДЗІМІДЧЫК** — малады спецыяліст. Хлопец адвучыўся ў Віцебскай ордэна «Знак Пашаны» дзяржаўнай акадэміі ветэрынарнай медыцыны. «Мой кожны працоўны дзень складаецца з клінічнага агляду птушкі, пастаноўкі ветэрынарных прэпаратаў, падтрымання ўзроўню яйканоскасці», — кажа Раман. Працаваць тут падабаецца: малады спецыяліст атрымаў жыллё, да працы — рукой падаць, ды і гэта перспектыўны кар'ерны рост.

**Яна ВАЛАСАЧ,**
**Алена ДАЎЖАНОК.**
**Фота Лізаветы ГОЛАД.**

УНП 200026018

ПРОСТАЯ МОВА

# КОЛА... АЛЬБО РАБІ, ШТО ТРЭБА... І ХАЙ БУДЗЕ, ШТО БУДЗЕ

...Каля гэтых бяроз мы хадзілі даўно, але іх саміх, можна сказаць, не бачылі, бо на што там глядзець: дрэвы як дрэвы — былі... Аж пакуль руплівіца восень не агаліла ствалы — не скінула лісце і тым самым не паказала, што ў аднаго калісьці бурай зняло вершаліну.

Перапала беднай бярозе: было праз што ўваліцца ў адчай! Але ж не! Яна не здалася: знайшла ў сабе сілы, ірванула ўверх — аж трыма новымі галінамі! Прычым ірванула так, што «калецтва» ўжо ніхто не бачыць: з ранняй вясны і да позняй восені гэтая бяроза такая ж, як іншыя (ды яшчэ і прыгажэйшая!).

...Дрэвы, падобна, як людзі: на хаду, бывае, зірнеш на іх — апрануты, прыбраныя — ды па-добраму пазайздросціш: ну вось жа — «усё ў шакаладзе»... Хоць у кагосьці!

А варта зазірнуць у душу...

Бог ведае, што адкрыецца.

## ТОЛЬКІ ТАК?

Не ў памяці, хто з нашага аўтобуса ўбачыў іх першым? Факт, што купіў, прынёс, паказаў і, мусіць жа, нешта сказаў, бо мы, турысты, рушылі ў невялічкую краму, сталі ў чаргу па чайныя лыжачкі.

— Нам, калі ласка, шэсць, — папрасілі прадаўшчыцу.

Тая нырнула пад прылавак, дастала нейкую каробачку і разгублася:

— Ой, а іх толькі тры. Апошнія... Будзеце браць?

— Не, — адмовілі, не падумаўшы, не спытаўшы ў сябе, а... чаму? Хто сказаў, што іх павінна быць шэсць ці дванаццаць? Чаму не пяць і не тры?

Вярнуліся. Купілі. Служаць — яшчэ і цікім напамінам крылатага: «Рабі нечаканае, рабі, як не робіць ніхто...»

## БЕЗ ВІНЫ?

Горад, аўтобус, вольныя месцы. Значыць, можна пасядзець-пачытаць, можна — пакуль не сцямнела — паглядзець у акно, бо вось жа...

У адным патоку машын, паралельна з нашым вялікім аўтобусам плыве зусім невялічкі. І пасажырка ў ім хіба адна, побач з кіроўцам — маладая, даволі сімпатычная тварам, а ўжо калені... Круглыя, гладкія і аголены хораша: не сказаць, каб многа, не сказаць, каб мала...

Што кіроўца, вядома ж, бачыць, бачыць, як, напэўна, ніхто, бо, спыніўшыся пад святлафорам (там якраз чырвонае), па-гаспадарску кладзе руку — на тое хараство.

Спадарожніца не бароніцца, не — хутчэй наадварот: зверху на яго правую згодна кладзе сваю левую.

Святлафор, між тым, міргае зялёным: мужчына забірае руку, спрабуе кранацца з месца — рухавік, як на ліха, глухне, «бусік» стаіць.

Ззаду нервова бібікаюць машыны — кіроўцы ж не ведаюць, з-за чаго затрымка.

А калі б ведалі? Напэўна, даравалі б? Ці не?

## З НАДЗЕЯЙ

Здалёк і з даўняга.

Прыяцелька — дзеўка ў гадах — такі выйшла замуж: пяты месяц жыве і ў 25-ы, здаецца, з мужам сваім у сварцы.

Грэх не спытаць, з-за чаго, на гэты раз?

— Ды ён, уяўляеце, — ледзь не плача Наташа, — учора ў кухні маю анучку ўзяў і бруд з падаконніка выцер... Ну, дзе ж, — пытаюся, — розум?! Я той анучкай стол выціраю, а ты... Заўвагу зрабіла... Дык ён яшчэ і надзьмуўся, размаўляць са мной перастаў. Было б з-за чаго...

Вось і мы ёй пра тое ж («было б з-за чаго»)! Пытаемся, можа, шкоды якой чалавек нарабіў? Мо на злосць ёй хацеў? Кажа, што не. Можа, анучка ў хаце апошняя? Ну што вы?.. Не!

Дык тады чаму, пытаем у Наташы, той анучкі раптам «шкадней», чым любові і згоды, чым павагі да жадання мужа нечым дапамагчы (ёй жа), чым свайго і зусім не чужога настрою, нерваў, здароўя?



Валянцін Губараў. Хутар.

Маладзіца маўчыць — думае і ў глыбіні душы, магчыма, згаджаецца, што многім сем'ям па сённяшнім часе не зашкодзілі б... датчык шуму, які — улавіўшы сварку — азываецца б такім дарэчным: «Людзі, вы гэта сур'ёзна? Вы там што — звар'яцелі? З-за такой драбязы...»

Не факт, што гэтыя словы ўсіх астудзілі б, але ж некага — ёсць надзея.

Байка ў тэму. У вёсцы ў суседстве жылі дзве сям'і. У адной штодня сужэнцы грызліся, у другой — намілавацца не маглі.

Зайздросна стала сварлівай жонцы. «Ідзі, — загадвае мужу, — патуляйся ў іх пад вокнамі. Можа, убачыш, чаму яны так дружна жывуць».

Пярэчыць не выпадала — муж вечарком пайшоў, тварам прыліп да акна: убачыў, што гаспадыня ў хаце прыбірае, што пасунула вазу на краёк стала... Потым гаспадар прыйшоў, стаў распранацца — зачапіў... Ваза — даражэнная — на падлогу і ў друз. «Ну, зараз і тут вараженча пачнецца», — узрадаваўся сусед.

Ажно — глядзіць — нічога падобнага: муж выбачаецца перад жонкай, што такі няўклюдны, яна перад ім — што вазу дрэнна паставіла і яна павінна была ўпасці... Абое кажуць, што посуд б'ецца на шчасце і... абдымаюцца.

Паглядзеў на гэта сусед, сам усё зразумеў і дома жонцы сказаў: «Ведаеш, чаму ў той хаце мір ды згода, а ў нас з табою грызня? Таму што яны абое заўсёды ва ўсім вінаватыя, а мы з табой ва ўсім і заўсёды не».

## ЯК ЁСЦЬ...

Некалі ў людных месцах што ні слуп, то дошка аб'яў.

Цяпер іх вобмаль. Хіба...

«Семья, два человека (верующих) снимет квартиру», — забялела днём на прыпынку трамвая.

Да вечара нумар тэлефона ніхто не сарваў: трэба разумець, не знайшлося ахвотных здаваць кватэру?

Затое адшукаўся «грамацей», які «лёгкім рухам рукі» паправіў адну літарку і тым самым сям'ю «верующих» ператварыў у сям'ю... «ворующих».

Хочацца верыць — хочацца не, але шанцы ў яе чамусьці ўзраслі: амаль усе нумары тэлефона праз дзень былі абарваныя...

Замест каментарыя — гарык (чатыры радкі Губермана):

*Высокий свет в грязи погас,*
*Фортуна новый не дарует:*
*Блажен, кто верует сейчас,*
*Но трижды счастлив, кто ворует.*

## РАБІ, ШТО ТРЭБА...

Гэта было, кажуць, даўным-даўно, але ж праўда. Бог з нябёсаў спусціўся — пайшоў па зямлі. У вёсцы адной мужчынку цікавага згледзеў. Той вакол дома плот гарадзіў.

— Слухай, а чаму з саломы? — пытаецца Бог.

— Дык на мой век хопіць, — азваўся мужчына. — Мне ўсяго месяц жыць засталося... А пamру — нехта іншы паселіцца і хай робіць, што хоча...

Выслухаў гэта Бог і думае: «Непарадак — людзі не павінны абы-што, абы-як рабіць, потым перарабляць... А значыць, не павінны ведаць, колькі ім засталося, хто калі памрэ. Трэба гэта паправіць».

Падумаў і паправіў: з тае самае пары людзі не ведаюць, калі смерць агорне: рупліца пра заўтрашні дзень, стараюцца...

Французская прыказка (якую, дарэчы, любіў Леў Талстой): «Рабі, што трэба, і хай будзе, што будзе». Наш, тутэйшы, адпаведнік: «Паміраць збірайся, а жыта сей». Бо (таксама з прыцягам) што пасееш, тое пажнеш, што пажнеш, тое змелеш, што змелеш, тое з'ясі.

**Валянціна ДОЎНАР.**







Фота БелТА.

**14 ЛІСТАПАДА** Даты | Падзеі | Людзі

У краіне

**1900** год — нарадзіўся Нічыпар Тодаравіч Чарнушэвіч (г. Капыль Мінскай вобл.), беларускі паэт, перакладчык, драматург. У 1928 г. скончыў БДУ. Аўтар кніг паэзіі «Цуд», «Нясу надзею», п'есы «Шукальнік вышыні», кінааповесці «Арсенал пачуццяў». Перакладаў на беларускую мову творы рускіх, украінскіх і яўрэйскіх паэтаў. Працаваў у Беларускім дзяржаўным выдавецтве і на Беларускім тэлебачанні, выкладаў гісторыю ў Мінскай афіцэрскай школе.

У свеце

**1765** год — нарадзіўся Роберт Фултан, амерыканскі інжынер, вынаходнік, стваральнік першага ў свеце практычна прыдатнага колавага парахода «Клермонт» (1807 г.).

**1910** год — нарадзіўся Якаў Міхайлавіч Калатыркін, расійскі вучоны-фізікахімік, адзін з заснавальнікаў сучаснага электрахімічнага кірунку ў вучэнні аб карозіі металаў, акадэмік РАН (1991 г.), Герой Сацыялістычнай Працы (1980 г.). Даследаваў электрахімічную кінетыку каразійных працэсаў. Развіў электрахімічную тэорыю пасіўнасці. Распрацаваў метад аноднай абароны металаў ад карозіі.

НАДВОР'Е

# НА ВЫХАДНЫЯ ПАХАЛАДАЕ

## Ноччу ўжо да мінус 7 °С

Паўночны вецер прынясе пахаладанне, паведамілі спецыялісты Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.

Праўда, яшчэ сёння надвор'е будуць вызначаць франтальныя раздзелы, якія ссоўваюцца з паўночнага захаду Еўропы. Воблачна з праясненнямі. Ноччу месцамі па поўначы невялікія дажджы, днём — у многіх раёнах краіны. У начныя і ранішнія гадзіны месцамі чакаецца слабы туман. Вецер паўднёва-заходні парывісты, ноччу і раніцай месцамі моцны. Тэмпература паветра ўначы ад +1 да + 7 °С, а днём +6—12 °С.

Змена надвор'я пачнецца непасрэдна ў суботу. У гэты дзень захаваецца ўплыў франтальных раздзелаў, якія ссоўваюцца ў паўднёвым напрамку, але ўслед за імі ў краіну пачнуць паступаць халодныя паветраныя масы паўночных шырот. На большай частцы тэрыторыі краіны пройдуць ападкі, ноччу месцамі моцныя, у выглядзе дажджу і мокрага снегу. Вецер заходняй чвэрці ўмераны, месцамі парывісты. Тэмпература паветра на працягу сутак ад нуля да +7 °С.

У нядзелю ноччу надвор'е ў асноўным будзе вызначаць вобласць павышанага атмасфернага ціску, а днём з тэрыторыі Польшчы чакаецца перамяшчэнне атмасфернага фронту. Ноччу пераменная воблачнасць, днём воблачна з праясненнямі. Ноччу месцамі па крайнім паўднёвым усходзе невялікія кароткачасовыя ападкі, днём на большай частцы тэрыторыі краіны дождж і мокры снег. На асобных участках дарог галалёдзіца. Раніцай і днём месцамі слабыя туман і галалёд. Вецер ночу пераменных напрамкаў, днём паўднёва-ўсходні, паўднёвы ўмераны. Тэмпература паветра мінімальная ноччу да -7° С, а днём — ад -1 да +6 °С.

**Сяргей КУРКАЧ.**

Крынічка

Вядучая рубрыкі Марына ВЯРЭНІЧ.

# ЗАХАВАЕМ РАСЛІНЫ ЗІМОЙ



З надыходам халадоў многія задаюцца пытаннем: як абараніць расліны ад зімовых маразоў? Не ўсе культуры здольныя перажыць суровыя ўмовы, таму схаваць іх становіцца неабходнай працэдурай.

### Зберагчы ад холаду

- ружы: большасць сартоў маюць патрэбу ва ўкрыцці, асабліва ў рэгіёнах з суровымі зімамі.
- гартэнзіі: вельмі баяцца холаду, асабліва маладыя расліны, — абавязкова ўкрываем.
- лозы і ліяны: вінаград і клематіс могуць быць пашкоджаны марозам, таму ім патрабуецца ахова.
- хвойнікі: маладыя іглічныя і некаторыя сарты туй, напрыклад заходняя, маюць патрэбу ва ўкрыцці..

### Падрыхтоўка

Перад укрыццём выдаліце пашкоджаныя, сухія або хворыя галіны, а таксама лісце з раслін. Добра праліце іх, каб забяспечыць вільгаццю на зіму. Прарыхліце і ачысціце кругі вакол ствалоў, унясіце мінеральныя ўгнаенні з высокім утрыманнем фосфару і калію. Аптымальнай тэмпературай для ўкрыцця з'яўляецца -5°С. Сачыце за прагнозам надвор'я і хавайце расліны перад стабільнымі замаразкамі.

### Матэрыялы для ўкрыцця

Лісце, мульча, салома, пілавінне, торф, мешкавіна і спанбонд — любы натуральны або экалагічны матэрыял, які стварае цеплаізаляцыю, але прапускае паветра. Выдатным натуральным укрыццём служыць лапнік. Ён не змакае, стварае дадатковую паветраную праслойку і добра затрымлівае на сабе снег, які дадаткова абараняе расліны ад маразоў.

Сухая лістота і салома падыходзяць для ўкрыцця каранёў, бо добра ўтрымліваюць цяпло, але гэта можа прыцягнуць грызуноў. Таксама такія матэрыялы ствараюць спрыяльнае асяроддзе для развіцця грыбковых захворванняў.

Спанбонд — адзін з самых папулярных матэрыялаў, які абараняе расліны як ад марозу, так і ад халодных вятроў.

Плёнка выкарыстоўваецца рэдка, бо яна не прапускае паветра і вільгаць. Можна выкарыстоўваць яе толькі ў якасці дадатковага пласта ў моцныя маразы.

### Важна!

Не ўкрывайце расліны рана, гэта можа прывесці да іх загнівання. Расліне неабходна цыркуляцыя паветра. Увесну разбірайце сховішча паступова, калі пройдзе пагроза замаразкаў. Пры ўцяпленні выкарыстоўвайце для апоры парніковыя дугі або падстаўкі для кустоў. Яны дапамогуць расліне вытрымаць цяжар снежнага покрыва і не дапусцяць пашкоджання галінак.

Для маладых туй гэта асабліва важна, бо дапаможа захаваць суцэльную форму кроны. Правільнае ўкрыванне раслін на зіму — залог іх здароўя ў наступным сезоне.


ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар АНУФРЫЕВА Вольга Аляксандраўна.

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».



АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.

ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмнай – 311 17 13 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 311 17 44, маркетынгу — 263 66 73, бухгалтэрыі — 311 17 16.

www.zviazda.by

e-mail: info@zviazda.by

для зваротаў: zvarot@zviazda.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 311 17 27, e-mail: reklama@zviazda.by



Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Передрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.



Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 38200000007667 ад 30.04.2004.

220013, Мінск, прасп. Незалежнасці, 79/1. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.

Тыраж 11 337. Індэкс 63850. Зак. № 2512.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

Нумар падпісаны ў 19.30 13 лістапада 2025 года.



**РУП «Институт недвижимости и оценки»** (Организатор аукциона) информирует о проведении повторного открытого аукциона по продаже имущества, принадлежащего **УП «Барановичское отделение Белорусской железной дороги»** на праве хозяйственного ведения (Продавец).

Аукцион состоится **05.12.2025 в 11.00**

**Лот № 1**. Квартира с инв. № 400/D-162194. Адрес: Гродненская обл., Гродненский р-н, Поречский с/с, аг. Поречье, ул. Привокзальная, 2А-5. **Начальная цена без НДС** – 3 731,57 руб.

**Лот № 2**. Квартира с инв. № 400/D-162199. Адрес: Гродненская обл., Гродненский р-н, Поречский с/с, аг. Поречье, ул. Привокзальная, 2А-9. **Начальная цена без НДС** – 2 054,86 руб.

**Лот № 3**. Квартира с инв. № 400/D-162200. Адрес: Гродненская обл., Гродненский р-н, Поречский с/с, аг. Поречье, ул. Привокзальная, 2А-10. **Начальная цена без НДС** – 3 819,82 руб.

**Лот № 4**. Квартира с инв. № 400/D-162201. Адрес: Гродненская обл., Гродненский р-н, Поречский с/с, аг. Поречье, ул. Привокзальная, 2А-11. **Начальная цена без НДС** – 4 084,58 руб.

Извещение о проведении аукциона размещено на сайтах Государственного комитета по имуществу Республики Беларусь gki.gov.by, в Единой базе и на электронной торговой площадке «GOSTORG» gostorg.by

**Организатор аукциона: 8 (017) 324-70-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52, torgi@ino.by**
**Электронный адрес ЭТП: gostorg.by**



**РУП «Институт недвижимости и оценки»** (Организатор электронных торгов, Оператор электронной торговой площадки) извещает о проведении повторных электронных торгов по продаже имущества, принадлежащего **ОАО «Агролизинг»** (Продавец) на праве собственности

**Электронные торги состоятся 12.12.2025 в 11.00**

**Лот № 1**: LI L9, кузов (рама) № HLX33B124P0130271, 2023 г. в. Начальная цена – 148 500,00 без учета НДС. Задаток – 14 850,00 руб.

**Лот № 2**: GEELY EMGRAND, кузов (рама) № Y4K8824Z5RB205723, 2024 г. в. Начальная цена с учетом НДС 20 % – 47 300,00. Задаток – 4 730,00 руб.

Шаг электронных торгов – 2 %.

Местонахождение Лотов №№ 1–2: г. Минск, пр-т Победителей, 84.

Порядок проведения электронных торгов определен Регламентом электронной торговой площадки «GOSTORG» (далее – ЭТП).

Детальная информация об электронных торгах, в том числе об оформлении участия в них, условиях торгов размещена на ЭТП.

Задаток перечисляется на р/с BY85BAPB30127802900100000000 в ОАО «Белагропромбанк», BIC BAPBBY2X. Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182. Окончание приема заявлений с прилагаемыми к ним документами и задатков: 10.12.2025 в 16.00

**Организатор электронных торгов: 8 (017) 324-70-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52, torgi@ino.by**
**Электронный адрес ЭТП: gostorg.by**



**РУП «Институт недвижимости и оценки»** (Организатор аукциона) извещает о проведении повторного открытого аукциона по продаже имущества, принадлежащего **ОАО «Торфопредприятие Глинка»** (Продавец).

Аукцион состоится **04.12.2025 в 10.00** по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, 3 этаж, каб. 4

Лот № 1:

Изолированное помещение «Ремонтная мастерская»

с инв. № 135/D-5593, площадь 918.0 кв. м. Адрес: Брестская обл., Столинский р-н, Радчицкий с/с, д. Колодное, ул. Заводская, 2-1. Начальная цена – 1 006 518,39 руб. с учетом НДС. Задаток – 100 651,83 руб. Шаг аукциона – 5 %.

Порядок оформления участия в аукционе, порядок его проведения, определения лица, выигравшего аукцион, а также условия аукциона содержатся в информации о проведении аукциона, опубликованной на электронной торговой площадке «GOSTORG» (gostorg.by). Задаток перечисляется на р/с BY85BAPB30127802900100000000 в ОАО «Белагропромбанк», BIC BAPBBY2X. Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182. Окончание приема заявлений и задатка – 02.12.2025 в 11.00

**Организатор аукциона: 220030, г. Минск, ул. Комсомольская, 11, пом. 9, 8 (017) 324-70-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52**
**• gostorg.by • e-mail: torgi@ino.by**



**ИЗВЕЩЕНИЕ о проведении повторного аукциона**

Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» *(Организатор аукциона)*, по поручению **ОАО «Сковшин»** *(Продавец)*, проводит открытый аукцион по продаже

**здания коровника**

**с инв. № 644/С-62946 общ. пл. 1 631,8 кв. м, расположенного на земельном участке с кадастровым номером 625081300001000118 (право постоянного пользования) площадью 0,5806 га по адресу: Минская обл., Солигорский р-н, Домановичский с/с, 12, р-н д. Завыход.**

Начальная цена с НДС (20 %) – **70 368,00** бел. руб. (задаток 10 % от начальной цены – **7 036,00** бел. руб.). **Стоимость снижена на 20 %.**

**Задатки перечисляются на р/с № BY55BPSB30121082600169330000 в ОАО «Сбер Банк», г. Минск, ул. Чкалова, 18/1, БИК BPSBBY2X, УНП 690324015, ОКПО 29250255, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации», код платежа – 40901, код категории платежа OTHR.** Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата за объект производится в течение 20 (двадцати) банковских дней после заключения договора купли-продажи, если иное не предусмотрено договором купли-продажи. Победитель аукциона (единственный участник аукциона) оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов в размере 5 (пяти) процентов от окончательной цены продажи предмета аукциона, а также возмещает затраты на публикацию извещения о проведении аукциона. Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.rlt.by. Предыдущее извещение опубликовано в газете «Звязда» от 24.06.2025.

Аукцион состоится **26.11.2025** в **12.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **24.11.2025** до **17.00** по указанному адресу в каб. 320. **Тел.: (8017) 516-80-64, 516-80-65, (8029) 136-31-11, 102-21-17. Тел. для осмотра: (8017) 420-34-45, (8029) 684-18-78.**

УНП 600072165